**ДУ «МІНСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ А. С. ПУШКІНА»**
**АДДЗЕЛ БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА**

# *БІБЛІЯТЭКІ МІНШЧЫНЫ Ў 2017 ГОДЗЕ: АГЛЯД ДЗЕЙНАСЦІ*

**МІНСК**
**2018**

# Змест:

**Лазарава І. П.** Арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва……………………………….. 3

**Філіпчык А. К., Вярхоўская К. Д., Бубіна П. В.** Змест і арганізацыя работы з чытачамі ……………… 5

**Рудзянок І. С.** Бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей …… 62

**Гіль В. М.** Камплектаванне і арганізацыя адзінага фонду ……………………………………….. 107

**Лабовіч К. І.** Інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне ……………………………………… 110

**Мельнічак А. А.** Метадычная дзейнасць …………… 116

# Арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва

На 31.12.2017 г. сетку публічных бібліятэк Мінскай вобласці складаюць **450 бібліятэк:** абласная бібліятэка, 22 цэнтральныя раённыя і 1 гарадская, 426 бібліятэк-філіялаў, з іх – 42 гарадскі, 21 гарпасялковы, 363 сельскія.

На працягу 2017 г. сетка **скарацілася на 8 адзінак.** Сваю дзейнасць спынілі 2 бібліятэкі у Мядзельскім раёне і па 1 у Барысаўскім, Валожынскім, Клецкім, Пухавіцкім, Смалявіцкім і Старадарожскім раёнах. Разам з тым, у 2017 г. былі адчынены Лескаўская сельская бібліятэка ГУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка» і Шчыткавіцкая сельская біліятэка ГУК «Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка».

Інтэграцыя публічных бібліятэк ажыццяўляецца з улікам сацыякультурнай і дэмаграфічнай сітуацыі ў рэгіёне. На 01.01.2018 года на тэрыторыі Мінскай вобласці дзейнічаюць **160 інтэграваных бібліятэк,** 152 з якіх знаходзяцца ў ведамаснай падпарадкаванасці Міністэрства культуры, 8 – Міністэрства адукацыі. У 2017 годзе было створана 43 бібліятэкі, якія падпарадкаваны Міністэрству культуры: 2 – у Бярэзінскім, 3 – у Барысаўскім, 9 – у Капыльскім, 1 – у Лагойскім, 5 – у Маладзечанскім, 5 – у Мінскім, 6 – у Мядзельскім, 9 – у Нясвіжскім, 1 – у Стаўбцоўскім, 2 – у Узденскім раёнах. У Барысаўскім раёне была зачынена Траянаўская сельская інтэграваная бібліятэка.

На 01.01.2018 г. у Мінскай вобласці налічваецца **38 бібліятэк-клубаў.** У 2017 годзе спынілі сваю дзейнасць 3 бібліятэкі-клубы па 1 у Валожынскім, Мядзельскім і Пухавіцкім раёнах.

З мэтай поўнага ахопу бібліятэчным абслугоўваннем насельніцтва маланаселеных і аддаленых вёсак пры публічных бібліятэках дзейнічаюць **356 бібліятэчных пунктаў,** а таксама **20 біблібусаў,** якія абслугоўваюць 504 аддаленых населеных пунктаў.

У 2017г. карыстальнікамі бібліятэк вобласці з’яўляліся **437,0 тыс. чытачоў** (з улікам чытачоў абласной бібліятэкі). У бібліятэках вобласці ў цэлым назіраецца тэндэнцыя да скарачэння колькасці чытачоў: у параўнанні з 2016 г. іх колькасць зменшылась на на 5,9 тыс. чал. Працэнт ахопу насельніцтва бібліятэчным абслугоўваннем складае 28,7%. **Колькасць наведванняў склала па вобласці 3 987,6 тыс.,** што на 309,8 тыс. больш, чым ў папярэднім годзе.

Чытальнасць па вобласці склала 18,4; абарачальнасць фонду – 1,2. Кнігавыдача па вобласці склала 8 061,9 тыс. экз. дакументаў (з улікам абласной бібліятэкі), што на 87,9 тыс. экз. менш, чым у 2016 г.

У Мінскай вобласці **камп’ютарызавана 414 бібліятэк.** Зараз агульная колькасць камп’ютараў складае 1 059 (з улікам абласной бібліятэкі), з якіх у Мінскай абласной бібліятэцы імя А.С. Пушкіна – 99, у цэнтральных бібліятэках – 499, гарадскіх філіялах – 79, гарпасялковых – 30, сельскіх – 352, у бібліятэках аграгарадкоў – 288.

Усяго па вобласці **выхад у глабальную сетку і электронную пошту маюць 352 бібліятэкі:** абласная бібліятэка, цэнтральныя бібліятэкі – 23, гарадскія – 38, гарпасялковыя – 19 (у тым ліку ў аграгарадках – 6), сельскія – 271 (у тым ліку ў аграгарадках – 234).

**Уласныя сайты маюць 32 бібліятэкі** Мінскай вобласці: абласная бібліятэка, цэнтральныя – 18, дзіцячыя – 3, гарпасялковыя – 1, сельскія – 7.

Сацыяльная роля бібліятэк павышалася на працягу ўсяго года шляхам выкарыстання сучасных тэхналогій, што спрыяла таксамаўдасканаленню ўсёй сістэмы бібліятэчнага абслугоўвання.

У мінулым годзе публічныя бібліятэкі вобласці працягвалі актывізацыю дзейнасці па аказанні дадатковых платных паслуг насельніцтву. У сярэднім па вобласці аказваецца каля 30 відаў паслуг. Самымі запатрабаванымі платнымі паслугамі застаюцца выдача дакументаў з камерцыйнага фонду і чытальнай залы, ксеракапіраванне і скканіраванне.

# Змест і арганізацыя работы з чытачамі

## *Сямейнае выхаванне*

Сям'я і дзеці – адзін з галоўных фактараў забеспячэння сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця краіны. Бібліятэкары, імкнучыся сваёй дзейнасцю ахапіць усе бакі жыцця сучаснага грамадства, дапамагаюць бацькам і дзецям у вырашэнні праблем сямейнага выхавання, у пытаннях захавання сямейных традыцый, у арганізацыі сямейнага вольнага часу. З гэтай мэтай праводзяцца шматлікія масавыя акцыі, ствараюцца клубы сямейнага чытання, наладжваюцца бібліятэчныя выставы і многае іншае.

У Вілейскай раённай цэнтральнай бібліятэцы імя Г.Новік быў распрацаваны праект «Бібліятэка для сям'і: выхавацель на гадзіну» (аддзел па рабоце з дзецьмі цэнтральнай раённай бібліятэкі), які прадугледжвае арганізацыю пакоя для правядзення дзецьмі вольнага часу і аказанне паводле запыту паслугі па догляду за дзецьмі (ва ўзросце ад 6 да 10 гадоў) на кароткі час адсутнасці іх бацькоў. Гэты праект праз арганізацыю цікавага і пазнавальнага вольнага часу для маленькіх наведвальнікаў набывае ў жыхароў папулярнасць, абуджае цікавасць да кнігі і бібліятэкі. За гэты год у бібліятэчным «Пакоі казак» пабывалі дзеці з 20-ці сямей. Яны прымалі ўдзел у конкурсах, гульнях, віктарынах, разгадвалі крыжаванкі і гулялі ў настольныя гульні. На працягу года ў межах праекта прайшлі: гульнёвыя праграмы «Читаем, играем и всё на свете знаем» і «Юбилей у книжки!», гульня-віктарына «Откуда я?», спартландыя «Самы хуткі».

У 2017 годзе ў публічных бібліятэках Слуцкага раёна прайшлі мерапрыемствы, якія ўзмацнілі ролю бібліятэк у арганізацыі сямейнага чытання і правядзення сумеснага вольнага часу, асабліва ва ўмовах сяла. Карыснымі для чытачоў сталі бібліятэчны агеньчык «Сям'і душэўнай цеплыня» (аддзел абслугоўвання і інфармацыі чытачоў РЦБ), сустрэча чытаючых сем'яў «Семейный портрет на фоне библиотеки» (гарадская б/ф

№1), духоўна-маральная сустрэча «Семья – любви великое царство» (гарадская б/ф №2).

У Навагарадзейскай сельскай бібліятэцы Нясвіжскага раёна прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя **сямейнаму выхаванню**: тэматычны вечар «Её уроки мира и добра», літаратурна-музычныя кампазіцыі да Дня сям'і і Дня маці «Счастье моё – моя семья», «Всё начинается с матери».

«Познавай мир, читая книги» – акцыя да **міжнароднага дня дзіцячай кнігі** прашла ў Салігорскай цэнтральнай раённай бібліятэцы.

Свята чытацкіх сімпатый «Чытаю я – чытае ўся мая сям'я», арганізаванае на дзіцячым абанеменце ДУК «Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна», ставіла сваёй мэтай развіццё цікавасці да чытання, умацаванне традыцый сямейнага чытання, згуртаванне сям'і, прыцягненне новых чытачоў.

У ДУК «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча» працуе адукацыйна-інфармацыйны цэнтр бібліятэкі сямейнага чытання на 3 камп'ютэрызаваныя працоўныя месцы з доступам да сеткі Інтэрнэт.

Актыўна працаваў у справаздачным годзе клуб сямейнага чытання «Тата, мама і я – чытаючая сям'я» пры аддзеле абслугоўвання дзіцячага чытача «ДУ Дзяржынская раённая цэнтралізаваная сетка бібліятэк». Найбольш ярка прайшла ў рамках клуба паэтычная пятніца «О той, что дарует жизнь и тепло». У гэты дзень гучалі святочныя віншаванні матулям, дзеці чыталі вершы. Напрыканцы мерапрыемства ўсе матулі атрымалі падарункі, зробленыя іх дзецьмі.

Намаганнямі актывістак бярэзінскай раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын» і супрацоўніц ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка» ў Беразіно створана выязная школа мацярынства «Мамы, вы пішаце лёсы дзяцей», якая працуе ўжо два гады. У рамках доўгатэрміновага праекта «Бярэзінская мадонна» здзяйсняюцца выезды школы ў жаночыя калектывы прадпрыемстваў горада, ёсць вопыт правядзення такой школы для шматдзетных матуль і жанчын

у дэкрэтным адпачынку і па догляду дзіцяці да трох гадоў. У справаздачным годзе прайшлі выступленні выязнога ўніверсітэта мацярынства «Матуліна педагогіка» ў калектыве работніц райспажыўтаварыства з шок-шоу «Зламаныя лёсы» і тэатрам адкрытага пісьма «Крык душы ў паштовым канверце». Маладыя мамы з дзеткамі сталі ўдзельнікамі тэматычнай вечарыны да Міжнароднага дня сям'і. У цэнтральнай бібліятэцы была афармлена кніжна-ілюстрацыйная выстава «Пад сямейным парасонам».

Мар'інагорская гарадская бібліятэка Пухавіцкага раёна да святкавання Дня Перамогі і Дня сям'і падрыхтавала сямейны ваяж «Дом, які захоўвае натхненне». Праз літаратурна–музычную кампазіцыю «Памяць не згасне» дзеці, удзельнікі мерапрыемства, ад імя маладога пакалення выказалі павагу і падзяку тым, хто абараняў нашу краіну ў часы ваеннага ліхалецця. Вясёлую нотку ў свята ўнеслі артысты бібліятэчнага тэатра «Усмешка».

У Крывіцкай пасялковай бібліятэцы Мядзельскага раёна на вечар-сустрэчу «Усё пачынаецца з сям'і» была запрошана сямейная пара, якая разам ужо больш за пяцьдзясят гадоў.

Бібліятэкі Крупскага раёна рэалізуюць раённую праграму сямейнага чытання «Войдём в этот мир вместе», у рамках якой праводзяцца наступныя мерапрыемствы: літаратурна-музычны вечар «Нам разам весела», урок адкрытых думак «Усё пачынаецца з сям'і» , анкетаванне «Вы як чытач» і дыскусія «Сям'я для мяне – гэта…» (Бобрская гарпасялковая бібліятэка); сустрэча з шматдзетнымі сем'ямі «Святая наука расслышать друг друга» (Коласаўская сельская бібліятэка); дзень сямейнага чытання «Счастлива семья, если чтением увлечена» (Узнацкая сельская бібліятэка-клуб) і інш.

ДУК «Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка» правяла гадзіну сямейнага выхавання «Помнить и уважать семейные традиции».

У ДУ «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка» праведзены кніжная выстава «Любовь – огромная страна», паэтычная старонка «Гімн каханню»(да Дня святога Валянціна),

выстава-прысвячэнне «Ваша вялікасць Жанчына» (да Міжнароднага дня жанчын), выстава «Планета Семья», прагляд літаратуры для сямейнага чытання «Сям'я і кніга» (да Дня сям'і), культурна-масавае мерапрыемства «Пагавары са мной, матуля!» (да Дня маці). Адбыліся прагляды літаратуры па выхаванні «На паліцу бацькам», «Вы павінны гэта ведаць», «Узрост памылак і хваляванняў».

**Да Міжнароднага дня жанчын** ДУК «Любанская раённая цэнтральная бібліятэка» падрыхтавала для наведвальнікаў аддзялення дзённага знаходжання ТЦСАН, людзей сталага ўзросту, бібліяшоў «Васьмёрачка». Для гасцей мерапрыемства гучалі вершы і песні, прысвечаныя жанчынам. Сельскія бібліятэкі таксама праводзілі цікавыя мерапрыемствы. Так, у рамках мэтавай праграмы «Семья и книга: объединённые чтением» бібліятэкі праводзілі наступныя мерапрыемствы: літаратурную гадзіну «Под семейным абажуром зимние чудеса» (Соснаўская сельская біліятэка, ф. № 37), бацькоўскую гадзіну «Лепшыя кнігі для вашых дзяцей» (Стараюрковіцкая сельская біліятэка), гутарку «Семья – убежище души» (Забалацкая сельская біліятэка), гадзіну сямейнага чытання «Важней всего погода в доме» (Асавецкая сельская бібліятэка).

Валевачоўская сельская бібліятэка Чэрвеньскага раёна правяла ўрок адкрытых думак «Усё пачынаецца з сям'і». У ходзе мерапрыемства ўдзельнікам былі прапанаваны розныя практыкаванні: «Далонькі» ,»Будуем дом», « Крыўда», якія дапамагалі больш вольна выказваць свае думкі. Прагучалі вершы Э.Асадава. У Грабенскай сельскай бібліятэцы праведзены адкрыты прагляд «Кнігі для бацькі і сына», які даў магчымасць бацькам зразумець сваю ролю ў выхаванні дзяцей. Да свята сям'і сумесна з ДК і школай было арганізавана цікавае мерапрыемства «Вместе быть – какое счастье». Гэтая музычна-паэтычная гадзіна сабрала дзяцей і бацькоў, дала магчымасць правесці вольны час разам. Да мерапрыемства быў аформлены прагляд літаратуры «У вольны час – разам з дзецьмі», дзе можна было пазнаёміцца з цікавымі кнігамі і часопісамі. Вучні старэйшых класаў прынялі ўдзел у размове «Сям'я для мяне –

гэта…», падчас якой падзяліліся сваімі думкамі пра сям'ю, якую яны хацелі б мець, адказалі на пытанні анкеты.

ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка» да Дня маці запрасіла шматдзетных матуль на пашыранае пасяджэнне «Жаночае шчасце памножанае на шматдзетнасць». У святочна ўпрыгожанай зале аформілі выставу творчых работ шматдзетных матуль «Каляровы настрой». З вялікім задавальненнем жанчыны паглядзелі дзіцячы канцэрт.

У 2017 годзе бібліятэкары Лагойскага раёна надавалі вялікую ўвагу рабоце з сем'ямі, пытанням сямейнага выхавання і арганізацыі сямейнага адпачынку. Дзень сямейнага адпачынку «Зазірніце ў сямейны альбом» правяла бібліятэкар Мятлічыцкай сельскай бібліятэкі, вечар сямейнага адпачынку «Матуля ў сэрцы кожнага з нас» арганізавала бібліятэкар Задор'еўскай сельскай біліятэкі. У 2017 годзе дні сямейнага адпачынку таксама прайшлі ў Завішынскай сельскай бібліятэцы. Тэме сямейнага выхавання прысвячаліся гадзіна актуальнай размовы «Земля без воды мертва, человек без семьи – пустоцвет» у Засоўеўскай сельскай бібліятэцы-клубе, гадзіна карысных парад «Маладой маме на заметку» ў Акцябрскай сельскай бібліятэцы, гадзіна-роздум для моладзі «Як стварыць і зберагчы моцную сям'ю» ў Завішынскай сельскай бібліятэцы.

У Старасвержанскай сельскай бібліятэцы Стаўбцоўскага раёна прайшлі такія мерапрыемствы, як «Тыдзень маці» з відэа-віншаваннем «Аб матулі – з любоўю» і заключным канцэртам-ушанаваннем, выстава-дыялог «Сям'я і кніга», акцыя «Дом без адзіноты». Тыдзень завяршыўся фотаконкурсам «Побач з мамай». Сумесна з цэнтрам культуры да Міжнароднага дня сям'і было падрыхтавана свята «Сям'я – тэрыторыя настрою», праграма якога ўключала бібліятэчную выставу-рэкамендацыю «Кніга твайго фармату», конкурс сямейнага малюнка, «Сямейны вернісаж» (выстава букетаў, розных самаробак, вышыванак і г.д.). Увазе прысутных быў прадстаўлены слайдфільм-віншаванне «Дом любячых сэрцаў – дом без адзіноты».

## *Патрыятычнае выхаванне*

Галоўнай задачай патрыятычнага выхавання з'яўляецца фарміраванне грамадзянскай адказназнасці і нацыянальнай самасвядомасці асобы. Надзвычай важнае значэнне гэтая актуальная задача набывае ў працэсе выхавання падрастаючага пакалення ў духу адданасці Айчыне. Моладзь павінна ведаць гераічнае мінулае продкаў, ушаноўваць іх ратныя і працоўныя подзвігі і годна працягваць доблесныя справы папярэднікаў.

Бібліятэкі Мінскай вобласці, усведамляючы сваю ролю ў дзяржаўнай культурнай палітыцы і з'яўляючыся фактычнымі захавальнікамі нацыянальных культурных традыцый, імкнуцца максімальна эфектыўна выкарыстоўваць бібліятэчны прафесійны і інфармацыйны патэнцыял у здзяйсненні патрыятычнага выхавання насельніцтва.

Нарацкая пасялковая бібліятэка Мядзельскага раёна распрацавала праект па патрыятычным выхаванні дзяцей і падлеткаў «З памяццю ў сэрцы», мэта якога – фарміраванне ў маладога пакалення свядомасці грамадзяніна-патрыёта шляхам вывучэння і засваення айчыннай гістарычнай спадчыны. Праект садзейнічае выхаванню патрыятызму і гонару за сваю Радзіму, вучыць павазе да ваеннай гісторыі і яе ветэранаў, знаёміць з літаратурай аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны. У рамках праекта прайшло шмат мерапрыемстваў, адным з якіх быў вечар-успамін «Па апаленай зямлі дайшоў я да Берліна» (прысвечаны ветэрану Вялікай Айчыннай вайны І.І.Яцыне).

Рэгіянальны праект дзейнічае ў бібліятэках Мінскага раёна «Без прошлого – нет будущего», які скіраваны на фарміраванне рознабакова развітай асобы.

Шматлікія акцыі былі падрыхтаваны бібліятэкамі вобласці да 76-годдзя перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

У ДУ «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка» традыцыйна праводзіліся наведванні на даму ветэранаў, удзельнікаў вайны, інвалідаў, сем'яў загінулых – «Ветэран», «Клопат», «Дні добрых паслуг» і інш.

ДУК «Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна» правяла акцыю «Читаем книги о войне». Супрацоўнікі бібліятэкі прынялі ўдзел у шэсці «Бессмертный полк», якое адбылося 9 мая каля помніка «Матери-патриотке». У рамках святочнай інфармацыйнай пляцоўкі «Вечная память мужеству!» прайшлі наступныя мерапрыемствы: гульня-пазл «Боевая техника Великой Отечественной войны», майстар-клас «Букет для ветерана», фотаапавяданне «Дети – герои Великой Отечественной войны», конкурс малюнкаў «Дети рисуют мирное небо» і віктарына «Великая Победа».

У публічных бібліятэках Капыльскага раёна праводзілася акцыя «Дачытаем да Перамогі» з мітынгам-рэквіемам «Не все домой вернулись с войны». Сумесна з ветэранскай арганізацый гаспадаркі і Капыльскім сельвыканкамам было наладжана мерапрыемства «І помніць страшна, і забыць нельга», якое адбылося ў Дзяржынскай сельскай бібліятэцы-клубе. Сустрэча з вязнем фашысцкага лагера смерці прайшла ў Жыліхаўскай сельскай бібліятэцы. Там жа арганізавалі велапрабег да помнікаў загінулых і добраўпарадкаванне мемарыяльнага месца.

У Коласаўскай сельскай бібліятэцы Крупскага раёна дзейнічае праект «Вяртаюцца да нас салдат імёны», мэта якога – пошук родных і блізкіх загінулых у час вайны салдат, якія пахаваны ў вёсцы Замкі.

На працягу года бібліятэкі Любанскага раёна прымалі ўдзел у акцыях «Чыстыя чацвяргі каля помнікаў» і «Ветэран».

У сельскай бібліятэцы аграгарадка Аляхновічы Маладзечанскага раёна да Дня Перамогі правялі акцыю «Мы галасуем за мір». Дзеці чыталі вершы, запалілі свечку памяці каля помніка загінулым.

Да свята Перамогі ў гарадскім парку супрацоўнікі Старадарожскай цэнтральнай бібліятэкі правялі акцыю «Я помню! Я горжусь!». У рамках мерапрыемства жыхары горада прынялі ўдзел у вахце памяці «Найди имя деда».

Мар’інагорская гарадская бібліятэка Пухавіцкага раёна да Дня абаронцаў Айчыны распрацавала акцыю «Любіце Радзіму – Айчыну сваю», у ходзе якой прайшло шмат цікавых

мерапрыемстваў. У чытальнай зале была афармлена экспазіцыя, цэнтральнае месца ў якой займала выстава работ настаўніцы ЦТДМ «Світанак» Гняўчынскай Л.М. – роспіс па шклу, тэма якога прысвячалася людзям, чый лёс звязаны з Узброенымі сіламі Рэспублікі Беларусь. Выстава суправаджалася гадзінамі патрыятычнай інфармацыі «Усё, чым трэба даражыць».

Апошні месяц вясны ў Мар’інагорскай гарадской бібліятэцы даў старт ваенна-патрыятычнай акцыі «Рэха вайны», якая праходзіла пад дэвізам «Ніхто не забыты, нішто не забыта». Насычаным быў дзень 6 мая, які паслужыў пачаткам правядзення мерапрыемстваў акцыі. У гэты дзень супрацоўнікі бібліятэкі на базе ДУ ТЦСАН падрыхтавалі і правялі сямейны ваяж «Дом, дзе захоўваецца натхненне», прысвечаны Дню Перамогі. На сустрэчу былі запрошаны нашчадкі тых, хто ваяваў з фашыстамі.

Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М.Танка працягвае збор матэрыялаў для паўнатэкставай базы дадзеных «Пусть в памяти останутся эти имена». Электронны дакумент змяшчае звесткі пра ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны Мядзельшчыны.

Перад Днём Перамогі бібліятэкі Уздзенскага раёна правялі валанцёрскія акцыі па добраўпарадкаванні помнікаў: «Рэха вайны незабытай» (Сямёнавіцкая сельская бібліятэка), «Па слядах вялікай мужнасці» (Нёманская сельская бібліятэка), «Спыніся ля абеліска» (Лашанская сельская бібліятэка).

У Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя А.Х. Каладзеева сумесная з МАУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Пскова» (Расія) адбыўся вебінар «На грани смертельного круга», дзе прагучаў даклад Л. Л. Ціхановіч «Наби Дуали». Таксама адбылася прэзентацыя кнігі «Дневник памяти» А.А. Балябіна і выстава фотадакументаў «По ту сторону. Неизвестные фотографии с оккупированной территории СССР и советско-германского фронта (1941-1945гг.)».

У красавіку у рамках праекта Бярэзінскай раённай бібліятэкі «Краязнаўчы лекторый на колах» прайшоў

маладзёжны прабег па мясцінах памяці ахвяраў акупацыі на Бярэзіншчыне, прымеркаваны да Дня памяці яўрэяў – ахвяраў фашызму і да 75-й гадавіны фашысцкай расправы з падпольшчыкамі г. Беразіно, праведзены экскурс-дайджэст «Стаіць ў парку сціплы абеліск», каля манументаў памяці адбыліся рэквіем-маналогі «Жоўтая зорка трагедыі і жалобы над мястэчкам Беразіно» і «Быць падпольшчыкам – двайная рызыка».

15 лютага адзначаецца Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў. Ва усіх бібліятэках Мінскай вобласці да гэтай даты былі арганізаваны рознапланавыя мерапрыемствы. Тыдзень памяці «Афганістан: ведаць, каб не паўтарылася», які наладзілі супрацоўнікі Бярэзінскай раённай бібліятэкі, быў адрасаваны моладзі. Навучэнцам з райцэнтра Беразіно і аграгарадка Паплавы бібліятэкары прапанавалі тэатр маналога «Афганский ветер злой прошумел над моею судьбой». Пакладзеныя ў аснову монатэатралізацыі гісторыі з кнігі С. Алексіевіч «Цынкавыя хлопчыкі» і прачытаныя як бы ад першай асобы пранікнёна-шчырыя споведзі герояў аказвалі моцнае эмацыянальнае ўздзеянне на слухачоў.

ДУ «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка» правяла гадзіну памяці «Афганскі боль» У Фаніпальскай гарпасялковай бібліятэцы Дзяржынскага раёна адбыўся вечар памяці «Место подвига – Афганистан». У ДУК «Цэнтральная гардская бібліятэка г. Жодзіна» арганізавалі выставу «Афганистан. Память и боль», героіка-патрыятычную хвіліну «Афганистан – наша память и боль». Супрацоўнікі Капыльскай раённай цэнтральнай бібліятэкі імя А.Астрэйкі кожны год сумесна з раённай арганізацый ДТСААФ удзельнічаюць у падрыхтоўцы мітынга-рэквіема, прысвечанага Дню памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў. У самой бібліятэцы была арганізавана старонка памяці «Подзвіг і памяць Афганістана». Да 50-годдзя з дня нараджэння воіна-інтэрнацыяналіста Дзмітрыя Іванавіча Калевіча, які загінуў, выконваючы інтэрнацыянальны абавязак, правялі гадзіну біяграфіі «Ён загінуў у Афганістане». У сельскіх бібліятэках Любанскага

раёна да Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў былі праведзены: сустрэча з воінамі-афганцамі «Время выбрало нас» (Малагарадзяціцкая сельская бібліятэка), гадзіны памяці «Долг и память» (Сароцкая сельская бібліятэка), «Остался в сердце вечный след Афганистана» (Рачэнская сельская бібліятэка), гутарка-дыялог «Сёння дапрызыўнік – заўтра салдат» (Атраднаўская сельская бібліятэка). Сустэчу «Выполняя долг интернациональный» правялі ў Мінскай раённай цэнтральнай бібліятэцы. Пухавіцкая раённая бібліятэка запрасіла навучэнцаў старэйшых класаў ДУА «Сярэдняя школа СШ № 4 г. Мар’іна Горка» на ўрок мужнасці «Дакраніся сэрцам да подзвігу». На краязнаўчым матэрыяле быў падрыхтаваны відэафільм «Афган. Полымя вайны». Патрыятычная гадзіна «Афганістан: подзвіг жывы, непаўторны і вечны» адбылася ў ДУ « Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка». На сустрэчы перад вучнямі выступіў ветэран баявых дзеянняў у Афганістане. Ён расказаў падлеткам пра нялёгкую службу, пра гераізм савецкіх салдат і афіцэраў, пра дапамогу, якую аказвалі нашы ваенныя мірнаму насельніцтву, а таксама заклікаў берагчы мір на Зямлі.

Асаблівую ўвагу бібліятэкі Пухавіцкага раёна надавалі юбілеям гістарычных падзей і асоб, якія праславілі Беларусь у свеце. У 2017 годзе адзначалася 200-годдзе Тадэвуша Касцюшкі. Ваенны і палітычны дзеяч Рэчы Паспалітай, кіраўнік Польскага паўстання 1794 года, нацыянальны герой Польшчы, США і Беларусі заўсёды лічыў сябе ліцьвінам і па духу, і па нараджэнні. У сярэдніх класах Дружненскай школы бібліятэкарам Дружненскай дзіцячай бібліятэкі быў праведзены бібліяаповед «Нарадзіўся я ліцвінам» пра жыццё і дзейнасць Тадэвуша Касцюшкі. На працягу года дзяцей знаёмілі з аўдыя- і відэаматэрыяламі пра выбітнага сына нашай Радзімы. Бібліятэкар прымала ўдзел у рабоце міжнароднай навуковай канферэнцыі ў Інстытуце мовазнаўства пры АН Беларусі, прысвечанай Тадэвушу Касцюшку.

7 лістапада 2017 года адзначалася 100-годдзе Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года. Бібліятэкамі Мінскай

воблаці да гэтай падзеі было падрыхтавана вельмі шмат мерапрыемстваў, кніжных праглядаў, электронных прэзентацый, экскурсаў у гісторыю і інш.

Да 100-годзя Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Лагойскай раённай цэнтральнай бібліятэцы была арганізавана выстава-панарама «Быў дзень. Быў год. Была эпоха». У Мядзельскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя М. Танка дзейнічала тэматычная кніжная выстава «Старонкі гераічнай гісторыі». На выставе была прадстаўлена літаратура, якая адлюстроўвала падзеі тых дзён, а таксама кнігі з рэпрадукцыямі карцін знакамітых мастакоў на рэвалюцыйную тэму. На вечарыну Уздзенскай цэнтральнай раённай бібліятэкі «Вехи истории: Октябрь 1917 года» сабраліся ўдзельнікі клуба «Залаты ўзрост». Увазе прысутных былі прапанаваны мультымедыйная прэзентацыя, фотаздымкі мінулых гадоў, музыка, патрыятычныя песні, кадры кінахронікі і мастацкіх фільмаў. У ходзе мерапрыемства прагучала інфармацыя пра кавалераў Ордэна Кастрычніцкай Рэвалюцыі – ураджэнцаў Уздзеншчыны. У свой час гэтую ўзнагароду атрымалі А. Бондар, У. Барбарчык, М. Герасіменка, Г. Дубовік і іншыя працаўнікі раёна.

Да Дня яднання Беларусі і Расіі, які адзначаецца 2 красавіка, супрацоўнікі Бярэзінскай раённай цэнтральнай бібліятэкі ладзілі акцыю-марафон «Бярэзінскія аграгарадкі чытаюць паэтычныя радкі». На вытворчых участках, у школах, установах культуры, у іншых людных месцах (на пошце, у магазінах, ФАПах) адбыліся імправізаваныя народныя паэтычныя чытанні. Добрая паэзія не ведае моўных і нацыянальных абмежаванняў. Аднолькава ўзнёсла гучалі радкі на рускай і беларускай мовах, увачавідкі падмацоўваючы лозунг паэтычных чытанняў: «Саюз дзяржаў – саюз паэзій».

Гістарычны экскурс да Дня яднання Беларусі і Расіі «Пока мы едины – мы непобедимы» прайшоў у Негарэльскай сельскай бібліятэцы Дзяржынскага раёна.

Да 20-годдзя з часу падпісання Дагавору аб Саюзе Беларусі і Расіі ў Стаўбцоўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы

адбылася інфармацыйная гадзіна « Расія і Беларусь: агульны лёс і гісторыя».

У сакавіку ў Дзяржынскім раёне да Дня Канстытуцыі РБ у сельскіх бібліятэках масава прайшлі патрыятычныя акцыі, адна з іх «Мы – грамадзяне Беларусі». Гадзіна разважання «Правы і абавязкі» прайшла ў Ждановіцкай сельскай бібліятэцы, инфармацыйная гадзіна «Асноўны закон Рэспублікі Беларусь» – у Каладзішчанскай сельскай бібліятэцы № 1.

Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А.Астрэйкі прыняла ўдзел ва ўсебеларускай патрыятычнай акцыі «Мы – грамадзяне Рэспублікі Беларусь», якая была прысвечана Дню Канстытуцыі. Самыя актыўныя і ініцыятыўныя вучні школ раёна ва ўрачыстай абстаноўцы атрымалі свой галоўны дакумент – пашпарт.

У г. Узда вучняў школ віталі ў Палацы культуры афіцыйныя асобы раённага выканаўчага камітэта, першы сакратар Уздзенскага РА ГА «БРСМ» Ю.С. Зяневіч, старшыня раённага савета воінаў-інтэрнацыяналістаў І.П. Аліпаў і начальнік аддзялення па грамадзянству і міграцыі Уздзенскага РАУС В.І. Гічык. Падлеткам уручылі пашпарты і падарачныя выданні «Я – грамадзянін Рэспублікі Беларусь». Маладым людзям, якія ўпершыню атрымалі пашпарты, Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка прапанавала паўдзельнічаць у квэсце «Жывая бібліятэка».

З ліпеня адзначаецца адно з галоўных свят Рэспублікі Беларусь – Дзень Незалежнасці. Бібліятэкары Салігорскай раённай цэнтральнай і дзіцячай бібліятэк прадставілі маляўніча аформленную выставу «Разам з усёй краінай» у парку чатырох стыхій, дзе традыцыйна адбываюцца масавыя мерапрыемствы, і арганізавалі інтэрактыўную пляцоўку «Читающая скамейка». У Уздзенскай раённай цэнтральнай бібліятэцы правялі тэматычны вечар «Квітней, Беларусь!» для сяброў клуба «Залаты ўзрост», сустрэчу з дэлегацыямі раёнаў-пабрацімаў – Шатурскага Маскоўскай вобласці і Яванскага Рэспублікі Таджыкістан. Літаратурна-музычная сустрэча «Люби свой край и воспевай» адбылася ў Камянкоўскай сельскай бібліятэцы, гадзіна

святочнай інфармацыі «Горжусь тобою, Беларусь!» – у Зенькавіцкай сельскай бібліятэцы).

### *Эстэтычнае выхаванне*

Асноўнай сваёй задачай у эстэтычным выхаванні бібліятэкі лічаць далучэнне чытачоў да скарбніцы айчыннай і сусветнай культуры, літаратуры, мастацтва, садзейнічанне развіццю мыслення і мастацкага густу, фарміраванне творчай, гарманічна развітай асобы. Працу ў гэтым напрамку яны каардынуюць з навучальнымі ўстановамі, клубамі, музеямі, школамі мастацтваў, іншымі ўстановамі і арганізацыямі. У праводзімых мерапрыемствах шырока выкарыстоўваюцца выяўленчыя матэрыялы, музыка і відэафільмы, на сустрэчы з чытачамі запрашаюцца пісьменнікі, прадстаўнікі творчых прафесій. Працягваецца работа па выяўленні таленавітых людзей.

**Да юбілейных дат сусветна вядомых літаратараў** бібліятэкары правялі наступныя акцыі: «Цвятаева для ўсіх» (да 125-годдзя М. Цвятаевай); «Кніга супраць адзіноты» па кнізе «100 гадоў адзіноты» (да 90-годдзя нобелеўскага лаўрэата, калумбійскага пісьменніка Г.Маркеса); «Кожная Асоль чакае свайго прынца» (да 95-годдзя выдання твора А.Грына «Пунцавыя ветразі» и інш.

У Забалацкай сельскай бібліятэцы Дзяржынскага раёна правялі музычна-паэтычную вечарыну па творчасці Бэлы Ахмадулінай «И ляжет на душу добро…». Вершаваныя замалёўкі «Яго песні гучаць і сёння» да 85-годдзя з дня нараджэння Р. Раждзественскага прапанавала карыстальнікам Навасёлкаўская інтэграваная сельская бібліятэка. Літаратурны салон «Путешествие в глубь человеческой души», прысвечаны класіку рускай літаратуры Валянціну Распуціну, адбыўся ў Данілавіцкай інтэграванай сельскай бібліятэцы. Супрацоўнікамі абанемента Дзяржынскай цэнтральнай бібліятэкі падрыхтаваны цыкл рэтра-вечароў «Залатыя паліцы

нашай маладосці», прысвечаны кнігам, якія былі папулярнымі ў розныя дзесяцігоддзі XX стагоддзя.

У Навасержанскай сельскай бібліятэцы Стаўбцоўскага раёна на працягу года актыўна працаваў клуб «Жаночая магія». Клуб налічвае 8 удзельніц, пасяджэнні ладзяцца 2 разы на месяц.

ДУК «Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна» ў рамках клуба «Золотая осень» правялі арт-сустрэчу «Жыць тэатрам», музычна-літаратурны вечар «Так бел, что опаляет веки», вечар-знаёмства «Волошин в искусстве и стихах».

У Салігорскай раённай цэнтральнай бібліятэцы працягвалася дзейнасць праекта «Культурный код Солигорска». Распрацаваны новы тапанімічны відэамаршрут «ВО!кругСолигорска». «Культурные навигаторы» (навучэнцы УА «Салігорскі дзяржаўны коледж») сталі на час вучонымі-тапаністамі і праклалі новы віртуальны маршрут па Салігорскім раёне.

Аддзел абслугоўвання і інфармацыі чытачоў ДУ «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка» запрасіў аматараў лірычнай музыкі на літаратурна-музычны вечар «Романса трепетные звуки». Вядучыя расказалі прысутным аб гісторыі ўзнікнення раманса, пазнаёмілі з найбольш папулярнымі творамі гэтага жанру. Слайд-панарама дапамагла зрабіць аповед больш запамінальным. Жывая музыка, рамансы гучалі ў выкананні навучэнцаў і выкладчыкаў музычнай школы.

З мэтай эстэтычнага выхавання насельніцтва ў бібліятэках Крупскага раёна праведзены інвармацыйна-пазнавальныя гадзіны да юбілеяў М. Шагала і І.Шышкіна «У свеце мастацтва»; Бобрская гарпасялковая бібліятэка правяла вечар этыкету «Гаспадары і госці»; Дакудаўская сельская бібліятэка ладзіла музычную гасцёўню «Чароўны дом музыкі»; Ухвальская сельская бібліятэка арганізавала гутарку «Праз кнігу ў свет мастацтва» і інш.

У бібліятэках Старадарожскага раёна шмат увагі надавалася маральнаму і эстэтычнаму выхаванню маладых карыстальнікаў, праводзілася шмат цікавых мерапрыемстваў для

гэтай катэгорыі чытачоў. Былі аформлены пастаянна дзеючыя кніжныя выставы і тэматычныя паліцы: «Книга. Молодость. Успех» (Палажэвіцкая сельская бібліятэка), «Моладзь – наша будучыня» і «Будущее в руках молодёжи» (Сінягоўская сельская бібліятэка), «Маладзёжны мерыдыян» (Шапчыцкая сельская бібліятэка-клуб), «Молодёжь читает и советует» (Церабуцкая сельская бібліятэка).

**Выхаванню літаратурнага густу** чытачоў у ДУ «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка» спрыялі літаратурныя вечарыны і сустрэчы, дні пісьменніка, гасцёўні, вечары памяці. Так, да 195-годдзя Ф. Дастаеўскага прайшоў агляд творчасці пісьменніка «Час. Асоба. Талент». Багданаўская сельская бібліятэка сумесна з СДК прысвяцілі 70-годдзю М. Фінберга літаратурна-музычную гасцёўню «Мелодыя – яго жыццё». Кніжныя выставы наладжваліся да 215-годдзя В. Гюго – «Час. Асоба. Лёс», да 80-годдзя Б. Ахмадулінай – «Б. Ахмадуліна: лёс і кнігі».

У Любанскім раёне да 100-годдзя з дня нараджэння Сідні Шэлдан правялі літаратурны аўтограф «Звёзды светят вниз» (Пластокская сельская бібліятэка); да 125-годдзя з дня нараджэння Канстанціна Паўстоўскага – тэматычны агляд «Пясняр прыроды» (Обчынская сельская бібліятэка), літаратурную замалёўку «Великий писатель русской земли» (Дарасінская сельская бібліятэка); да 85-годдзя з дня нараджэння Роберта Раждзественскага – літарaратурна-музычную кампазіцыю «Жил я впервые на этой земле» (Малагарадзяціцкая сельская бібліятэка), гадзіну паэта «Все начинается с любви» (Асавецкая сельская бібліятэка) і інш.

Праца, творчасць, маральны выбар, гармонія і прыгажосць, літаратура і мастацтва – усё гэта знайшло адлюстраванне ў рэалізацыі праектаў эстэтычнага развіцця асобы ДУ «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А.Астрэйкі» «Книга, кисть и карандаш…» і «Хай кніга падтрымае вас».

Так, дзякуючы праекту «Книга, кисть и карандаш…» чытачы бібліятэк адкрылі для сябе кнігу «Маленький принц»

Антуана дэ Сэнт Экзюперы, якой былі прысвечаны творчыя праекты у гэтым годзе.

Для чытачоў старэйшага школьнага ўзросту ў ДУ «Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка» з 1996 года працуе літаратурна-музычная гасцёўня «Натхненне», дзейнасць якой накіравана на выхаванне эстэтычнага і мастацкага густу, навучанне лагічнаму разважанню і выяўленне артыстычных здольнасцяў падлеткаў.

Супрацоўнікі Ждановіцкай сельскай бібліятэкі Мінскага раёна запрасілі чытачоў на гутарку «Мастацтва стварэння вітража» з членам Беларускага саюза дызайнераў Пліско Уладзімірам Валянцінавічам.

У Крывіцкай пасялковай бібліятэцы Мядзельскага раёна на працягу года дзейнічалі кніжныя выставы «Дарога да храма – дарога з дарог», «Праваслаўныя святыні краю», «Аб ісцінах простых і вечных», «Спяшайцеся рабіць дабро», «Духовность спасёт мир», «Храм пабудуй у душы» і інш.

У бібліятэках Крупскага раёна праведзены: вечар этыкету «Гаспадары і госці» (Бобрская гарпасялковая бібліятэка), музычная гасцёўня «Чароўны дом музыкі» (Дакудаўская сельская бібліятэка-клуб), гутарка «Праз кнігу ў свет мастацтва» (Ухвальская сельская бібліятэка) і інш.

## ***Духоўна-маральнае выхаванне***

Для станаўлення асобы надзвычай важнае значэнне мае фарміраванне маральных паняццяў і эталонных арыенціраў у стасунках, як непасрэдна з іншымі людзьмі, так і са светам у цэлым. Вялікая роля ў духоўна-маральным выхаванні чалавека належыць кнізе.

Пры ДУ «Дзяржынская раённая цэнтралізаваная сетка бібліятэк» працуе духоўна-культурны цэнтр, які праводзіць кансультацыі для карыстальнікаў па пытаннях выбару літаратуры, рэкамендуе кнігі, аказвае дапамогу ў пошуку і падборы неабходнай інфармацыі.

Напярэдадні праваслаўнага свята Пакрова Прасвятой Багародзіцы ў цэнтральнай раённай бібліятэцы прайшлі II Пакроўскія чытанні «Сокровенного слова сияние». У рамках фестывалю праваслаўнай культуры «Кладезь» прайшла сустрэча «Медыцына і праваслаўе» з урачом-хірургам Дзіцячага хірургічнага цэнтра г. Мінска Уладзімірам Хомічам. У рамках месячніка праваслаўнай кнігі прайшоў духоўны дыялог-адкрыццё «Жить для дел добра».

Працягвалася работа і ў Маладзечанскім раёне ў рамках праекта «Кропелькі вечнасці», які распрацаваны супрацоўнікамі ДУК «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча» сумесна з Маладзечанскім благачыннем.

На працягу года ў ДУК «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча» прайшлі праваслаўныя кінасеансы «У надзеі, веры і любові», на якіх чытачы мелі магчымасць пазнаёміцца з фільмамі духоўнай тэматыкі. Падрыхтаваны цыкл радыёперадач «Святыні храмаў Маладзечаншчыны». У бібліятэцы адбыліся дзве сустрэчы з інакіняй Нінай Загорскай, насельніцай Свята-Елізавецінскага манастыра.

У бібліятэках Смалявіцкага раёна адбыліся гадзіны цікавай інфармацыі: «Свята святаў – Вялікдзень», «Троица» – у Забалоцкай сельскай бібліятэцы; «Душа – очевидца Бога» – у Прылепскай сельскай бібліятэцы. У студзені 2017 года быў адчынены цэнтр духоўнага адраджэння ў ДУ «Смалявіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча».

У 2017 годзе ДУК «Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна» працягвала папаўняць фонд духоўнай літаратурай выдавецтва Беларускага Экзархата. Афармлена падпіска на перыядычныя выданні праваслаўнай тэматыкі: «Воскресение», «Царкоўнае слова», часопісы «Врата небесные», «Фома», «Наука и религия». Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна працягвае супрацоўніцтва з метадычным аб’яднаннем праваслаўных педагогаў горада «Истоки»

Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка да Дня праваслаўнай кнігі правяла экскурсію «Праз кнігі да

духоўнасці». У сельскіх бібліятэках Салігорскага раёна адбыліся наступныя мерапрыемствы: праваслаўная гадзіна «Збожжа святла і дабра» (Хорастаўская сельская экалагічная бібліятэка), гутарка «Духоўных кніг боская мудрасць» (Чырвонаслабодская гарпасялковая экалагічная бібліятэка).

Бібліятэкары ДУ «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка» ў 2017 годзе актыўна ўдзельнічалі ў канферэнцыях, семінарах духоўна-асветніцкай тэматыкі. Загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу прыняла ўдзел у рэспубліканскім семінары «Гісторыя Праваслаўя роднага краю: вопыт і методыка вывучэння» з дакладам «Праваслаўнае краязнаўства як адзін са шляхоў духоўнага развіцця асобы: вопыт бібліятэчнай дзейнасці».

Загадчыца аддзела абслугоўвання і інфармацыі чытачоў выступіла на канферэнцыі «Духоўнае адраджэнне грамадства і праваслаўная кніга» ў рамках XXIII Міжнародных Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытанняў з дакладам «Кніга як духоўная апора ў жыцці чалавека: вопыт асветніцкай дзейнасці аддзела абслугоўвання і інфармацыі чытачоў Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі».

Сямейны клуб «Згода» дзейнічае з 13 лістапада 2017 года ў Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Паўлюка Пранузы. Кіраўнік клуба – Валянціна Шчарбакова. Сярод заснавальнікаў і пастаянных удзельнікаў клуба і благачынны Нясвіжскай царкоўнай акругі протаіерэй Аляксандр Данчанка, які з’яўляецца яшчэ і сямейным псіхолагам.

У справаздачным годзе ў Мядзельскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя М.Танка пачаў працаваць духоўна-асветніцкі цэнтр «Духоўнасць. Вера. Вечнасць», які карыстаецца вялікім попытам у чытачоў. Мэта цэнтра – забяспечыць кожнаму, хто мае патрэбу ў духоўнай падтрымцы і дапамозе, даступнасць выданняў духоўнай тэматыкі.

Тэма духоўнасці ў Крупскім раёне адлюстравана ў дзейнасці Ухвальскай сельскай бібліятэкі, дзе распрацавана праграма духоўнага выхавання «На шляху да духоўнасці» (2015–2018гг.) .У рамках праграмы ў бібліятэцы адбыліся

сустрэчы са святаром, праваслаўная гадзіна «Калі хочаш ведаць свой край – у бібліятэку завітай» і інш. У Крупскай цэнтральнай раённай бібліятэцы у Дзень праваслаўнай кнігі, які быў прысвечаны беларускаму кнігадрукаванню, адбылася сустрэча «Святло друкаванага слова» з протаіерэем Мікалаем, настаяцелем прыхода храма Свяціцеля Мікалая Цудатворца г.Крупкі. Да сустрэчы была аформлена кніжная выстава «Біблія – крыніца ісціны і мудрасці».

Цікавыя для чытачоў пастаянна дзеючыя ў Вілейскай раённай цэнтральнай бібліятэцы імя Г.Новік экспазіцыі праваслаўных кніг «Духоўная кніга – крыніца мудрасці», «Свет разумения книжного». У бібліятэцы сямейнага чытання ў лютым 2017 года цікава і змястоўна прайшла прэзентацыя кніг «Духовные книги – книги о главном», на якой прысутнічалі людзі featured рознага ўзросту і рознага веравызнання. «Жывая крыніца праваслаўнай літаратуры» – так называлася гадзіна духоўнасці з аднайменнай кніжнай выставай.

У Старадарожскім раёне прайшлі наступныя мерапрыемствы: гадзіна духоўнасці «Вот и Пасха, запах воска, запах теплых куличей», гадзіна зносін «Да не угаснет свет лампад» (Старадарожская сельская бібліятэка; гадзіна духоўнасці «Крупицы мудрости», праваслаўная размова «Да духоўнасці – праз кнігу» (Сінягоўская сельская бібліятэка); гадзіна духоўнасці «Шляхам служэння Богу і людзям», гадзіна мудрасці «Дзесяць галоўных крокаў,што вядуць да Бога», гутарка «Вялікі пост – школа пакаяння» (Падарэская сельская бібліятэка); інфармацыйная гадзіна «На крыжовых шляхах: праваслаўныя храмы» , гадзіна хрысціянскіх ведаў «Православие – путь к сердцу» (Паставіцкая сельская бібліятэка); віртуальнае падарожжа «Храмов благовест святой» (Языльская сельская бібліятэка).

У ДУ «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка» на працягу года значная ўвага надавалася духоўна-маральнаму выхаванню карыстальнікаў бібліятэк на аснове айчынных культурных і рэлігійных традыцый. З гэтай мэтай арганізоўваліся кніжныя выставы «Каб духоўна не бяднець,

любоў да кнігі трэба мець», «Калі прачынаецца душа», «Запаліце зоркі памяці і надзеі» (да Дня памяці продкаў), прагляды навінак духоўнай літаратуры і перыёдыкі «Вера. Церковь. Духовность», «Светлое, доброе, вечное», «Моладзь і рэлігія» і інш.

У рамках мэтавай праграмы «Духовность и книга» ў бібліятэках Любанскага раёна прайшлі: гадзіна духоўнасці «Мир православия» (Кузьміцкая сельская бібліятэка), гадзіна ведаў «Под голубой звездой Вифлеема» (Асавецкая сельская бібліятэка), калядкі «Хрыстос уваскрос!» (Рэдкавіцкая сельская бібліятэка), літаратурны вечар «Нябесная апякунка Беларусі» (Тальская сельская бібліятэка).

У Мінскай раённай цэнтральнай бібліятэцы аформлены выставы духоўнай тэматыкі «Духовное наследие», «Мир в дом».

Духоўна-асветніцкі цэнтр створаны ў 2008 годзе ў Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя І.Х.Каладзеева як аддзел бібліятэкі, галоўная мэта якога – фарміраванне ў карыстальнікаў духоўных каштоўнасцей на аснове хрысціянскіх традыцый. Ужо 10-ы год цэнтр абслугоўвае чытачоў усіх узростаў, прадстаўнікоў усіх рэлігійных канфесій, якія існуюць на тэрыторыі Барысаўскага раёна,– дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі, вайскоўцаў, навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, школьнікаў, пенсіянераў, прыёмных бацькоў, сем'і з дзецьмі-інвалідамі, маладых інвалідаў.

Сярод сумесных мерапрыемстваў цэнтральнай бібліятэкі і Барысаўскай епархіі варта вылучыць новую форму працы ў бібліятэчным асяроддзі – выязны тэматычны вусны часопіс «Дабравест», прымеркаваны да Дня праваслаўнай кнігі, які паспяхова рэалізуецца на працягу 5 гадоў у сельскіх бібліятэках Барысаўскага раёна. 15 сакавіка 2017 у духоўна-асветніцкім цэнтры Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя. І.Х.Каладзеева прайшло мерапрыемства, прысвечанае адкрыццю месячніка праваслаўнай кнігі на Барысаўшчыне. У ім прынялі ўдзел супрацоўнікі школьных і сельскіх бібліятэк, члены метадычнага аб'яднання бібліятэкараў Барысаўскага раёна, якія працуюць з праваслаўнай кнігай. Месячнік праваслаўнай кнігі

праходзіў з 14 сакавіка па 6 красавіка, супрацоўнікі цэнтральнай бібліятэкі і святары Барысаўскай дыяцэзіі наведалі 13 вёсак з выязным вусным часопісам «Дабравест». На мерапрыемствах пабывалі 612 жыхароў Барысаўскага раёна.

### *Прававое выхаванне*

Адной з умоў развіцця любога грамадства з'яўляецца выхаванне ў грамадзян павагі да законаў сваёй краіны. Вельмі важная роля ў гэтай рабоце належыць бібліятэкам, якія маюць неабходныя інфармацыйныя рэсурсы і магчымасці данесці прававыя веды да самых розных пластоў насельніцтва.

Бібліятэкі Мінскай вобласці прынялі ўдзел у акцыі «Дружим с законом!».

Сельскія бібліятэкі Бярэзіншчыны ў справаздачны 2017 г. актывізавалі работу з дзецьмі і падлеткамі. Паплаўская СІБ аграгарадка працавала над рэалізацыяй праекта для дзяцей і падлеткаў «Маленькія дзеці – вялікія правы».

На працягу года ў рамках міжведамаснай праграмы «Забота» ў Салігорскім раёне (з 1мая па 1 кастрычніка) праводзілася работа з падлеткамі, якія патрабуюць асаблівай увагі і якія стаяць на розных відах прафілактычнага ўліку. Бібліятэкі каардынавалі працу ў гэтым напрамку з інспекцыяй па справах непаўналетніх і сацыяльнымі педагогамі агульнаадукацыйных школ раёна. 76 такіх падлеткаў чыталі ў бібліятэках раёна і прымалі ўдзел у бібліятэчных мерапрыемствах.

**Да Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь** прайшлі мерапрыемствы: прававая гадзіна з паказам мультымедыйнай прэзентацыі «Канстытуцыя абавязвае і ахоўвае», акцыя «Мы – грамадзяне Беларусі», тэматычныя паліца «Дэкларацыя правоў чалавека», гутаркі з участковым інспектарам: «Падлетак і яго вольны час», «Якім быць і як жыць», гадзіна палітінфармацыі «Дзень Канстытуцыі», гадзіна прававых ведаў «Няма правоў без абавязкаў», тэматычныя выставы «Канстытуцыя маёй краіны», «Закон – адзін для кожнага», «Асноўны закон нашага жыцця»,

«Дзяржаўныя сімвалы нашай краіны» (Валожынскі раён); ўрок прававых ведаў «Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь – наш арыенцір», віктарына «Што мы ведаем пра Канстытуцыю?» (Лагойскі раён); гадзіна разважання «Правы і абавязкі», інфо-дайджэст «Асноўны закон Беларусі», інфармацыйная гадзіна «Асноўны закон краіны» (Мінскі раён); гадзіны прававых ведаў «Канстытуцця – прававая аснова нашага жыцця», «Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь – асноўны закон нашай дзяржавы», «Знаёмцеся: закон законаў», віртуальнае падарожжа «Прававы эрудыт», медыяхвілінкі «Ведаць правы і абавязкі дзяцінства» (Пухавіцкі раён); гадзіны права «Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь – галоўны закон краіны», выстаўка-прагляд літаратуры «Беларусь: гісторыя і сучаснасць» (Салігорскі раён); гутарка «Я – грамадзянін Беларусі», прававая гадзіна «Падлетак. Закон. Права», пазнавальная гадзіна «Канстытуцыя маёй краіны»(Уздезенскі раён); тэматычная паліца «Человек имеет право», агляд «Человек имеет право», агляд прававой літаратуры «Закон жизни РБ», адкрытая трыбуна «Конституция – основной закон страны»(Жодзіна).

Відэападарожжа «Сімвалы магутнасці і незалежнасці» прайшло ў Данілавіцкай СІБ Дзяржынскага раёна і было прысвечаны **Дню Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь**. Удзельнікі таксама адправіліся ў невялікае падарожжа па роднай краіне пазнаёміліся з легендай пра беларусаў, з выдатнымі мясцінамі шасці абласцей нашай краіны, удзельнічалі ў конкурсе беларускіх прыказак, стварылі слоўны партрэт Беларусі, апісваючы яе як зялёная, сінявокая, лясная.

Бібліятэкі Лагойшчыны правялі Дзень інфармацыі «Дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь». З вучнямі 10 класа СШ № 3 г. Лагойска была праведзена гутарка «Герб і сцяг нашай краіны» з дэманстрацыяй электроннай прэзентацыі. Дзеці даведаліся, якім быў шлях станаўлення, развіцця і зацвярджэння дзяржаўных сімвалаў. Таксама ўвазе школьнікаў быў прапанаваны прагляд літаратуры «Сімвалы беларускай дзяржавы», на якім экспанаваліся выданні з фонду Цэнтра

прававой інфармацыі і чытальнай залы бібліятэкі. Бібліяграфічны агляд «Нашы сімвалы» дазволіў старшакласнікам даведацца, у якіх кнігах прыводзіцца апісанне Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга нашай краіны, тлумачыцца сэнс і значэнне іх элементаў. Віктарына «Што мы ведаем аб Дзяржаўным гербе і Дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь?» дапамагла замацаваць інфармацыю, атрыманую падчас мерапрыемства.

Дзень Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь у бібліятэках Жодзін апрайшлі: інфармацыйная гадзіна»Государственный герб и Государственный флаг», Інфармміна «Дзень дзяржаўнага гімна І Сцяг Рэспублікі Беларусь», кніжны экскурс «Два символа на фоне истории», выстава-агляд «Азбука символов Республики Беларусь» .

У красавіку бібліятэкамі адзначаўся **тыдзень яднання народаў Беларусі і Расіі**. Да гэтага ладзіліся разнастайныя мерапрыемствы, тэматычныя выставы і кніжныя паліцы: «Беларусь–Расія – разам у будучыню», «Беларусь і Расія. З вякоў на вякі», «Россия и Беларусь: общая история, общая судьба», «Навстречу друг другу: диалог культур», «Палітычная палітра», слайд-падарожжа «У нас – адзіныя карані. У нас адна кроў», інфармацыйная гадзіна «Беларусь – Расія: ствараем будучыню», экспрэс-інфармацыйныя хвіліны «Дружат люди, дружат государства», гадзінаінфармацыі «Пока мы едины, мы не победимы» (Любанскі раён); інфармацыйная гадзіна «Беларусь і Расія: агульная гісторыя, агульны лёс», кніжная выстава «Беларусь – Расія: блізкія, суверэнныя, раўнапраўныя», літаратурна-гістарычны экскурс «Сугучча без меж», інфармацыйныя гадзіны «Расія і Беларусь: агульная гісторыя, агульны лёс», «Беларусь і Расія: аб'яднанне, даўжынёю ў жыццё», «Расія і Беларусь – мы разам», «Дзве сёстры - Беларусь і Расія» (Пухавіцкі раён); тэматычны вечар «Сяброўства без межаў і адлегласцяў» (Старадарожскі раён); выстава-інфармацыя «Мы едины: Беларусь и Россия», прэс-гадзіна «Во имя мира и дружбы», інформ-дасье «Россия и Беларусь: общая история, общая судьба» (Жодзіна).

## *Экалагічная асвета*

Экалагічная асвета набывае першароднае значэнне для паспяховага развіцця сучаснага грамадства. Галоўная мэта экалагічнага выхавання – фарміраванне правільнага стаўлення людзей да прыроды, навакольнага свету, да сябе і іншых людзей, як да часткі прыроды. Інфармацыйнае забеспячэнне гэтай важнай сферы жыцця з’яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці бібліятэк.

Бібліятэкі вобласці працуюць у рамках: Дзяржаўнай Праграмы па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС на 2011–2015 гады і на перыяд да 2020 года; Дзяржаўнай праграмы «Ахова навакольнага асяроддзя і ўстойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў» на 2016–2020 гады.

Бібліятэкі Вілейскага раёна працуюць у рамках праграмы «Спасём окружающую среду вместе». Уся праца бібліятэк будавалася згодна з распрацаванай праграмай мерапрыемстваў.

Сістэмны і паслядоўны характар экалагічнай адукацыі і выхавання Валожынскага раёна забяспечвае раённая мэтавая праграма «Бібліятэка і экалогія» (2017–2019 гг.). Праграма ўзгоднена з інспекцыяй прыродных рэсрсаў і аховы навакольнага асяроддзя Валожынскага райвыканкама. У рамках праграмы зроблены акцэнт на прыданне Гародзькаўскай СБ – бібліятэкі экалагічнага выхавання дзяцей і падлеткаў.

Па мэтавай экалагічнай праграме «Экалогія пачынаецца з душы» працавала Заастравецкая сельская бібліятэка Клецкага раёна, неаднаразовы ўдзельнік конкурсаў па экалагічнай адукацыі і асвеце насельніцтва. У бібліятэцы афармлены зялёныя зоны, якія вызываюць станоўчы эмацыянальны настрой, фарміруюць эстэтычны густ і ствараюць камфортныя ўмовы для чытачоў.

ДУК «Крупская цэнтральная раённая бібліятэка імя. Я. Купалы» працуе па рэалізацыі доўгатэрміновай мэтавай рэгіянальнай праграмы «Любіць і берагаць непаўторнае

хараство». Створаны мультымедыйны праект «Унікальныя насельнікі жывёльнага і раслінага свету Крупскага раёна».

Бібліятэкі ДУК «Любанскай раённай цэнтральнай бібліятэкі» сумесна з Любанскай раённай інспекцыяй прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя правялі агляд-конкурс на лепшую пастаноўку работы бібліятэк па экалагічнай асвеце і інфармаванню насельніцтва ў 2017 годзе. У выніку ў намінацыі «Лепшая бібліятэка ў экалагічным марафоне»сталі Рачэнская, Кузьміцкая і Камунараўская сельскія бібліятэкі.

Работа ў Мінскім раёне вядзецца на аснове мэтавай рэгіянальнай праграмы «Экалогія. Бібліятэка. Чалавек», якая дае магчымасць арганізаваць бесперапыннасць экалагічнай адукацыі насельніцтва.

У мэтах фарміравання ў падрастаючага пакалення экалагічнай культуры, беражлівага стаўлення да навакольнага асяроддзя бібліятэкі Мядзельскага раёна працавалі ў рамках рэалізацыі мэтавай праграмы «Наш экадом – Мядзельшчына» (2016-2020гг.). Галоўная задача праграмы – фарміраванне ў падрастаючага пакалення актыўнай гуманнай пазіцыі ў адносінах да прыроды, выхаванне чалавечнасці, дабрыні, адказнасці за лёс нашай Зямлі.

Бібліятэкі Пухавіччыны ўключыліся ў Міжнародны праект «Развіццё паслуг у сферы кіравання адходамі для сельскага насельніцтва Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці» (2016-2018), які накіраваны на развіццё паслуг ў сферы абыходжання з адходамі ў раёне і распаўсюджванне дадзенай практыкі ў іншых раёнах Беларусі.

Адкрыццё фітабара пры Лясноўскай сельскай бібліятэцы Капыльскага раёна стала прыемным сюрпрызам для чытачоў гэтай бібліятэкі. Бібліятэкарам была падрыхтавана інфармацыя пра гісторыю выкарыстання лекавых уласцівасцяў раслін, аб правілах іх збора.

Ва ўсіх бібліятэках прайшлі мерапрыемствы, якія садзейнічаюць папулярызацыі экалагічных ведаў сярод чытачоў. Сярод найбольш карысных і запатрабаваных карыстальнікамі:

відэаэкалагічны ўрок «SOS, ці Ратуйце навакольнае асяродзе», экалагічная аперацыя «Кармушка для птушкі» (Пухавіцкій раён); кніжныя адценні «GREENBELARUS», экавернісаж «О тех, кто в перышки одет», гадзіна кветкатэрапіі «Взгляни на цветок и он согреет твоё сердце» (Слуцкі раён); інфармацыйная гадзіна «Блакітнае ўпрыгожванне зямлі», гадзіны цікавых паведамленняў «Хто вакол жыве, хто вакол расце?», гадзіна экалогіі «Мы з прыродаю сябруем, птушак і звяроў шануем» (Смалявіцкі раён); акцыі «Домік для пярнатых» , «Лічы, эканом, беражы» з відэаролікам экалагічнага зместу «Вода – это чудо. Вода – это жизнь» (Стаўбцоўскі раён); віртуальны вечар-вандроўка «Ты раскрой мне природа объятья, чтоб я слился с красою твоей», віртуальнае падарожжа «У гасцях у зялёнага волата», медыяпрэзентацыя «За чистоту земли и рек в ответе каждый», экалагічны бумеранг «Лес – наше богатство», завочнае падарожжа «Беларускі водны шлях», гульня-трэнінг «Займальны свет прыроды» (Старадарожскі раён).

Ёсць даты, якія не святкуюць, але аб іх трэба памятаць заўсёды. Такой датай з’яўляецца 26 красавіка 1986 года – **дзень Чарнобыльскай трагедыі.**

У рамках праграмы «Спасём окружающую среду вместе» ў бібліятэках Вілейскага раёна праведзены: экагадзіна «Чарнобыля злавесны лёс»(ЦБ, літаратурна-экалагічная праграма «Чарнобыля вечнае рэха» (Нарачанская СБ), гадзіна смутку «Бядой запаленае слова» (ГФ №4, Куранецкая СБ) і інш.

Бібліятэкі Крупскага раёна арганізавалі і правялі шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Гэта і круглы стол «Балючы успамін» (Бобрская ГпБ); і гадзіна памяці «Чарнобыль-наш боль» (Ухвальская СБ) і інш.

Да дня аварыі на ЧАЭС Сейлавіцкай інтэграванай сельскай бібліятэкай Нясвіжскага раёна быў праведзены вечар – успамін «Чернобыль в памяти и книгах». Мэта мерапрыемства: сфарміраваць у чытачоў экалагічную культуру і актыўную жыццёвую пазіцыю паадносінах да глабальных праблем, якія стаяць перад чалавецтвам, а таксама прыцягнуць увагу да Дня

памяці загінуўшых і жывых удзельнікаў ліквідацыі аварыі на Чарнобыльскай АЭС 26 красавіка 1986 года, ўдовам і маці.

У Смалявіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя М. Багдановіча прайшла гадзіна-рэквіем «Чарнобыль звоніць у званы». Вядучыя мерапрыемства расказалі рабятам аб тым, што адбылося 26 красавіка 1986 года. На фоне музыкі Моцарта «Рэквіем» быў зачытаны ўрывак з кнігі С. Алексіевіч «Чарнобыльская малітва». У гэты ж дзень у бібліятэцы быў арганізаваны агляд літаратуры «Чарнобыль звоніць у званы», а таксама падрыхтавана кніжная выстава «Боль матулі – зямлі».

Мерапрыемствы Уздзенскага раёна: актуальная размова «Экалогія – зона трывогі» (Цепленская СБ); час памяці «Вечнае рэха Чарнобыля» па кнізе С. Алексіевіч «Чарнобыльская малітва» (Ліцвянская СБ); урок памяці «Бядой апаленае сэрца» (Лашанская СБ); літаратурна-экалагічная гадзіна «Чарнобылем не зарасцеш…» (Сямёнавіцкая СБ).

У мэтах экалагічнага выхавання ў бібліятэках Мінскай вобласці ствараюцца клубы па інтарэсах, так на тэрыторыі вобласці дзейнічаюць 10 клубаў у якія лічацца 124 чалавек. Акрамя экалагічных клубаў, таксама дзейнічаюсць літаратурна-экалагічный і эколага-краязнаўчыя.

Працягвалі сваю творчую дзейнасць аматарскія аб’яднанні экалагічнай тэматыкі Клецкага раёна: літаратурна-экалагічны клуб – «Фларыда» (Заастравецкая СБ) і гурток «Лесавічок» (Сякерыцкая СБ).

Працягваў сваю дзейнасць літаратурна-экалагічны клуб «Жаўраначак» пры Гасцілавіцкай СБ Лагойскага раёна.

Сёння ў Мінсім раёне працуюць клубы аматараў прыроды, сярод іх: «Крынічка» (ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка»), «Аука» (СБ агр.Лясны), «Расінка» (Ратамская СБ) і інш.

У ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка» актыўна працягваў працаваць клуб кветкаводаў «Флора». У справаздачным годзе клюб адзначыў свой 10-гадовы юбілей. Гэтай падзеі было прысвечана ўрачыстае адкрыццё выставы

«Алфавит клуба «Флора», или Выставка необычной ботанической иллюстрации».

Пры бібліятэках Узденскага раёна дзейнічаюць: экалагічны клуб «Родничок» (Ліцвянская СБ); экалагічны клуб «Буслянятка» (Зенькавіцкая СБ); экалагічны клуб «Мурашык» (Хатлянская СБ); экалагічны клуб «Каласавічок» (Дзешчанская СБ); экалагічны клуб «Экоша» (Камянкоўская СБ).

### *Здаровы лад жыцця*

Здароўе – адна з каштоўнасцей чалавечага жыцця. Галоўнае значэнне ў пытанні яго падтрымання мае лад жыцця чалавека і, цесна з гэтым звязанае, яго стаўленне да ўласнага здароўя.

Бібліятэкі працягвалі дзейнасць **па прапагандзе здаровага ладу жыцця** ў рамках рэалізацыі: Дзяржаўнай праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь» на 2016-2020 гг; Дзяржаўнай праграмы развіцця фізічнай культуры і спорту ў Рэспубліцы Беларусь на 2016-2020 гг.

Бібліятэкі Бярэзінскага раёна працавалі у рамках доўгатэрміновага праекта «Усёй грамадой – супраць п’янства» ахопілі вядучыя працоўныя калектывы горада агіт-кампаніяй «П’янства: пад прыцэлам мужчыны» з цыклам акцый для мужчын «Цвярозыя кіламетры на вадзіцельскім спідометры». Моладзі і падлеткам адрасаваны 4 доўгатэрміновыя бібліятэчныя праекты ДУК «Бярэзінскай цэнтральнай раённай бібліятэкі»: літаратурна-мастацкі праект «Жывая кніга», маральна-этычны праект «Дзяўчыне ў эпоху рызыкі», выхаваўча-асветніцкія праекты «Быць падлеткам – няпроста», «Дыскатэка – тэрыторыя агітацыі і выхавання». Да 30-годдзя тэрапеўтычнага корпуса Бярэзінскай раённай бальніцы была прымеркавана акцыя ў рамках праекта ЦБ «Жывая кніга» – «Літаратура як мікстура», экспрэс-акцыя «Наталі смагу чытання: прачытай залпам!».

У мэтах прафілактыкі захворванняў, звязаных з табакакурэннем, прапагандай здаровага ладу жыцця Клецкая і Вілейская ЦБС прынялі ўдзел у рэспубліканскай антытабачнай акцыі «Беларусь супраць табака».

Публічныя бібліятэкі Любанскага раёна працавалі ў рамках комплекснай бібліятэчнай праграмы «З кнігай і здароўем па жыцці».

Для папулярызацыі здаровага ладу жыцця ДУК «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя. М.Багдановіча» сумесна з сябрамі БРСМ правяла інфармацыйна-пазнавальную праграму «Круг шкодных звычак», на якую былі запрошаны вучні старэйшых класаў і навучэнцы каледжаў.

ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка» рэалізоўвала комплексны план мерапрыемстваў па прафілактыцы безнагляднасці, злачынстваў, парушэнняў права, п'янства, наркаманіі, таксікаманіі непаўналетніх і забеспячэнні іх бяспекі на 2015-2018 гады на тэрыторыі Мінскага раёна.

Бібліятэкі Салігорскага раёна працягвала рэалізацыю праекта «Стиль жизни – здоровье», праводзілася своечасовае і даступнае інфармаванне карыстальнікаў па розных аспектах праблем наркаманіі, алкагалізму, тытунекурэння, ВІЧ/СНІД.

Бібліятэкі Слуцкага раёна прадоўжылі актыўна працаваць у рамках інфармацыйна-асветніцкай праграмы «За здаровы лад жыцця».

У 2017 годзе наладжана цеснае супрацоўніцтва ДУ «Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі» і ўстановы «Лячэбна-працоўны прафілакторый №3», дзе знаходяцца грамадзяне, хворыя на хранічны алкагалізм, наркаманію або таксікаманію з мэтай прымусовай ізаляцыі і медыка-сацыяльнай рэабілітацыі з абавязковым прыцягненнем да працы.

Бібліятэкі Чэрвеньскага раёна актыўна працавалі над стварэннем і рэалізацыяй мэтавых комплексных праграм па вядучых напрамках дзейнасці: –»Усміхніся жыццю, ты яму падабаешся»– па прафілактыцы суіцыдаў; «Курить бросим – яд в папиросе».

У ДУК «Цэнтральнай гарадской бібліятэкі г.Жодзіна» арганізавана работа над бібліятэчным праектам: моладзевы культурна-адукацыйны праект «Здорово вместе» на 2016-2018 г. Мэтай праекта з'яўляецца папулярызацыя здаровага ладу жыцця сярод дзяцей і моладзі з дапамогай давання інфармацыі і правядзення розных мерапрыемстваў аб шкодных звычках, спорце, актыўным вобразе жыцця.

Прайшлі пазнавальна і мерапрыемствы, прымеркаваныя да **Сусветнага дня барацьбы з наркаманіяй**: дзень даверу «Наркаманія вачамі моладзі», відэалекцыя «Наркотики или жизнь – выбор за тобой» (Дзяржынскі раён); гадзіны здароўя «Спорт супраць наркотыкаў» і «Наркотики – страданье и беда, давайте скажем жизни «Да», гадзіна-перасцярога «Лёгкіх наркотыкаў не бывае», гутарка-папярэджванне «Наркотыкі – крыніца бед» (Лагойскі раён); гадзіна карыснай інфармацыі «Наркаманія: падман душы, падман надзей», гадзіна разважанняў «Наркотыкі або жыццё – выбар за табой» (Мядзельскі раён); прагляд і абмеркаванне відэафільма «Правда о марихуане», інфармкур’ер «Будучыня без наркотыкаў», відэалекторый «Спешите спасти свою жизнь», урок-засцярога «Смерть на конце иглы» (Узденскі раён).

**Да Сусветнага дня прафілактыкі СНІДу** у ДУК «Бярэзінскай цэнтральнай раённай бібліятэкі» быў праведзены круглы стол «Зрабі выбар на карысць здароўя»; Любушанскай СБ наладзіла для вучняў мясцовай школы інфармацыйную гадзіну «Знак трагедыі – СНІД».

Гадзіна праблемнай размовы «Ведаць, каб зберагчы сябе». Бібліятэкары наведалі Валожынскі СГПЛ і пазнаёмілі ліцэістаў з гісторыяй узнікнення і этапамі развіцця СНІДу, з эпідэмсітуацыяй па ВІЧ-інфекцыі ў Рэспубліцы Беларусь. Быў паказаны відэаролік «Што такое ВІЧ. Што такое СНІД». Атрыманыя веды былі замацаваны пры дапамозе віктарыны пад назвай «Так ці не?».

Бібліятэкі Дзярыжынскага раёна праводзілі наступныя мерапрыествы: грамадзянскі форум «СПИД не выбирает, выбираете вы» (Негарэльская СБ), аукцыён ведаў «Скажы

жыццю «Так» (Скірмантаўская СБ) відэалекцыі «СПИД: знать, чтобы жить» (Фаніпальская ГБ).

Бібліятэкі Мінскага раёна правялі: выстава-перасцярога «СНІД – ведаць і змагацца» (ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка»); чытацкая кансультацыя «Ёсць толькі імгненне» (Гатаўская СБК); выстава-агляд «Трывога дня – СНІД» (Бібліятэка а/г Бальшавік).

Пазнавальная гадзіна «СНІД: што трэба ведаць, каб заставацца здаровым» адбылася ў Мядзельскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя М. Танка. Увазе школьнікаў быў прапанаваны кароткаметражны відэафільм «ВІЧ/СНІД», які закрануў асноўныя сацыяльныя праблемы, звязаныя з захворваннем ВІЧ/СНІД.

**Да Сусветнага дня адмовы ад курэння** стала традыцыяй у ДУК «Бярэзінскай цэнтральнай раённай бібліятэке» праводзіць акцыю «Абмяняй цыгарэту на цукерку». Для школьнікаў праведзены ўрок здароўя «Скажам цыгарэце – не!», на якім асвятляліся плюсы і мінусы курэння, была праведзена віктарына «У абдымках тытунёвага дыму» і разгадванне крыжаванкі «У дыме цыгарэты», бліц – віктарына «Пытанне – адказ».

У ДУ «Дзяржынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэме» прайшла акцыя «Голосуй конфетой против сигареты». Увазе чытачоў быў прапанаваны вялікі выбар інфармацыйных матэрыялаў аб шкодзе курэння, у тым ліку інфармацыйны буклет «Курение убивает».

У бібліятэках і бібліятэках-клубах Клецкага раёна была размешчана інфармацыя аб забароне курэння ў памяшканнях установ. Былі праведзены мерапрыемствы: акцыя «Кніга і газета замест цыгарэты» (Тучанская СБ), гутарка-дыялог «Курэнне – свавольства? Мода? Хвароба?» (Галавацкая СБ), інтэрактыўная гульня «В плену табачного дыма» (Сякерыцкая СБ).

У бібліятэках Лагойскага раёна былі праведзены шэраг інфармацыйных гадзін, прафілактычных гутарак, актуальных дыялогаў. Сярод іх: інфармацыйныя гадзіны «Табак – первое звено в опасной цепи» (Засоўеўская СБК), «Самы звыклы яд –

нікацін» (Сямкоўская СБ); гадзіна здароўя «Книга и газета вместо сигареты» (Задор'еўская СБ); пазнавальная гадзіна «Быць незалежным ад цыгарэты» (Коранская СБ); прафілактычныя гутаркі «Курэнне – небяспечнае захапленне» (Задор'еўская СБ), «Дым, уносящий здоровье» (Гасцілавіцкая СБ) і інш.

У мэтах прапаганды здаровага ладу жыцця ў бібліятэках Мінскай вобласці ствараюцца клубы па інтарэсах, так на тэрыторыі вобласці дзейнічаюць 15 клубаў у якіх лічацца 288 чалавек.

Пры ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя. І.Х.Каладзеева» існуе праваслаўны міні-футбольны клуб «Горизонт». Мэта стварэння клуба – садзейнічанне арганізацыі вольнага часу дзяцей і моладзі, папулярызацыя здаровага ладу жыцця дзяцей і моладзі. Галоўнымі задачамі з'яўляюцца далучэнне падрастаючага пакалення да айчынных культурна-гістарычных і духоўна-маральным традыцыям, далучэнне дзяцей малодшага школьнага ўзросту і падлеткаў да чытання духоўнай літаратуры.

Прыхільнікаў здаровага ладу жыцця збірае на свае пасяджэнні культурна-аздараўленчы клуб «Аір» пры ДУ «Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка». Клуб ставіць сваёй мэтаю выхаванне патрэбнасці чалавека ў здаровым ладзе жыцця, як спосабе дасягнення гармоніі з навакольным асяроддзем.

Клуб здароўя «Бирюза», дзейнічае ў ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка». У рамках клуба прайшла сустрэча з фельдшарам Міханавіцкай амбулаторыі, якая падгатавала матэрыял на тэму «Скажи простуде – нет». Зносіны з медыкам узбагацілі ўдельнікаў клуба ведамі аб сваім стане здароўя, як абараніць сябе ад непатрэбных наступстваў, кожны атрымаў адказ на ўсе турбуючыя іх пытанні.

Пры ДУК «Цэнтральнай гарадской бібліятэкі г. Жодзіна» дзейнічае клуб «Ключ к здоровью», у рамках клубы, былі праведзены наступныя мерапрыемствы: круглы стол з урачом-гігіеністам ДУ «Жодинской ГЦГЭ» М.А. Ковальчук «Чистый город. Санитарная эпидемиологическая служба г. Жодино»;

жывая гутарка з аматарам здаровага ладу жыцця А.А. Шевардзінай «Бодискульпт – правильный фитнес»; сустрэча-кансультацыя з супрацоўнікам «Зелёной аптеки» Н.В. Довголёнок «Витрина зелёной аптеки» і інш.

### *Работа з сацыяльна неабароненымі катэгорыямі насельніцтва*

Бібліятэкі актыўна працуюць над пашырэннем сваіх сацыяльных функцый. Адным з праяўленняў гэтага з’яўляецца **работа з сацыяльна-неабароненымі групамі насельніцтва**. Ва ўсіх бібліятэках праводзяцца дні міласэрнасці, арганізоўваюцца вечарыны, пасядзелкі, праходзяць урокі дабрыні, міласэрнасці і духоўнасці.

Менавіта бібліятэка, як інфармацыйны цэнтр, закліканая папоўніць існуючы інфармацыйны дэфіцыт, які ўзнікае ў чалавека, у якога звужаны дыяпазон магчымасцяў зносін з светам.

У справаздачным годзе бібліятэкамі Мінскай вобласці было абслужана 9345 чалавек на даму, было выканана 43 322 наведванняў і 152 218 кнігавыдач.

Бібліятэкі Мінскай вобласці абслугоўваюць 643 тыс. сляпых і людзей са слабым зрокам. Бібліятэкі маюць 342 тыс.экземпляраў кніг выдадзеных шрыфтам Брайля. У справаздачным годзе паступіла 32 тыс. кніг. На працягу года дадзеныя кнігі выдаваліся 592 тыс. разоў. Людзі з праблемамі зроку наведвалі бібліятэкі 5587 раз за 2017 год.

Работа з сацыяльна-неабароненай катэгорыяй насельніцтва, развіццё новых накірункаў і форм работы вядзецца ў межах праграмы «Міласэрнасць». Мэта праграмы – садзейнічанне адаптацыі ў грамадстве, сацыякультурнай рэабілітацыі, развіццю творчых магчымасцей і самасцвярджэнню людзей з абмежаванымі магчымасцямі шляхам далучэння да кнігі і чытання, якая прадугледжвае комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на прыцягненне ўвагі

грамадскасці да інвалідаў і сацыяльна неабароненых груп насельніцтва

ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя. І.Х. Каладзеева» працуе па сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі людзей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя вядзе паэтапна з 2011 года. З 2011 па 2017 гады ў установе працавалі наступныя праекты: «Библиотека без границ» (2011-2015 гг.) (Духоўна-асветніцкі цэнтр цэнтральнай бібліятэкі); «Мне через сердце виден мир» (2011-2015 гг.) (Гарадская спецыялізаваная бібліятэка №5 для інвалідаў па зроку); «Сопричастность» (2016-2018 гг.) (Духоўна-асветніцкі цэнтр, аддзел галерэйна-выставачнай дзейнасці, дзіцячы аддзел, зала мастацтваў, зала літаратуры на замежных мовах цэнтральнай бібліятэкі); «Библиотека равных возможностей» (2016-2018 гг.) (Гарадская спецыялізаваная бібліятэка № 5 для інвалідаў па зроку). У 2017 годзе аддзел бібліятэчнага маркетынгу стаў ініцыятарам стварэння рэгіянальнага сацыяльнага праекта «Преодоление», які накіраваны на далучэнне да культурнага і грамадскага жыцця грамадзян з абмежаванымі магчымасцямі здароўя, якія пражываюць у сельскай мясцовасці.

«Библиотека без границ» гэта праект ДУК «Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Новік» па рабоце з ветэранамі, людзьмі сталага ўзросту, па рабоце з чытачамі з абмежаванымі магчымасцямі ў цесным супрацоўніцтве з аддзяленнем дзённага знаходжання для дзяцей-інвалідаў «Ластаўка» ДУ «Вілейскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва».

Бібліятэкі Дзяржынскага раёна сумесна з ДУ «Дзяржынскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва» паспяхова рэалізаваў інавацыйны праект для пажылых людзей «Школа безопасности», які стартаваў у красавіку. Галоўная мэта праекта – паляпшэнне умоў жыцця і фарміраванне бяспечнага асяроддзя для пажылых людзей. У яго рамках праходзілі заняткі па бяспечнаму карыстанню газавым абсталяваннем у быту, па электрабяспецы.

«Хай кніга падтрымае вас» – сумесная праца ДУК «Капыльскай раённай цэнтральнай бібліятэкі імя А.Астрэйкі», Грозаўскай сельскай бібліятэкі і Капыльскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання ў рамках мэтавай праграмы бібліятэчнага абслугоўвання «Вы не адны, пакуль мы з вамі» з катэгорыяй пажылых людей «Старонкі жыцця», з інвалідамі «Кніжны мір».

«Жыццё патрабуе міласэрнасці» - сумесны праект бібліятэкі сямейнага чытання «Верасок» Маладзечанскага раёна з аддзяленнем дзённага знаходжання маладых інвалідаў і ЦКРНіР, накіраваны на адаптацыю ў грамадстве людзей з абмежаванымі магчымасцямі. У бягучым годзе ў гарадской спецыялізаванай бібліятэцы № 18 Маладзечанскага раёна працягваўся праект пад назвай «Сустрэчы ля самавара». Для карыстальнікаў са слабым зрокам арганізуецца паказ кінакарцін з аўдыёдэскрыпцыяй, знятых па літаратурных творах, затым за кубкам гарбаты праходзіць абмеркаванне прагледжаных фільмаў.

Бібліятэкі Салігорскага раёна працуюць у рамках праектаў: «Согреть своей заботой»– забеспячэнне адкрытага доступу да інфармацыі для людзей сталага ўзросту і людзей з абмежаваннямі ў жыццядзейнасці праз інфармацыйна-бібліятэчнае абслугоўванне і забаўляльную дзейнасць; «Мудрость и молодость души» к дню пажлога чалавека; «С книгой радость входит в дом» к дню інваліда.

Чэрвеньскім цэнтральная раённая бібліятэкаразам з бібліятэкіамі раёна ўдзельнічалі ў акцыі «Крок насустрач».

Праект «Мобильная библиотека» распрацаваны сумесна з Тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва г. Жодзіна і бібліятэкамі горада. Мэтай праекта – зрабіць бібліятэку бліжэй для сацыяльна-неабароненых слаёў насельніцтва.

Ва ўсіх бібліятэках створаны базы данных, пражываючых у зоне абслугоўвання сацыяльна неабароненых груп насельніцтва. Для асоб, якія па стану здароўя не могуць

карыстацца стацыянарнай бібліятэкай, арганізаваны прыём заказаў па тэлефоне і дастаўка літаратуры на дом

Традыцыйна ў бібліятэках Мінскай вобласці адзначаецца **Міжнародны дзень сталага чалавека,** праводзіліся: віншавальная паштоўка «Цяпло нашых сэрцаў – вашым пражытым гадам», інфармацыйнае рэвю «Па старонках часопіса «Народны доктар», круглы стол «Восень жыцця – квецень мудрасці», круглы стол «Мудрай старасці паклон», віншавальная праграма «Мае гады – маё багацце», сустрэча пажылых людзей з сацыяльным работнікам «Чым старасць забяспечыць?» (Валожынскі раён); акцыя-віншаванне «От всей души», дабрачынная акцыя «Перед старасцю схілім галовы», рэтра-вячоркі «Возраст – жизни не помеха»,рэтра-вечар «Пусть осень жизни будет золотой», акцыя міласэрнасці «Душу лечыць дабрыня», святочны вечар адпачынку «Возраст осени прекрасный» (Дзяржынскі раён); акцыя «Тепло всем людям подарить», акцыя «Срэбны звон гадоў маіх», святочная праграма «Серебро волос и золото сердца», вечар-сустрэча «Диалог старшего поколения» (Клецкі раён);свята мудрасці і духоўнай маладосці «Цяпло нашых сэрцаў – вашым пражытым гадам», вечар успамінаў «Пасядзім гуртком, пагаворым ладком», літаратурна-музычнае віншаванне «Хвала и честь за прожитые годы» (Лагойскі раён); паэтычная імпрэза «Нашы бабулі і дзядулі», гадзіна ўспамінаў «Старасць не радасць, маладосць не на век», сустрэча-дыялог «Цудоўны шлях гадоў пражытых!, бібліятэчныя пасядзелкі «Для тых, хто не лічыць годы», урок дабраты «Пожилым — забота и внимание», святочная праграма «Назад – у СССР» (Любанскі раён); вечар «Возьмемся за руки друзья, чтоб не пропасть по одиночке», вячоркі «Про бабушек и дедушек», восеньская сустрэча «Свята залатой восені», гадзіна ўспамінаў «Седина не признак увяданья» (Мінскі раён);святочная акцыя «Вы не адны, пакуль мы з вамі»,акцыя «С книгой станет свет добрей», віншавальная паштоўка «Возраст осени прекрасной», «Солнце общей доброты» (Уздзенскі раён).

Да **Дня інвалідаў** у бібліятэках прайшлі: літаратурна-гульнёвы час «Вместе весело шагать», размова «Святая наука – расслышать друг друга», фотапрэзентацыя «Это место называется Земля…», гадзіна інфармацыі «Наша пресса на все интересы», акцыя «Души золотые запасы» (Вілейскі раён); акцыі міласэрнасці «Я сярод людзей, людзі вакол мяне», «Спяшайцеся рабіць дабро», візіты дабрыні «Дабро без межаў», «Сагрэйце іх сэрцы» (Лагойскі раён); экскурсія па бібліятэцы людзей з абмежаванымі фізічнымі здольнасцямі «Возвысим душу до добра», выстава-экспазіцыя «Сильные духом», выстава - прагляд «Каб не застацца ў адзіноце», акцыя «З добрай кнігай к добрым людзям», рэйд міласэрнасці «З адкрытым сэрцам, з добрым словам», шчырая размова «Асаблівыя людзі-хто яны?» (Мінскі раён); дабрачынная акцыя «Мы рядом с вами», акцыя міласэрнасці «Я вам дарю тепло своей души» (Нясвіжскі раён); гадзіна бібліятэрапіі «З цеплынёй і дабрынёй – у кожны дом», гадзіна міласэрнасці «Агарнуць цяплом і павагай» (Пухавіцкі раён); гадзіна дабразычлівасці «Міласэрнасць – катэгорыя вечная», цыкл аглядаў па радыёвузлу «Зимний сезон без лекарств, «Труд украшает человека», «Худеем к лету», «Поклонимся великим тем годам» , «Домашние питомцы: за и против», «Движение – это жизнь», «Иди всегда дорогою добра» (Чэрвенькі раён).

У снежні 2017 года працавала міжведамасная камісія па праблемах сталых людзей, **ветэранаў** і асоб, пацярпеўшых ад наступстваў войн. Супрацоўнікі бібліятэк Вілейскага раёна азнаёмілі членаў камісіі з выставай «Вілейскі край – для талентаў рай» і з матэрыяламі праекта «Чытаем кнігі мясцовых аўтараў».

Стала добрай традыцыяй сумесная работа ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйка» і раённай ветэранскай арганізацыі. У 2017 годзе ў гонар 30-годдзя з дня заснавання раённай ветэранскай арганізацыі ў чытальнай зале раённай бібліятэкі была арганізавана выстава-хобі «На струнах душы», якая прыцягвала

ўвагу чытачоў і садзейнічала росту карыстальнікаў чытальнай залы.

Талькоўская сельская бібліятэка-клуб Пухавіцкага раёна арганізавала акцыю-віншаванне ветэранаў «Мы памятаем подзвіг ваш». С.М. Радюк і студэнт Мар'інагорскага аграрна-тэхнічнага каледжа А. Радюк наведалі ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і інваліда дзяцінства. Ім былі падораны харчовыя наборы, набытыя дзякуючы матэрыяльнай падтрымцы індывідуальных прадпрымальнікаў Л.А. Юрчык, Л.М.Яцэвіч і Г.І.Бароўскі.

У ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка» адбыўся круглы стол «Мудрость поколений – основа будущего: мы вместе», прысвечаны 30-годдзю ветэранскага руху ў Беларусі. Размова ішла аб значнасці ветэранскай арганізацыі, аб вопыце робаты бібліятэк па сацыяльнай і інфармацыйнай падтрымцы людзей сталага ўзросту.

Пры бібліятэках працуюць **клубы і аматарскія аб'яднанні для сталых людзей і інвалідаў**, для якіх бібліятэка стала цэнтрам духоўных зносін. На тэрыторыі вобласці дзейнічаюць 51 клуб у якія лічацца 739 чалавек.

Клуб «Парус» ДУК «Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя. І. Х. Каладзеева» створаны для маладых людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Мэта клуба: арганізацыя вольнага часу людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі; духоўная і маральная падтрымка; дапамогу ў раскрыцці патэнцыялу асобы.

Пры бібліятэках Крупскага раёна працуюць клубы па інтарэсах: «Крынічка» (Коласаўская СБ); «Хрызантэма» (Ухвальская СБ); «Были-небылицы» (Абчугская СБ-К.).

У ДУ «Мінскай раённай цэнтральнай бібліятэке» дзейнічае клуб «Дабрадзея», дзе можна адзначыць святы народнага каляндара, паўдзельнічаць у конкурсах. Пры Ждановіцкай сельскай бібліятэцы працуе клуб «Русь». Удзельнікі клуба – людзі рознага ўзросту. Асноўнай мэтай і задачай клуба з'яўляецца вывучэнне і прапаганда рускай і беларускай культуры і мовы, вывучэнне гісторыі рускага

і беларускага народа. У Старынскай сельскай бібліятэцы-клубе працягвалася работа з жаночым клубам «Гаспадынька», створаным з мэтай аб'яднання актыўных людзей пенсіённага ўзросу і арганізацыі іх вольнага часу. Сустрэчы членаў клуба нязменна прыносяць станоўчыя эмоцыі ўдзельнікам. Для людзей пажылога ўзросту пры бібліятэцы аграгарадка Лясны працуе клуб «Залаты ўзрост».Тут удзельнікі не толькі атрымліваюць інфармацыю пра новыя кнігі, але і абменьваюцца вопытам, дапамагаюць адзін аднаму добрым словам, знаходзяць аднадумцаў і з задавальненнем прымаюць удзел у розных мерапрыемствах.

Зладжана і плённа працуе «Школа міласэрнасці», створаная пры Выгалавіцкай сельскай бібліятэцы-клубе Мядзельскага раёна. Бібліятэкар разам са сваімі юнымі выхаванцамі 2 разы ў месяц дапамагаюць адзінокім і пажылым, уносяць у іх дамы душэўнае цяпло, спачуванне і падтрымку. У 2017 годзе споўніцца сямнаццаць гадоў, як пры Мядзельскай раённай бібліятэкі імя. М. Танка працуе клуб «Задушэўная размова» для тых, каму за 50. Аб'ядналіся ў яго жанчыны, якія знаходзяцца на заслужаным адпачынку, каб разам цікава і змястоўна бавіць вольны час, каб не адчуваць сябе забытымі і пакінутымі.

Вось ужо 13-ты год клуб «Отрада», які дзейнічае пры Сноўскай сельскай бібліятэцы Несвіжскага раёна, дорыць яго членам вялікую раскошу – радасць чалавечых зносін. Тэмы пасяджэнняў падказвае жыццё. Трэба адзначыць, што сярод удзельнікаў клуба асабліва станаўленне да паэзіі і музыкі.

Пры бібліятэках Пухавіцкага раёна актыўна працавалі клубныя аб'яднанні – «Чысты чацвер», (ЦРБ), «Клуб цікавых сустрэч» (Мар'інагорская ГБ). Цеснае супрацоўніцтва наладжана паміж гарадской бібліятэкай і цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, на базе якога працуе аддзяленне дзённага знаходжання грамадзян сталага ўзросту, а таксама з раённай арганізацыяй Чырвонага Крыжа, Саветам ветэранаў.

Клуб «Пасядзелкі», арганізаваны пры Старадарожскай цэнтральнай бібліятэцы для чытачоў-жанчын сталага ўзросту,

існуе даўно. Кожная сустрэча, якая адбываецца ў клубе дае новыя, цікавыя звесткі, удзельніцы клуба атрымліваюць адказы на самыя розныя пытанні. У працэсе абмена інфармацыяй яны чэрпаюць для сябе шмат новага ў вядзенні хатняй гаспадаркі, даведваюцца аб сучасным стане эканомікі і культуры, аб гісторыі свайго народа, яго традыцыях.

### *Краязнаўчая дзейнасць*

У справаздачным годзе краязнаўства заставалася адным з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці бібліятэк Мінскай вобласці з мэтай захавання гістарычнай і культурнай спадчыны краю. Інфармацыйныя рэсурсы краязнаўчага характару ў бібліятэках накіраваны на папулярызацыю краязнаўчых ведаў сярод карыстальнікаў, а кампетэнтнасць і прафесіяналізм супрацоўнікаў забяспечваюць здзяйсненне самых розных праектаў і праграм.

Краязнаўчая дзейнасць вялася бібліятэкамі вобласці ў адпаведнасці з рэгіянальнымі і мясцовымі праграмамі: «Памяць Міншчыны» **(ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка»)**; «1812 год: Борисов, Березина, Память…», «Исторические маршруты Борисовщины», «Легенды Борисовщины: мифы и реальность» **(ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева»)**; «Вяртанне да вытокаў» **(ДУ «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка»)**; «Мая зямля, мае землякі», «На літаратурным небасхіле Дзяржыншчыны», «Гісторыя Дзяржыншчыны ў асобах» **(ДУ «Дзяржынская раённая цэнтралізаваная сетка бібліятэк»)**; «Зямля бацькоў – майго жыцця крыніца» **(ДУ «Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка»)**; «Я раскажу табе пра дзіўны край, што мне свяцей усіх святынь у сэрцы» **(ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А.Астрэйкі»)**; «Ён Радзімаю завецца – непаўторны мілы край» **(ДУК «Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка»)**; «Жыву і дыхаю, мой Крупскі край, табой» **(ДУК «Крупская цэнтральная раённая**

**бібліятэка імя Я. Купалы»);** «Бібліятэка – інфармацыйна-краязнаўчы цэнтр» **(ДУК «Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г.Новік»)**; «На гэтай зямлі нашы продкі жылі» **(Мядзельская раённая бібліятэка імя М.Танка)**; «Ведаць і любіць свой край» **(Чэвеньская цэнтральная раённая бібліятэка)**. **ДУ «Смалявіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя М.Багдановіча»** працавала над рэалізацыяй раённага бібліятэчнага праекта «Край мой – гонар мой».

У мэтах павышэння статусу вучонага і ролі навукі ў выкананні задач сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, стварэння спрыяльных умоў для захавання навуковага патэнцыялу Рэспублікі Беларусь 2017 год быў аб'яўлены **Годам навукі**. З гэтай нагоды ў бібліятэках адбыліся розныя мерапрыемствы. **Пухавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкай** быў выдадзены краязнаўча-біяграфічны нарыс «Знакамітыя навукоўцы Пухавіцкага раёна і іх дасягненні», прысвечаны юбілярам года. Падрыхтавана інфармацыйная гадзіна «Навука ў прафесіі нашых землякоў» (пра навукоўцаў-землякоў) і дзень вучонасці «Людзі, якія прысвяцілі сябе навуцы». Бібліятэкарамі **ДУ «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка»** быў распрацаваны цыкл радыёгутарак, прысвечаных навукоўцам, якія нарадзіліся на Случчыне: «Заўсёды ў пошуку» (да 100-годдзя з дня нараджэння педагога Ф. Р. Кітуновіча, прафесара, заслужанага настаўніка Беларусі), «Захопленая фальклорам» (да 85-годдзя з дня нараджэння фалькларысткі, доктара філалагічных навук Г. А. Барташэвіч) і інш. Кожная бібліятэка **ДУК «Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П.Труса»** атрымала ў рамках раённай мэтавай праграмы «Краязнаўчая прастора: імёны і час» заданне знайсці звесткі пра землякоў, якія вызначыліся ў розных галінах навукі, тэхнікі, культуры. На працягу года быў праведзены цыкл краязнаўчых мерапрыемстваў «Ад родных вытокаў – да сусветнай навукі»: вусны часопіс да 170-годдзя Я. Наркевіча-Ёдкі «Прафесар электраграфіі і магнетызму»; вечар-партрэт да 160-годдзя вучонага-садавода В. Пашкевіча «Ён краіну рабіў садам»; завочнае знаёмства «Вучоныя з наднёманскага краю»;

краязнаўчая гадзіна да 70-годдзя вучонага-матэматыка В. Берніка «Маг лікаў» і інш. У лістападзе на раённым краязнаўчым свяце «Жывуць у памяці Імёны» былі падведзены вынікі краязнаўчай працы за год. У **Языльскай сельскай біліятэцы Старадарожскага раёна** была арганізавана інфармацыйна-пазнавальная гадзіна «Вучоныя Міншчыны». У **сельскай бібліятэцы аграгарадка Лебедзева Маладзечанскага раёна** прайшла вечарына, прысвечаная прафесару, акадэміку Міжнароднай Акадэміі Астранаўтыкі, доктару філасофіі, лёс якога звязаны з вёскай Лебедзева, – Барысу Кіту пад назвай «Тры жыцці Барыса Кіта». **Бібліятэкамі Мінскага раёна** праведзены наступныя мерапрыемствы: інфарміна «Нашы землякі-навукоўцы», гутарка-разважанне «Знакамітыя людзі пасёлка – хто яны». У **Івянецкай гарпасялковай бібліятэцы Валожынскага раёна** праведзена інфармацыйная гутарка «Лекар зямлі – Іван Іванавіч Ліштван», якая пазнаёміла прысутных са слынным ураджэнцам Валожыншчыны – беларускім вучоным у галіне фізіка-хіміі торфу і калоіднай хіміі, акадэмікам НАН Беларусі, доктарам тэхнічных навук, прафесарам. Ва ўсіх бібліятэках вобласці на працягу года дзейнічалі кніжныя выставы, якія знаёмілі карыстальнікаў з новымі дасягненнямі айчынных навукоўцаў у сучасных тэхналогіях, расказвалі пра навуковы патэнцыял Беларусі, пра сусветна вядомых вучоных, якія маюць беларускія карані.

У 2017 годзе ва ўсіх бібліятэках вобласці адзначаліся наступныя падзеі:

***Дзень роднай мовы***. У **ДУ «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка** прайшла літаратурная вечарына «Сучасны беларускі раман», гадзіна роднай мовы «Роднай мовы гук чароўны»; **ДУ «Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка»** арганізавала акцыю «Родная мова – крыніца празрыстая», літаратурныя спаборніцтвы «Які ж гэта цуд – мова мая»; **ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка»** правяла тыдзень роднай мовы «Шчырая, лагодная, мова наша родная»; **ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка»** наладзіла ў

бібліятэцы гадзіну чытання і паэзіі «Мовы пяшчотнае сузор'е», дзень беларускасці «Дала мне маці гэтую мову»;

***Дзень беларускага пісьменства***. У **бібліятэках Лагойскага і Слуцкага раёнаў** былі арганізаваны тыдні беларускага пісьменства і друку «Не знікне цуд прыгожага пісьменства» і «Праз смугу стагоддзяў дайшло да нас слова»; супрацоўнікі **Валожынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі** правялі літаратурна-пазнавальную сустрэчу «Роднага Слова вытокі»; супрацоўнікі **Стаўбцоўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі** падрыхтавалі гадзіну беларускай пісьменнасці «Дарога да святыняў друкаванага слова», выставу-панараму «Нетры і ваколіцы прыгожага пісьменства».

***500-годдзе беларускага кнігадрукавання.*** Бібліятэкамі **Лагойскага раёна** ў межах праекта «Жыве ў вяках беларускае слова» на працягу года ладзіліся кніжныя выставы, прагляды літаратуры: «500 гадоў беларускага кнігадрукавання», «Асветнікі зямлі беларускай», «Свет друкаванага слова», «Шлях Скарыны: беларускае кнігадрукванне праз прызму часу», «З кнігай праз вякі» і інш.; у **гарадскіх бібліятэках Маладзечанскага раёна** прайшла бібліяноч «З кнігай праз стагоддзі» з тэматычнымі пляцоўкамі, дзе праходзілі цікавыя і разнастайныя праграмы для наведвальнікаў; супрацоўнікі **Мар'інагорскай гарадской бібліятэкі Пухавіцкага раёна** распрацавалі прысвечаны ушанаванню нашага суайчынніка – першадрукара, выдаўца, перакладчыка, вучонага Францыска Скарыны – культурна-асветніцкі праект «Жыла-была кніга», які ўключаў цыкл мерапрымстваў з рознымі формамі масавай работы; **ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А.Астрэйкі»** стварыла і прэзентавала жыхарам горада і раёна цікавае краязнаўчае выданне «Капыльская АЗБУКА» – даведнік аб падзеях і людзях Капыльшчыны.

Пры бібліятэках Мінскай вобласці дзейнічаюць 54 краязнаўчыя клубы і гурткі, якія аб'ядноўваюць 815 неабыякавых да гісторыі свайго краю чалавек. У **Старадарожскай раённай цэнтральнай бібліятэцы** працуе краязнаўчы клуб «Крыніца», які ставіць сваёй мэтай

прыцягненне падлеткаў да вывучэння гісторыі роднай Старадарожчыны. Працягвае сваю дзейнасць літаратурна-паэтычны клуб «Ветразь» у **Чэвеньскай цэнтральнай раённай бібліятэцы**, пры **Навасельскай сельскай бібліятэцы Мінскага раёна** працуе гісторыка-краязнаўчы клуб па інтарэсах «Нашчадкі», літаратурна-краязнаўчае аб’яднанне «Вытокі» існуе ў **Салігорскай раённай цэнтральнай бібліятэцы**, краязнаўчыя клубы «Радзімічы» і «Спадчына» – у **ДУК «Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П.Труса»**, краязнаўчы гурток «Спадчына» працуе ў **ДУ «Смалявіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя М.Багдановіча»,** пры **Стаўбцоўскай раённай цэнтральнай бібліятэцы** плённа дзейнічае аматарскае аб’яднанне «Краязнаўца».

2017 год быў юбілейным для некаторых раёнаў і гарадоў Мінскай вобласці. У справаздачным годзе **бібліятэкі Клецкага раёна** актыўна далучыліся да святкавання 890-й гадавіны з дня заснавання г. Клецка. Паводле складзенага плана мерапрыемстваў да знамянальнай даты праведзены: літаратурны вечар па кнігах А. Блінца «Клецк. Старонкі даўняй гісторыі» і «Клецкія бітвы 1506 і 1706 гады», краязнаўчы я падарожжы «Гістарычны скарб зямлі клецкай», дзень інфармацыі «Клецкая зямля гісторыяй багата», гістарычны экскурс «Помнікі дойлідства Клецкага раёна».

Да 915-га юбілею Барысава **Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкай імя І.Х.Каладзеева** праведзена сумесна з СМІ шырокамаштабная па ахопу аўдыторыі інфармацыйная праца. Па радыё «Навіны Барысаўшчыны» і «Сталіца» ажыццёўлены цыкл рэпартажаў, прысвечаных гісторыі горада. Для прыхаджан храма Нараджэння Хрыстова распачаты цыкл краязнаўчых лекцый па гісторыі Барысава.

Да 250-годдзя атрымання граматы на Магдэбурскае права горада Мядзела **Мядзельскай раённай бібліятэкай імя М.Танка** была праведзена інтэлектуальная гульня «Родны сэрцу горад мой». Да Дня горада супрацоўнікі бібліятэкі падрыхтавалі крэатыў-сцяну «Я ў гэтым горадзе жыву. Я гэты

горад ведаю». Бібліятэчную пляцоўку ўпрыгожыла выстава «Мядзел, які мы не ведалі» – рэдкія фота Мядзела 50–70 гг. мінулага стагоддзя. Да 345-годдзя з дня нараджэння Піліпа Сцяпанавіча Орліка, гетмана і аўтара першай канстытуцыі Украіны, у **бібліятэцы сямейнага чытання Вілейскага раёна** быў арганізаваны міжнародны круглы стол «Украінская Канстытуцыя Піліпа Орліка ў еўрапейскім кантэксце – найважнейшы дакумент гісторыка-палітычнага і сусветнага значэння».

У справаздачным годзе горад Чэрвень, старажытны Ігумен, адзначаў 630-годдзе з часу першага пісьмовага ўспаміну. Да гэтай юбілейнай даты бібліятэкарамі **аддзела бібліятэчнага маркетынгу Чэрвеньскай цэнтральная бібліятэкі** была падрыхтавана пазнавальная і змястоўная прэзентацыя «Ігумен – горад старажытны, сэрцам малады».

Да 85-гадовага юбілею раённай газеты «Голас Любаншчыны» **аддзелам бібліятэчнага маркетынгу Любанскай цэнтральнай раённай бібліятэкі** сумесна з рэдакцыяй газеты быў распрацаваны даследчы праект «Равеснікі газеты», мэтай якога было сабраць біяграфічную інфармацыю пра 85-гадовых жыхароў раёна, а таксама, выпусціць зборнік вершаў, прысвечаных любімай газеце.

77-годдзю з часу ўтварэння **Валожынскага раёна** бібліятэкі раёна прысвяцілі мерапрыемствы, сярод якіх: краязнаўчае падарожжа «Ведай свой край і знакамітых людзей», гістарычны экскурс «З гісторыяй, з культурай, з намі», літаратурна-мастацкае свята «Кветкі маёй Радзімы».

З нагоды 625-годдзя заснавання г. п. Івянец **Івянецкая гарпасялковая бібліятэка Валожынскага раёна** правяла фотаконкурс «Падарожжа ў мінулае» здымкі мінулых гадоў з гісторыі Івянца.

У душы кожнага чалавека жыве любоў да роднага краю, да сваёй малой радзімы, дзе жылі яго продкі, дзе жыве ён сам. І каб яна ніколі не згасала, каб кожны змог пранесці яе праз усё жыццё, пачуццё гэтае трэба падтрымліваць і выхоўваць. Таму ў шэрагу **бібліятэк Лагойшчыны** стала добрай традыцыяй

арганізоўваць тыдні краязнаўства. Мэта іх – расказаць пра мінулае і сучаснае сваёй мясцовасці, успомніць набыткі папярэдніх пакаленняў, паказаць побыт і звычаі продкаў.

У рамках праекта «Краязнаўчы лекторый на калёсах» супрацоўнікі **Бярэзінскай цэнтральнай раённай бібліятэкі** знаёмілі дэлегацыі гасцей з вобласці, суседніх раёнаў з серыямі «трыбун гонару» і рэкламы «Бярэзінскія славутасці», «10 цікавых фактаў з гісторыі горада і раёна», «Бярэзінскія брэнды».

У справаздачным годзе многія сельскія бібліятэкі вобласці прынялі ўдзел у арганізацыі і правядзенні свят вёсак. Дзень вёскі – свята асаблівае. Яно аб’ядноўвае ў сабе ўспаміны пра мінулае і мары пра будучыню, прыемныя зносіны паміж сябрамі і сваякамі.

Рэтра-вандроўка «Прогулки по улицам Фаниполя» запрасіла ўсіх жадаючых апынуцца разам з **Фаніпальскай гарадской бібліятэкай (сетка публічных бібліятэк Дзяржынскага раёна)** на гістарычных вулачках горада**.**

Супрацоўнікі **Дзяржынскай раённай цэнтральнай бібліятэкі** падрыхтавалі краязнаўчую мультымедыйную экскурс-прэзентацыю «Койданаўскія наваколлі», прысвечаную 85-годдзю набыцця мястэчкам Койданава статусу горада: на экране паўставалі знаёмыя куточкі Дзяржынска і Дзяржынскага раёна.

На базе **Салігорскай раённай цэнтральнай бібліятэкі** адбыліся раённыя краязнаўчыя чытанні педагогаў «Салігоршчына: ад вытокаў да сучаснасці». Раённая цэнтральная бібліятэка падзялілася вопытам работы ў рамках праекта «Культурны код Салігорска». Таксама быў арганізаваны раённы агляд-конкурс «Мой край родны - мая гісторыя жывая» на лепшае афармленне краязнаўчых куткоў у гарпасялковых і сельскіх бібліятэках.

**Капыльскай раённай бібліятэкай імя А.Астрэйкі** сумесна з аддзяленнем гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі і Капыльскім раённым выканаўчым камітэтам былі арганізаваны «Капыльскія чытанні» да 130-годдзя з дня нараджэння Цішкі Гартнага. У мерапрыемстве прынялі ўдзел

навуковыя супрацоўнікі Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі, ДНУ «Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры» і Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Бібліятэка да «Капыльскіх чытанняў» падрыхтавала відэафільм «Рыцар працы і радка», які быў адзначаны навукоўцамі.

**У ДУК «Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна»** традыцыйна была арганізавана выязная інфармацыйная забаўляльная пляцоўка «Каханы горад» у гарадскім парку культуры і адпачынку, прысвечаная Дню горада. Фотавіктарына «Гэта было нядаўна, гэта было даўно», якая прапанавала жодзінцам адгадаць па старых фотаздымках раёны і мясціны горада, была надзвычай папулярнай у гараджан.

У **Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэцы** актыўна працаваў радыёўніверсітэт культуры чытання «Зямля мая, любоў мая». Радыёгутаркі знаёмілі слухачоў з гістарычнымі падзеямі Случчыны, юбілейнымі краязнаўчымі датамі, з жыццёвым шляхам і дзейнасцю знакамітых землякоў. У 2017 годзе было прапанавана 27 радыёгутарак розных тэматычных кірункаў.

У **Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя І.Х.Каладзеева да** юбілейнай 205-й гадавіны Бярэзінскай аперацыі адбылася ІІІ Краязнаўчая навукова-практычная канферэнцыя «Вайна 1812 года вачыма новага пакалення». Прайшла VI Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Колодеевские чтения», праграма якой уключала адкрыццё мемарыяльна-выставачнай кампазіцыі І. Х. Каладзеева і гісторыі Вайны 1812 года.

Прапаганда творчасці мясцовых аўтараў займала пэўнае месца ў дзейнасці бібліятэк вобласці. У рамках праекта **Вілейскай раённай цэнтральнай бібліятэкі імя Г.Новік** «Чытаем кнігі мясцовых аўтараў» выдаюцца зборнікі мясцовых аўтараў і праводзяцца іх прэзентацыі, бібліятэка збірае калекцыю кніг мясцовых аўтараў з іх аўтографамі.

**Цэнтральнай гарадской бібліятэкай г. Жодзіна** распрацаваны праект «Литературная погода в Жодино», у рамках якога ладзяцца сустрэчы з мясцовымі аўтарамі.

«Нясвіж у сэрцы і снах» – пад такой назвай прайшло адкрыццё кніжна-ілюстратыўнай экспазіцыі **Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя П.Пранузa**, прысвечанай жыццю і творчай дзейнасці вядомай польскай паэтэссы, ганаровай грамадзянкі г. Нясвіжа Станіславы Вятр-Партыка. С.Вятр-Партыка нарадзілася на Нясвіжчыне і праз усе жыццё пранесла любоў да роднага горада, праслаўляючы яго ў сваёй творчасці.

У фае **Мар'інагорскай гарадской бібліятэкі Пухавіцкага раёна** на працягу года дзейнічаў літаратурны партал «Паэтычныя галасы роднага краю», на якім былі размешчаны вершы паэтаў-землякоў і літаратурная карта Пухавіччыны.

Візітнай карткай **Уздзенскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя П.Труса** стала літаратурна-мастацкая гасцёўня «У Паўлюка». Тут праходзяць амаль усе літаратурныя мерапрыемствы, экспануюцца краязнаўчыя выставы, створаны куток пісьменніка, дзе пачэснае месца займаюць кнігі пісьменнікаў-землякоў Л. Арабей, В. Гурскага, А. Махнача, Д. Слаўковіча, фотаздымкі, асабістыя рэчы, папкі, лісты, рукапісы. У рамках праекта «Мае землякі – мой гонар» адбыліся валанцёрскія акцыі: «Імя, дастойнае памяці», прысвечаная 95-годдзю з дня нараджэння пісьменніка-земляка А. Махнача; «Ім ганарацца, пра яго памятаюць», прысвечаная 85-годдзю з дня нараджэння Д. Слаўковіча.

Клубу самадзейных паэтаў «Арэскія вытокі» пры **Старадарожскай раённай цэнтральнай бібліятэцы** ў 2017 годзе Міністэрствам культуры РБ прысвоена званне «народны». На працягу года ўдзельнікі клуба плённа працавалі і правялі наступныя пасяджэнні: паэтычны вечар-вернісаж «Любимое время года в музыке и стихах», паэтычныя сустрэчы «І не знікаць паэтам вечна…», «Паэтычныя галасы Старадарожчыны».

Бібліятэкары **ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка»** ў лістападзе правялі традыцыйны Тыдзень літаратурнага краязнаўства «Вялікая літаратура з правінцыяльнай прапіскай».

«Роднага Слова вытокі» – так называлася літаратурна-пазнавальная сустрэча, якую ладзілі супрацоўнікі **Валожынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі** і ўдзельнікі народнага літаратурна-мастацкага аб'яднання «Рунь».

У **сетцы публічных бібліятэк Дзяржынскага раёна** працягвалася рэалізацыя праекта «На літаратурным небасхіле Дзяржыншчыны», які прадугледжваў знаёмства са спадчынай творцаў-землякоў, вядомых як у Беларусі, так і за яе межамі. Працягваў сваю творчую дзейнасць літаратурны клуб «Выток».

Для аматараў паэзіі ў **Негарэльскай сельскай бібліятэцы Дзяржынскага раёна** адбылася літаратурная гасцёўня «Яго словам жыве наша зямля» да 95-годдзя з дня нараджэння Алеся Салаўя.

**У Фаніпальскай гарадской бібліятэцы** прайшоў літаратурна-краязнаўчы вечар жаночай паэзіі «Есть поэтессы в Дзержинском районе», прысвечаны творчасці мясцовых паэтак Людмілы Круглік і Рэгіны Рэўтовіч.

У **Лагойскай цэнтральнай раённай бібліятэцы** была арганізавана прэзентацыя кнігі А. Усціновіча «О чём думают кошки» – паэта-земляка, музыканта, які вядомы па працы ў музыкальных калектывах «Песняры» і «Лявоны».

Бібліятэкі вобласці выкарыстоўвалі розныя формы мерапрыемстваў з мэтай папулярызацыі беларускай літаратуры.

**2017 год** быў пазначаны вялікай колькасцю юбілейных дат беларускіх пісьменнікаў. У **ДУК «Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г.Новік»** распачалі раённы бібліятэчны праект «Беларуская нацыянальная літаратурная спадчына ў сучаснай бібліятэцы». У маі на адкрытай пляцоўцы ля будынка **Вілейскай раённай цэнтральнай бібліятэкі імя Г.Новік** прайшоў літаратурны OPEN-AIR «Галасы паэтаў Беларусі…» Галоўнай падзеяй літаратурнага OPEN-AIR стаў конкурс выразнага чытання.

Да юбілеяў беларусскіх классікаў Я. Купалы і Я. Коласа ў **ДУК «Крупская цэнтральная раённая бібліятэка імя Я. Купалы»** быў арганізаваны раённы агляд-конкурс на лепшую віртуальную альбо кніжную выставу «Паклон ад нас прыміце».

Супрацоўнікі **Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэкі имя П. Пранузы** правялі гарадскую акцыю «Ці ведаеце вы Купалу?». На разгорнутай кніжнай выставе «І вечнасць радка, як вечнасць жыцця» прысутныя змаглі пазнаёміцца з жыццёвым і творчым шляхам песняра, успомніць мясціны, якія ўвекавечылі памяць аб паэце. У рамках акцыі было праведзена бліц-апытанне на веданне твораў і біяграфіі паэта. Пераможцы атрымалі запрашэнні на «Бібліяноч-2017».

У **Пухавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы** ладзіліся літаратурныя вечарыны, краязнаўчыя ўрокі, літаратурна-музычныя кампазіцыі, паэтычныя калейдаскопы, літаратурныя вандроўкі: «Лірыка кахання ў творчасці Янкі Купалы», «Сцежкамі паэта. Па коласаўскіх мясцінах Пухавіччыны», «Паклон прымі ад нас, Пясняр!», «Жывое слова спадчыны», «Паэзія на ўсе часы», «У госці да дзядзькі Антося» (па паэме «Новая зямля») і інш. «Якуб Колас і Пухавіччына» – адна з цікавейшых тэм Пухавіцкага краязнаўства. У бібліятэках назапашаны вялікі матэрыял аб мясцінах, звязаных з народным песняром Беларусі, па паэме Якуба Коласа «Міхасёвы прыгоды» была зроблена выдатная відэапрэзентацыя.

У **ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка»** на працягу юбілейнага года праводзілася акцыя «135 прысвячэнняў юбілярам». Месячнік папулярызацыі твораў народнага паэта Беларусі Я. Купалы «Пакуль ёсць Купала – будзе народ беларускі» адбыўся ў ліпені, у лістападзе – месячнік «Літаратурныя каласавіны на Бярэзіншчыне». На сайце бібліятэкі быў размешчаны відэапраект «У вянок песнярам», наведвальнікі сайта дасылалі свае відэазапісы, дзе яны чыталі вершы народных паэтаў.

Супрацоўнікамі **аддзела маркетынгу Бярэзінскай цэнтральнай раённай бібліятэкі** праведзены апытанні кіраўнікоў аддзелаў і вядучых спецыялістаў Бярэзінскага

райвыканкама «Мой Купала», «Любімы твор Купалы», «Купала ў маім жыцці».

Агляд жыцця і творчасці юбіляраў «На кожнай сцяжынцы іх песня і голас» прайшоў на **абанеменце Валожынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі.** У чытальнай зале адбылася мультымедыйная прэзентацыя «І не змоўкнуць ніколі ў свеце Купалавы словы…».

Акцыя «Чытаем Купалу на мове сэрца», прымеркаваная да 135-годдзя з дня нараджэння песняра, праведзена ў **Дзяржынскай раённай цэнтральнай бібліятэцы**. Кожны наведвальнік бібліятэкі меў магчымасць прадэкламаваць свае любімыя радкі Я. Купалы, узяць на дом зборнікі яго твораў, выданні прысвечаныя жыццю і творчасці славутага песняра.

Шырока адзначаліся юбілеі пісьменнікаў у **ДУ «Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка»**. Былі праведзены наступныя мерапрыемствы: літаратурна-музычная праграма «Звіні, спявай, купалаўская ліра», паэтычныя чытанні «Пясняр народных дум», падарожжа па казках Я.Купалы «А пачнём мы казку так…», літаратурныя вечарыны «Напеўнае слова ў душы берагу», «Як песня народа, неўміручы наш Колас», літаратурнае падарожжа ў свет купалаўскай паэзіі «Пясняр роднага краю» і інш.

У межах праекта «Вялікія песняры беларускай зямлі» у **бібліятэках Лагойскага раёна** праведзены цыкл мерапрыемстваў з разгорнутымі кніжнымія выставамі, прысвечанымі юбілейным датам.

Ва ўсіх філіялах **ДУК «Любанская раённая цэнтральная бібліятэка»** на працягу года праходзіла грамадска-культурная акцыя «Чытаем Купалу і Коласа разам». У рамках акцыі праходзілі тыдні паэзіі «Песняр адвечных дум», «Мудры, зямны, незабыўны Якуб Колас», а таксама цыклы кніжна-ілюстрацыйных экспазіцый, якія адлюстроўвалі біяграфіі і творчасць выдатных пісьменнікаў.

Да 135-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы і 500-годдзя беларускага кнігадрукавання намаганнямі ўдзельнікаў аматарскага тэатральнага гуртка, які дзейнічае пры

**Будслаўскай сельскай бібліятэцы Мядзельскага раёна**, ажыццёўлена пастаноўка п’есы Я. Купалы «Прымакі».

У **ДУК «Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка»**прайшлі Купалаўскія чытанні «Славуты пясняр беларускага народа».

У **бібліятэках Слуцкага раёна** прайшлі цыклы гутарак, паэтычных гадзін, літаратурных аглядаў творчасці, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння Янкі Брыля: «Мастак, адкрыты свету», «Жыцця вялікага старонкі», «Сейбіт праўды і чалавечнасці» і інш.

На пасяджэнні літаратурна-паэтычнага клуба «Ветразь» **пры Чэрвеньскай цэнтральнай раённай бібліятэцы** прайшла вечарына «Паэт шырокай душы», прысвечаная 105-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Максіма Танка.

Каб данесці да кожнага чытача прыгажосць і непаўторнасць роднай мовы, на працягу года чытачы запрашаліся ў **бібліятэкі Старадарожскага раёна** на літаратурныя вечарыны, гадзіны паэзіі, юбілейныя вечарыны пісьменнікаў: «Пра вечнае» – гутарка-роздум да 60-годдзя з дня нараджэння А.Пісьмянкова; гадзіна паэзіі «З любоўю кожны радок» – да 100-годдзя з дня нараджэння Я. Непачаловіча; «Вялікі майстар паэтычнага слова» – да 100- годдзя з дня нараджэння П. Панчанкі; «Пішу для вас з асалодай і радасцю» – літаратурная гасцёўня да 95-годдзя А. Васілевіч; «Пісьменнік праўды жыцця» – літаратурная гасцёўня да 70-годдзя Г. Марчука і інш.

Цікавыя мерапрыемствы былі падрыхтаваныя да 100-годдзя з дня нараджэння Пімена Панчанкі **у бібліятэках Любанскага раёна**: літаратурны аўтограф «Пакуль сонца не згасне, пакуль свецяцца зоры», разгорнутая выстава-знаёмства «Памяці Пімена Панчанкі», дзень паэта «Верым з калыскі, што лепшае спраўдзіцца», літаратурная гадзіна «Каб кожны Панчанку пачуў», гадзіна паэзіі «Пра веру, вечнасць, чалавечнасць», вусны часопіс «Аб жыцці, аб людзях, аб сабе».

95 год з часу заснавання адзначыў старэйшы беларускі часопіс «Полымя». З нагоды гэтай падзеі ў **Лагойскай**

**цэнтральнай раённай бібліятэцы** адбылася інфармацыйная гадзіна «Старэйшае беларускае літаратурна-мастацкае выданне». З нагоды 75-годдзя паэта-земляка Сяргея Фёдаравіча Давідовіча ў бібліятэках раёна былі праведзены разнастайныя мерапрыемствы, сярод якіх тэматычныя паліцы і кніжныя выставы «Падарунак земляка», «Радкі паэта з Лагойшчыны», «Зямля мая родная», дзень паэта «Мы – ад адной зямлі», агляд літаратуры «У віры падзей», гутарка-знаёмства «Жыццё, напоўненае дабрынёй» , агляд творчасці «Душы маёй бяссонніца» і інш.

Прапагандуючы беларускую літаратуру, супрацоўнікі **Клецкай раённай цэнтральнай бібліятэкі** арганізавалі творчую сустрэчу з аўтарам 40 гістарычных мастацкіх і навукова-папулярных твораў, лаурэатам Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу 2013г. Юрыем Татарынавым.

Знаёмства «Павіншуй пісьменніка – прачытай кнігу» адбылося з кнігамі Мікалая Чаргінца да яго 80-годдзя ў **Негарэльскай сельскай бібліятэцы Дзяржынскага раёна**.

У справаздачным годзе бібліятэкі вобласці актыўна папаўнялі свае **бібліяграфічныя БД «Краязнаўства»** ў электронным каталогу. У **Вілейскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Г. Новік** база дадзеных утрымлівае 3966 запісы, у **Лагойскай цэнтральнай раённай бібліятэцы** – 7826, у **Пухавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы –** 2878, у **цэнтральнай гарадской бібліятэцы г. Жодзіна** – 22 132.

Працягваўся збор матэрыялаў для папаўнення мясцовых баз дадзеных уласнай генерацыі.

У **Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя І.Х.Каладзеева** працягваецца праца па фарміраванні паўнатэкставых баз дадзеных уласнай генерацыі «Вяртанне да вытокаў» і «Слово краеведа».

**Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка** сумесна з Валожынскім краязнаўчым музеем падрыхтавала гісторыка-краязнаўчае падарожжа з мультымедыйнай прэзентацыяй «Валожыншчына – наш родны край». Да Года навукі тут створана база дадзеных «Навуковая спадчына

Валожыншчыны», якая ўключае біяграфічныя звесткі і матэрыялы пра дасягненні вучоных, якія паходзяць з Валожыншчыны, выпушчаны буклеты з серыі «Землякоў славутыя імёны».

У **Клецкай раённай цэнтральнай бібліятэцы** пастаянна папаўняюцца электронныя базы дадзеных «Пісьменнікі роднага краю», «Прыродныя рэсурсы Клецкага раёна», «Народныя традыцыі і абрады».

У **Мядзельскай раённай бібліятэцы імя М.Танка** папаўняецца электронная база дадзеных «Памяць Мядзельшчыны», якая з'яўляецца дапаўненнем да фонду краязнаўчых дакументаў і даведачна-бібліяграфічнага апарату і змяшчае матэрыялы аб жыцці рэгіёна і мясцовых дзеячах. ). У справаздачным годзе было ўнесена 19 тэкставых дакументаў, сярод якіх артыкулы «А карані мае з Мядзельшчыны…» – да 90-годдзя з дня нараджэння заслужанай артысткі Беларусі, дыктара беларускага радыё Галіны Сідзельнікавай; «Два таленты Марыі» – да выхаду ў свет кнігі «Марыя Захарэвіч. Талент, адухоўлены любоўю»; «Зямля бацькоў – зямля дзяцей « – звесткі пра вёску Будслаў. Усяго базу дадзеных «Памяць Мядзельшчыны» складаюць 484 тэкставыя дакументы.

У **Голацкай сельскай бібліятэцы Пухавіцкага раёна** створана электронная прэзентацыя «Голацк – мая родная старонка». Новымі імёнамі папаўнялася электронная краязнаўчая фактаграфічная картатэка **Пухавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** «Памяць Міншчыны. Персаналіі. Пухавіцкі раён», якая уключае 194 персаналіі і 719 бібліяграфічных запісаў.

Папаўняліся базы дадзеных уласнай генерацыі **Салігорскай раённай цэнтральльнай бібліятэкі** «Памятнымі мясцінамі Салігоршчыны» і «Солигорщина: вчера и сегодня».

Бібліятэкарамі **Лучнікоўскай сельскай бібліятэкі-філіяла №7 Слуцкага раёна** прадоўжана праца па папаўненні паўнатэкставых баз дадзеных «Лучнікоўскі летапіс» (налічвае 420 запісаў) і «Случчанская хроніка» (1865 запісаў). **Дзіцячым аддзелам Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі** актыўна

вядзецца праца над краязнаўчай паўнатэкставай базай дадзеных «Горад дзевяці стагоддзяў», якая на канец справаздачнага года налічвала 2141 запіс.

У **Старадарожскай раённай цэнтральнай бібліятэцы** ствараюць ЭБД «Памяць Старадарожчыны»(1652 запісы), у **Старадарожскай сельскай бібліятэцы** – базы дадзеных «Майстры роднага краю».

Рэгулярна сканіраваўся матэрыял для базы дадзеных уласнай генерацыі **у цэнтральнай гарадской бібліятэцы г.Жодзіна** «Жодиноведение», якая пастаяна папаўняецца і рэдагуецца. У 2017 годзе створаны таксама электронны інфарм-дайджэст «Учреждения культуры г. Жодино».

Вялікая ўвага бібліятэкамі Мінскай вобласці надаецца выдавецкай дзейнасці. Значную частку друкаванай прадукцыі бібліятэк складаюць выданні краязнаўчага характару, а таксама матэрыялы, якія прапагандуць беларускую і літаратуру. Амаль кожная раённая бібліятэка бібліятэка змясціла краязнаўчыя календары памятных дат раёна і бібліяграфічныя паказальнікі аб раёне на старонках мясцовага і рэспубліканскага друку.

У **ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х.Каладзеева»** рэалізаваны выдавецкі праект «Легенды Борисовщины: мифы и реальность».

У **Бярэзінскай цэнтральнай раённай бібліятэцы** ажыццяўляўся выпуск краязнаўчага рэкамендацыйнага спіса «Што чытаць аб Бярэзінскім раёне», былі падрыхтаваны буклеты на краязнаўчую тэматыку. Бібліятэкай сумесна з раённым выканаўчым камітэтам, раённым Саветам ветэранаў, рэдакцыяй раённай газеты было выпушчана выданне, прысвечанае падзеям Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Бярэзінскага раёна і героям працы – ардэнаносцам пад назвай «Их подвиг прекрасен и свят» (да 30-годдзя раённай ветэранской арганізацыі). Ажыццёўлены выпуск паэтычнага зборніка «Мышь і слон» Алены Пшанічнік – лаурэата абласнога конкурса «Слова Купалы да творчасці кліча».

У **Вілейскай раённай цэнтральнай бібліятэцы імя Н. Новік** выпусцілі зборнікі мясцовых аўтараў: Казлоўскі В.

«Простор души, таинственный, огромный»; Дубовік, К. «Не трэба жыцця майго дзён пазалоты»; Капцюг, Г. «Осень жизни: стихотворения», а таксама зборнік вершаў «Я прызнаюся сэрцам і душой», прадстаўлены на конкурс літаратурнай творчасці ветэранаў Вілейскага раёна, прысвечаны 30-годдзю ўтварэння Беларускага грамадскага аб’яднання ветэранаў.

**Дзяржынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай** выдадзены матэрыялы I Пакроўскіх чытанняў і матэрыялы Койданаўскіх чытанняў, прысвечаных 870-годдзю г. Дзяржынска «Будзь, Дзяржынск наш, вечна маладым!»; інфармацыйна–бібліяграфічнае выданне ў 2-частках, прысвечанае людзям навукі з Дзяржыншчыны «Их имена прославили науку»; «Святы вёсак Дзяржыншчыны»; краязнаўчая азбука «Ад А да Я – Дзяржыншчына мая», зборнікі вершаў удзельнікаў літаратурнага клуба «Выток».

**Капыльскай раённай цэнтральнай бібліятэкай імя А. Астрэйкі** выдадзены краязнаўчы календар «Старонкі гісторыі Капыльшчыны ў 2017 годзе».

У **Курупскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Я. Купалы** выпусцілі зборнік вершаў мясцовых паэтаў аб Крупшчыне «Паэтычны погляд на прыроду», працягвалася праца над серыяй буклетаў у рамках праекта «Жыццё без кнігі я не ўяўляю». Усерыі «Пісьменнікі-юбіляры» выйшлі буклеты, прысвечаныя М. Калачынскаму, В. Грышановічу, А. Багдановічу; у серыі «Знакамітыя людзі Крупшчыны» – прысвечаныя А. Гаміну, У. Кавалёнку, К. Карстэн і інш.

**Мінскай раённай цэнтральнай бібліятэкай** складзены бібліяграфічныя дапаможнікі: «І на душы і светла і шчымліва» – да 70-годдзя Раісы Баравіковай, «І я з народам…» – да 130-годдзя з дня нараджэння Алеся Гаруна, «Пясняр народных дум і спадзяванняў» – да 135-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы, «Прарок нялёгкай народнай будучыні» – да 115-годдзя Язэпа Пушчы і інш.

**Мядзельскай раённай бібліятэкай імя М.Танка** падрыхтаваны і выдадзены краязнаўчы паказальнік «Мядзельшчына ў друку – 2017», а таксама тэматычныя

бібліяграфічныя спісы літаратуры для гарадскога Дома культуры і РАМЦ, упраўлення сельскай гаспадаркі і навучальных устаноў горада.

У **Пухавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы** выдадзены краязнаўча-біяграфічны нарыс «Знакамітыя навукоўцы з Пухавіцкага раёна і іх дасягненні», прысвечаны юбілярам года.

**Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкай** ў 2017 годзе былі падрыхтаваны наступныя інфармацыйна-бібліяграфічныя краязнаўчыя выданні: «Каб быў чалавек чалавекам» – да 70-годдзя беларускага пісьменніка Алеся Жука; «Краязнаўчы музей – захавальнік гісторыі» – да 65-годдзя з дня заснавання Слуцкага краязнаўчага музея; «Слуцкае гета: памяць і напамін» – да 10-годдзя з часу адкрыцця мемарыяльнага знака ў памяцьлюдзей , якія загінулі ў Слуцкім яўрэйскім гета ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

**Старадарожскай раённай цэнтральнай бібліятэкай** складзены і выдадзены бібліяграфічны паказальнік «Што чытаць аб Старадарожчыне (2016)».

Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса выдала рэкамендацыйныя бібліяграфічныя паказальнікі: «Агнявыя дарогі пісьменніка: творчасць Васіля Гурскага», «Шляхам служэння духоўнасці: святы спавядальнік Міхаіл Навіцкі» і інш.

**Чэрвеньскай раённай бібліятэкай** быў складзены бібліяграфічны спіс «Чэрвень-месяц – Чэрвень-горад: да 630-годдзя г. Ігумена (Чэрвеня)».

Бібліятэкі вобласці ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы тэкставых даведак для базы дадзеных Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі «Беларусь у асобах і падзеях».

Такім чынам, краязнаўства застаецца адным з вядучых напрамкаў дзейнасці бібліятэк Мінскай вобласці. Аб гэтым сведчыць шэраг мепрапрыемстваў, краязнаўчыя праекты і праграмы, новыя цікавыя краязнаўчыя электроныя рэсурсы, а таксама ўдзел у разнастайных навуковых краязнаўчых канферэнцыях

# Бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей

## *Асноўныя паказчыкі дзіцячых бібліятэк*

Дзеці і падлеткі – адна з самых актыўных катэгорый карыстальнікаў бібліятэкі, якая з’яўляецца аб’ектам пастаяннай увагі і клопату дзіцячых бібліятэк Міншчыны. Праца дзіцячых бібліятэк Мінскай вобласці была скіравана на забеспячэнне доступу юных карыстальнікаў да бібліятэчна-інфармацыйных рэсурсаў, удасканаленне бібліятэчных паслуг шляхам укаранення новых інфармацыйных тэхналогій у практыку работы бібліятэк, папулярызацыю кнігі і чытання сярод дзяцей і развіццё іх чытацкіх здольнасцей.

У 2017 годзе бібліятэчным абслугоўваннем дзіцячага насельніцтва Мінскай вобласці займалася 21 дзіцячая бібліятэка.

Паслугамі публічных бібліятэк вобласці карысталася 151,5 тыс. чытачоў-дзяцей (у 2016 годзе – 157,1 тыс.). Чытачамі дзіцячых бібліятэк з’яўляліся 46,4 тыс.чалавек (у 2016 годзе – 48,4 тыс.), з іх да 15 год 40,3 тыс. дзяцей (у 2016 годзе – 43,3тыс.), якім было выдадзена 907,9 тыс. экз. дакументаў (у 2016 годзе – 694,3 тыс.).

Дзіцячы чытач складае 37% ад агульнай колькасці (408,2 тыс.) карыстальнікаў.

Магчымасць карыстання сучаснымі пазабібліятэчнымі крыніцамі інфармацыі (камп'ютарам, інтэрнэтам і інш.) значна зніжае прыток чытачоў-школьнікаў у чытальную залу. Але наведванне масавых мерапрыемстваў, сустрэчы з сябрамі, камп’ютарныя і настольныя гульні, прагляд перыядычных выданняў у чытальнай зале аказаліся запатрабаванымі. Таму супрацоўнікі дзіцячых бібліятэк шукаюць шляхі далучэння юных чытачоў да чытання праз такія формы бібліятэчнай працы, ствараючы атмасферу добразычлівасці, павагі і разумення.

У склад карыстальнікаў дзіцячых бібліятэк, акрамя дзяцей да 15 гадоў, уваходзяць таксама бацькі, настаўнікі, вучні старэйшых класаў, студэнты.

З мэтай рэалізацыі дзяржаўнай бібліятэчнай палітыкі, накіраванай на захаванне і развіццё патэнцыялу сельскіх тэрыторый, у вобласці функцыянуюць 269 бібліятэк аграгарадкоў, якімі далучана да чытання 43,9 тыс. дзяцей і падлеткаў (у 2016 годзе – 43,1 тыс.).

Бібліятэчны фонд дзіцячых бібліятэк вобласці налічвае 424 тыс. экз. дакументаў ( у 2016 годзе – 453,1тыс.экз.).

У сярэднім на адну бібліятэку прыходзіцца 20,2 тыс. экз. (у 2016 годзе – 21,6 тыс.).

Доля выбыцця выданняў з агульнага фонду склала 29,1 тыс.экз. (у 2016 г. – 28,8 тыс.).

Новыя паступленні склалі 15,7 тыс. экз. (у 2016 годзе – 17,3 тыс. экз.). З іх новых кніг – 7,1 тыс.экз. (у 2016 г. было 7,05 тыс.экз.). Лічба аб'ёму паступленняў новых кніг на працягу года вызначаецца неаднолькавасцю: ад 114 экз. дакументаў (Стаўбцоўскі раён), 430 экз. (Узденскі раён), 580 экз. (Старадарожскі раён) да 2068 экз. дакументаў (Мінскі раён).

Пры камплектаванні фондаў дзіцячых бібліятэк Міншчыны асаблівая ўвага надавалася набыццю літаратуры ў дапамогу навучальнаму працэсу, літаратуры па пазакласным чытанні, сацыяльна значнай літаратуры, твораў сучасных аўтараў і павышанага попыту. Але надзённым пытаннем застаецца папаўненне кніжных фодаў сучаснай галіновай і мастацкай літаратурай для дзяцей. Сродкі, якія выдзяляюцца на камплектаванне кніжнага фонду, нязначныя. Аб гэтым сведчыць абмежаваны спіс паступленняў новых кніг для дзяцей у сельскія філіялы.

Падтрымліваць інфармацыйны патэнцыял і прываблівацць юных наведвальнікаў дзіцячым бібліятэкам дапамагае падпіска на перыядычныя выданні (часопісы) – 658 назваў (у 2016 г. – 749; у 2015 г. – 916; у 2014 г. –787).У апошнія тры гады скарацілася падпіска на перыядычныя выданні. Але пералік часопісаў для дзяцей застаецца шырокім. Сельскія бібліятэкі прапаноўваюць юным чытачам 7 – 10 назваў часопісаў.

У публічных бібліятэках Міншчыны ўкараняюцца платныя паслугі. Дадатковыя платныя бібліятэчна-

інфармацыйныя паслугі арыентаваны на задавальненне запытаў наведвальнікаў, на пашырэнне даступнасці і камфортнасці карыстання інфармацыйнымі рэсурсамі. Найбольш папулярнымі былі такія віды, як выдача кніг з камерцыйнага фонду бібліятэкі, сканіраванне і ксеракапіраванне дакументаў; раздрукоўка на прынтары; набор тэкстаў; пошук інфармацыі ў сетцы Інтэрнэт; выкананне даведак і тэматычных падборак.

Для 2017 года характэрна інтэнсіфікацыя працэсу камп’ютарызацыі дзіцячых бібліятэк, насычэненне іх электронным, аўдыёвізуальным абсталяваннем. У Мінскай вобласці камп’ютарызавана 21 дзіцячая бібліятэка.

У дзіцячых бібліятэках налічваецца 40 камп'ютараў. Доступ у Інтэрнэт і электронную пошту маюць 19 бібліятэк.

Развіццё камп'ютарных тэхналогій дало магчымасць дзіцячым бібліятэкам вобласці быць больш канкурэнтаздольнымі на рынку інфармацыйных паслуг. Дзіцячыя бібліятэкі актыўна выкарыстоўваюць у сваёй працы сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі.

Пры правядзенні масавых мерапрыемстваў ўжываліся інавацыйныя формы: віртуальныя экскурсіі, завочныя падарожжы, мультымедыйныя электронныя прэзентацыі, буктрэйлеры, відэагадзіны, відэаролікі, слайд-гутаркі, слайд-рэпартажы, якія ўздымалі бібліятэчныя мерапрыемствы на больш якасны ўзровень і значна павышалі цікавасць да іх чытачоў.

Дзіцячыя бібліятэкі Міншчыны актыўна асвойваюць магчымасці сацыяльных сетак для рэкламы бібліятэчных мерапрыемстваў, папулярызацыі кнігі і чытання, прафесійных кантактаў. Ствараюцца сайты дзіцячых бібліятэк, асабістыя блогі, старонкі ў сацыяльных сетках «Фэйсбук», «УКантакце» і «Аднакласніках» (г. Барысаў, г. Маладзечна, г. Жодзіна, г. Салігорск, г. Слуцк, г. Мядзель і інш.), дзе адлюстроўваецца праца бібліятэк, адбываецца абмен вопытам працы з калегамі.

Сайт Уздзенскай ДБ з'яўляецца тэхналагічнай інавацыяй для бібліятэкі. Бібліятэка атрымала магчымасць прадастаўлення інфармацыі ў адзінай інфармацыйнай прасторы для

патэнцыйных і рэальных спажыўцоў, раскрываючы свае інфармацыйныя рэсурсы.

Ужо шмат гадоў працуюць **інфармацыйна-адукацыйныя цэнтры**: «Тэрыторыя IQ» пры дзіцячым аддзеле Слуцкай РЦБ, ІАЦ бібліятэкі сямейнага чытання «Верасок» г. Маладзечна, «У свеце падлетка» Валожынскай ДБ, мультымедыйныя цэнтры пры Пухавіцкай дзіцячай бібліятэцы і Барысаўскай ЦРБ імя І.Х. Каладзеева (дзіцячы аддзел), «Твоя жизнь – твой выбор» Уздзенскай ДБ, якія створаны з мэтай развіцця і ўдасканалення інфармацыйна-адукацыйнай культуры, інтэлектуальнага росту і задавальнення пазнавальных запытаў дзяцей і падлеткаў. Магчымасці інфармацыйна-адукацыйных цэнтраў выкарыстоўваліся пры правядзенні ўрокаў інфармацыйнай культуры. Наведвальнікі ІАЦ удзельнічалі ў пазнавальных анлайн-гадзінах, медыяаглядах, медыяпрэзентацыях, анлайн-падарожжах, гадзінах анімацыі, турнірах знаўцаў камп’ютара, медыялекторыях і інш.

Пры Бярэзінскай дзіцячай бібліятэцы дзейнічае інфармацыйна-прававы цэнтр «Ведай свае правы змалку», дзе змешчаны матэрыялы аб правах дзяцей і ахове дзяцінства, па прафарыентацыі, дасье «Несовершеннолетние и законы РБ», «Парады бацькам». ДБ выпусціла даведнікі «Подростку о правах», «Это надо знать», «Знай свои права», «Декларация прав ребенка. Что я знаю об этом?», «Права и ответственность».

На працягу года супрацоўнікі бібліятэкі сямейнага чытання «Верасок» (Маладзечанская ЦРБ) забяспечвалі аператыўнае інфармацыйнае абслугоўванне карыстальнікаў з улікам іх інтарэсаў праз інфармацыйна-адукацыйны цэнтр з змястоўным фондам дакументаў на электронных носьбітах. Для карыстальнікаў праводзіліся гутаркі-кансультацыі па выкарыстанні камп’ютарных магчымасцяў пры пошуку інфармацыі, забяспечвалася магчымасць самастойнага пошуку.

Сацыяльная тэматыка сёння закранула многія напрамкі дзейнасці дзіцячых бібліятэк. Павялічылася яе доля ў інфармацыйнай рабоце, ствараюцца банкі дадзеных, дзе змешчана інфармацыя аб сацыяльна-псіхалагічных службах,

навучальных установах, цэнтрах дзіцячай творчасці, матэрыялы па праблемах дзяцінства, дзяцей-сірот, прыёмных сям'яў, дзе можна знайсці тэлефоны службаў даверу, выратавання, занятасці і інш.

Значна пашырыліся **кантакты бібліятэк Міншчыны** з установамі, якія займаюцца выхаваннем дзяцей: агульнаадукацыйнымі школамі, дзіцячымі садкамі, цэнтрамі карэкцыйнага развіцця і рэабілітацыі дзяцей, інспекцыямі па справах непаўналетніх, школамі мастацтваў, аддзеламі па рабоце з моладдзю, цэнтрамі творчасці дзяцей і моладзі, раённымі арганізацыямі ветэранаў, інспекцыямі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, летнімі аздараўленчымі лагерамі.

Плённа ў кірунку **міжнароднага супрацоўніцтва** працуюць публічныя бібліятэкі Барысаўшчыны. Дзіцячы аддзел Барысаўскай ЦРБ працягваў супрацоўнічаць з Цэнтральнай гарадской дзіцячай бібліятэкай імя А.П. Гайдара г. Масквы. У справаздачным годзе барысаўскія бібліятэкары прымалі ўдзел у арганізаваный арганізацыйна-метадычным аддзелам ЦГДБ ім. А.П. Гайдара прамой трансляцыі адкрытай сустрэчы з цыкла «Диалоги в Гайдаровке», у гарадскіх семінарах «Большая литературная пятница в Гайдаровке» і «Краеведческая среда в Гайдаровке». А таксама ўдзельнічалі ў вебінары на тэму: «Заповедные места Псковщины и Республики Беларусь, парки и сады города Пскова и Борисова»; у міжнароднай дабрачыннай акцыі «Караблік дабрыні», абвешчанай муніцыпальнай установай г. Самары «Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк». Мэта гэтай акцыі – садзейнічанне культурнаму развіццю дзяцей, якія трапілі ў цяжкую жыццёвую сітуацыю, шляхам арганізацыі культурна-забаўляльных мера прыемстваў з арганізаваным дарэннем кніг. Для выхаванцаў аддзялення дзіцячага сацыяльнага прытулку быў паказаны лялечны спектакль «День рождения ослика ИА». У ходзе мерапрыемства бібліятэкары падарылі дзецям кнігі і папяровыя караблікі, на якіх быў змешчаны слоган акцыі: «Будь на волне – читай!».

На міжнароднай канферэнцыі ў Мінску «Детское чтение: проблемы, поиски, решения» выступілі загадчыца дзіцячага аддзела Слуцкай РЦБ з дакладам аб пілотным праекце «БібліяВокны» і загадчыца дзіцячага аддзела Дзяржынскай РЦБ з дакладам «Опыт библиотек в продвижении детского чтения».

Росту аўтарытэту дзіцячых бібліятэк рэгіёна садзейнічала **работа з раённымі і рэспубліканскімі СМІ**. У перыядычных выданнях і журналістамі, і супрацоўнікамі бібліятэк асвятляюцца розныя аспекты бібліятэчнага жыцця, публікуюцца паведамленні аб рэсурсах, мерапрыемствах, паслугах бібліятэк.

У справаздачным годзе бібліятэкі Міншчыны значна актывізавалі сваю дзейнасць па распаўсюджванні чытання і кнігі сярод дзяцей і падлеткаў, пашырэнні функцый і дыяпазону бібліятэчных паслуг.

Кожная дзіцячая бібліятэка выпрацавала ўласную праграму арганізацыі абслугоўвання чытачоў з улікам спецыфікі свайго рэгіёна і запатрабаванняў карыстальнікаў. Больш паспяхова, асэнсавана працуюць у гэтым напрамку Барысаўская, Слуцкая, Жодзінская, Маладзечанская, Салігорская дзіцячыя бібліятэкі.

Традыцыйнымі ў рэкламе дзіцячых бібліятэк сталі экскурсіі, дні адчыненых дзвярэй, прэзентацыі праектаў бібліятэк, рэкламныя акцыі, флэшмобы і інш.

У практыцы работы дзіцячых бібліятэк Міншчыны прыжылася такая форма далучэння юных чытачоў да чытання, як вулічная рэклама (выязныя пляцоўкі). Да прыкладу творчая пляцоўка ля бібліятэкі ў рамках праекта «БібліяВокны» (дзіцячы аддзел Слуцкай РЦБ); святочная інфармацыйна-забаўляльная пляцоўка ў Дзень Незалежнасці РБ «Сделано в Жодино с любовью» (ЦГБ г. Жодзіна); забаўляльная праграма ў скверы «Дзіцячы гарадок» (Старадарожская ДБ); акцыі «З кніжкай на лаўцы» і «З кніжкай на прыродзе», конкурс малюнкаў на асфальце «Я малюю шчасце», конкурсы з казачнымі героямі «Літаратурны гармідар» (Любанская ДБ); «Вандроўная бібліятэчка», «Чытай-дворык па вуліцы Камсамольскай»,

«Кніжка выйшла пагуляць», «Літаратурны праменад», «Лета пад кніжным парасонам» (Бярэзінская ДБ) і інш.

Бярэзінская ДБ таксама пашырала сферу свайго ўплыву, актыўна выходзіла ў зоны адпачынку гаражан. «Книга на свежем воздухе» – пад такой назвай адбылося чэрвеньскае святочнае мерапрыемства для юных бярэзінцаў і іх бацькоў. У парку было арганізавана некалькі гульнёвых кропак. Супрацоўнікі дзіцячай бібліятэкі прапаноўвалі «Сказки малютки на 2-3 минутки», сустрэчы з казачнымі персанажамі, удзельнікі адгадвалі загадкі, малявалі. Для папулярызацыі дзіцячай бібліятэкі сярод чытачоў раздавалася яе рэкламная прадукцыя з пералікам паслуг, рэжымам працы і тэлефонамі.

Упершыню для дзяцей Вілейскага раёна ў перыяд летніх канікул праводзіліся «Летнія чытанні пад адкрытым небам». Для ўсіх жадаючых прайшлі фотакросінгі «Лето! Молодость! Вилейка!». Дзеці разам з бібліятэкарамі выходзілі ў гарадскі парк, дзяліліся на каманды, выбіралі капітана, назву і дэвіз. Кожная каманда павінна была мець тэлефон з фотакамерай. Перад удзельнікамі была пастаўлена задача зрабіць фатаграфіі на тэмы, вызначаныя арганізатарамі. Пры гэтым улічвалася хуткасць і ў перамяшчэнні да аб’ектаў, і ў здымцы. У канцы гульні каманда-пераможца была ўзнагароджана.

Клецкая дзіцячая бібліятэка прыняла ўдзел у святочным мерапрыемстве «Городской парк – территория новых возможностей». Дзеці і дарослыя мелі магчымасць пазнаёміцца з лепшымі замежнымі і айчыннымі творамі, прадстаўленымі на кніжнай выставе «Летнее путешествие с книгой», а таксама прыняць удзел у тэатралізаваным прадстаўленні «Читай-город».

«Бібліятэчны скверык» сабраў юных капыльчан на літаратурна-пазнавальную гадзіну «Хто жыве ў высокай траве». На свежым паветры дзеці адгадвалі загадкі пра насякомых, а затым шукалі іх у траве, на дрэвах ці кустах, даведваліся аб карысці той ці іншай «кузюркі». Напрыканцы «юннаты» пагарталі на лаўках сквера кнігі і часопісы аб прыродзе.

«Па горадзе са «Шчанячым патрулём»« – пад такой назвай маладзечанская бібліятэка сямейнага чытання «Верасок»

сумесна з раённым Домам культуры і раённым цэнтрам рамёстваў правяла незвычайны квэст. Упершыню ў дзяцей г. Маладзечна з’явілася магчымасць адправіцца ў захапляльнае падарожжа святочным аўтобусным маршрутам «Шчанячы патруль». На станцыі пад назвай «Кніжная» дзяцей сустракалі супрацоўнікі бібліятэкі і прапанавалі ім квэст. За правільна выкананыя заданні дзеці атрымлівалі прызы і цукеркі.

Праект Уздзенскай дзіцячай бібліятэкі па прапагандзе кніжнага фонду «Книжка на гастролях» дае магчымасць паказаць фонд дзіцячай бібліятэкі ў населеных пунктах, якія абслугоўваюцца бібліобусам.

Арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання дзяцей і падлеткаў дзіцячых біблятэк Міншчыны была накіравана на выкананне наступных **Дзяржаўных праграм**:

- Дзяржаўная праграма «Культура Беларусі» на 2016-2020 г.г .;
- Дзяржаўная праграма «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь» на 2016-2020 г.г .;
- Дзяржаўная праграма «Адукацыя і маладзёжная палітыка» на 2016-2020 г.г .;
- Дзяржаўная праграма «Ахова навакольнага асяроддзя і ўстойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў» на 2016-2020 г.г .;
- Дзяржаўная праграма развіцця фізічнай культуры і спорту ў Рэспубліцы Беларусь на 2016-2020 г.г .;
- Дзяржаўная праграма па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС на 2011-2015 г.г. і на перыяд да 2020 года.

На якаснае і аператыўнае задавальненне культурных, духоўных, адукацыйных патрэб карыстальнікаў накіраваны **мэтавыя праграмы і бібліятэчныя праекты**: «Чытаем разам», «Лета. Кніга. Бібліятэка» , «Слуцк – валошка ў вянку Беларусі» (дзіцячы аддзел Слуцкай РЦБ); праграма «К книге и чтению – через досуг и общение» і яе падпраграмы «Ребёнок в мире прав», «Человек и природа», «Будь здоровым, сильным, смелым», «Личная безопасность», імідж-праект «З думкаю пра

Беларусь», праект па прыцягненні да чытання дашкольнікаў і малодшых школьнікаў «Там, на неведомых дорожках…», сумесны праект «Мы читатели и издатели» (дзіцячы аддзел «Барысаўскай ЦРБ ім. К.Х. Каладзеева); праекты «Бібліятэка і экалогія», «Канікулы з карысцю», « Чытанне адкрывае свет» (Валожынская ДБ); «Дадзім надзею дзецям», «Цуды сваімі рукамі», «Бібліятэка для сям'і: выхавацель на гадзіну» (аддзел па рабоце з дзецьмі Вілейскай РЦБ); раённая праграма «Востраў надзеі», праграмы «Сёння – зярнятка, заўтра – раслінка» і «Дзеці. Сям'я. Кніга» (дзіцячы аддзел Дзяржынскай РЦБ); праграма экалагічнага выхавання «Наш экадом – Мядзельшчына», праграма летняга чытання «Летом с книгой я дружу» (Мядзельская ДБ); праграмы «Памяць Міншчыны», «Спадчына», «Родная мова», «Сэрцам кут замілаваны» (Старадарожская ДБ); «Будуем храм у душах», «Чытаем, вучымся, гуляем», «Разам з кнігай мы расцём», (Капыльская ДБ); рэгіянальныя праграмы «Перекресток» , «Книга. Лето. Да здравствует библиотека!», «Дзеці. Сям'я. Бібліятэка», «Экалогія. Бібліятэка. Чалавек», «Библиотека без границ» (міласэрнасць), «Зямля мая, святая і адзіная» (краязнаўства), «Путь к духовности» (Мінскі р-н), «Край мой – гонар мой», «Школа дзіцячага чытання», «Ключы ад лета», «Здароўе ў нашых руках» (Смалявіцкая ДБ), «Я расту разам з кнігай» (Пухавіцкая ДБ), «Библиокроха», «Зялёныя дні ў бібліятэцы»: школа экалагічнай адукацыі «За Чтение, «Библиотечный классный час»; «У кніжак няма канікул» (аддзел па рабоце з дзецьмі Нясвіжскай ЦРБ імя П. Пранузы) і іншыя.

По цікавых праграмах і праектах працуе Уздзенская ДБ. Ужо другі год здзяйсняецца мэтавая праграма па рабоце з сям'ёй і падтрымцы сямейнага чытання «Островок семейного чтения». Шэраг мерапрыемстваў праграмы быў накіраваны на арганізацыю вольнага часу дзяцей, усебаковае іх развіццё з дапамогай кнігі. Праект па папулярызацыі беларускай дзіцячай кнігі «Літаратурны чацвер» спрыяе знаёмству юных чытачоў з сучаснымі айчыннымі пісьменнікамі; праект па прапагандзе кніжнага фонду «Книжка на гастролях» дае добрую магчымасць

паказаць фонд дзіцячай бібліятэкі ў населеных пунктах, якія абслугоўваюцца біблібусам; творчы праект «Мистер Мастер-класс» прадугледжвае павышэнне творчай актыўнасці ў навучэнцаў праз правядзенне ўрокаў творчасці, конкурсаў малюнкаў і самаробак. Праект па стварэнні інтэлектуальных і духоўных зносін у культурным асяроддзі «Весь год встречаем мы гостей» ставіць сваёй мэтай арганізацыю сустрэч з цікавымі людзьмі. У мэтах далучэння дашкольнікаў да чытання «Я не чытач – я толькі вучуся…» распрацаваны праект «2017 секунд чтения для дошкольников», які садзейнічае ранняму прывіццю ў дзяцей, патрэбы да кнігі, да чытання, фарміраванню і пашырэнню чытацкага кругагляду.

Дзяржынская ДБ працавала над рэалізацыяй культурна-адукацыйнага праекта «Сінематограф», разлічанага на дзяцей рознага ўзросту. Праект знаёміў дзяцей з лепшымі экранізаванымі творамі дзіцячай літаратуры. Дзеці паглядзелі старыя добрыя фільмы, такія як «Старик Хоттабыч», «Фантазёры», «Королевство кривых зеркал» і іншыя. Да кожнага прагляду было падрыхтавана бібліятэчнае мерапрыемства: «Па старонках дзіцячых кніг», бюро літаратурных навінак «Кніжкі знаёмыя і незнаёмыя», літаратурны дыліжанс «Пад ветразем дзяцінства». Дзеці маглі не толькі паказаць свае веды ў літаратуры, але і выконвалі розныя творчыя заданні: малявалі, складалі казкі, удзельнічалі ў пальчыкавым тэатры.

У аддзеле дзіцячай літаратуры Маладзечанскай ЦРБ імя М.Багдановіча стартаваў новы праект «Сторисек», для дзяцей старэйшай групы дзіцячага сада. «Сторисек» у перакладзе з англійскай мовы азначае «мех гісторый». Гэта сапраўдны палатняны мех, у сярэдзіне якога знаходзіцца добрая мастацкая ілюстраваная дзіцячая кніга з дадатковымі матэрыяламі: цацкамі, малюнкамі, аўдыёкасетамі або кампакт-дыскамі. Першай кнігай у праекце стала кніга «Рождество у крёстной» беларускай пісьменніцы А.Масла з размалёўкай, намаляваным анёлма, выцінанкай і DVD-дыскам з мультфільмам. «Мех гісторый» падарожнічае з адной сям'і ў другую. Ужо былі

сфарміраваны «мяхі гісторый» да кніг Э.Успенскага, В.Ляскоўскага і інш.

Супрацоўнікамі Мар'інагорскай гарадской бібліятэкі падрыхтаваны культурна-асветніцкі праект «Жыла-была кніга» з мэтай пазнаёміць дзяцей і падлеткаў з кніжна-асветніцкімі традыцыямі, паглыбіць уяўленне дзяцей аб працэсе стварэння кнігі.

Бібліятэчны праект «Пачытай-ка!» прапанавалі сваім чытачам бібліятэкары Рудзенскай дзіцячай бібліятэкі. Удзельнікам праекта мог стаць любы школьнік – для гэтага неабходна прачытаць як мага болей кніг, што дае шанц атрымаць у школе на адзін бал вышэйшую адзнаку за чвэрць па літаратуры. Ідэя спадабалася не толькі дзецям, але і настаўнікам – яны прыйшлі да высновы, што ўдзел у праекце падніме паспяховасць і дапаможа зрабіць вучням яшчэ адзін крок да поспеху.

Былі падведзены вынікі работы праграмы «Чытаем разам» па падтрымцы дзіцячага чытання ў горадзе Слуцку і Слуцкім раёне. За дзесяць гадоў яе існавання дзіцячы аддзел Слуцкай ЦРБ абагаціўся новымі ідэямі. Рэалізацыя праграмы чарговы раз пацвердзіла важнасць адукацыйнай і асветніцкай працы бібліятэкі, звярнула ўвагу на сацыяльную ролю чытання; паказала, што дзеці, нягледзячы на папулярнасць электронных СМІ, маюць патрэбу ў рэальных зносінах, жывым літаратурным слове.

У бібліятэчных працоўных планах трывалую прапіску атрымалі наступныя **акцыі**: «Сябруем з законамі», «Бяспечнае лета» (Валожынскі р-н), «Запрашаем у бібліятэку», «Аддам кнігу ў добрыя рукі», «Каб беларусам звацца, роднай мовы не трэба цурацца», «Мамін дзень у біблятэцы» (Бярэзінская ДБ); «Подари книгу библиотеке», «Валентинка читательских симпатий», «Каждый мальчик может стать солдатом», «Библиотека дарит улыбки», «Лучший читатель лета», «Павіншуем маму разам!», «Семейное чтение сближает поколения» (Уздзенская ДБ); «Вместе против алкоголизма и наркомании» (Клецкая ДБ), «Здзіві бацькоў, прачытай кнігу,

«Запішы сябра ў бібліятэку», «Прыйшоў сам, прывядзі сябра», «Прачытай любімую кнігу сваіх бацькоў» (Пухавіцкая ДБ) і іншыя.

Пры дзіцячых бібліятэках вобласці дзейнічаюць 359 аматарскіх аб'яднанняў і клубаў па інтарэсах.

Па цікавай праграме працуе клуб для дзяўчынак-падлеткаў «Дзявочыя сакрэты» пры Салігорскай ДБ, які займаецца арганізацыяй вольнага часу падлеткаў, дапамагае ў вызначэнні іх жыццёвых пазіцый. Тут адбыліся такія мерапрыемствы, як абмеркаванне кнігі Я. Хвалея «Прынцэса тусоўкі», гадзіна цікавых гісторый «Традиции моей семьи», дыскусія «Успешный человек – это…», гутаркі «Поговорим о коммуникабельности», «Необычайное превращение читателя в библиотекаря», творчыя вячоркі «Мир твоих увлечений».

У дзіцячай бібліятэцы г. Жодзіна плённа працуюць клубы выхаднога дня «Смешарики» і «Игротека в библиотеке», літаратурны клуб «В гостях у книги», клуб «Подросток», дзе выкарыстоўваюцца цікавыя формы работы з дзіцячым чытачом: мульт-тэрапія, тэатр ценяў, гульні-падарожжы, квэсты, віктарыны.

Клубы «У коле сяброў» (праграма «Путь к духовности»); эколага-краязнаўчы «Крыніца» (праграма «Зямля мая, святая і адзіная») і сямейны «7 Я» (праграма «Дети. Семья. Библиотека») паспяхова працуюць пры Заслаўскай ДБ.

Клуб «Чароўны ліхтарык» пры маладзечанскай бібліятэцы сямейнага чытання «Верасок» правёў наступныя мерапрыемствы: бібліядэсант сяброў «Рады мы всегда друзьям! Приглашаем в гости к нам», гістарычную вандроўку «Крутятся колёса…», літаратурную завалінку «Казачны куфэрак», пазнавальна-гульнёвую праграму «Правазнайка» і інш.

Для ўдзельнікаў гуртка «Чамучка» пры Старадарожскай ДБ прайшлі: краязнаўчае падарожжа «Міфы маёй зямлі», конкурсная праграма «Нами будет Родина гордиться»,

забаўляльная праграма «**В марте есть такой денёк**», інтэлектуальная гульня «Страницы календаря природы» і інш.

У рабоце бібліятэкі важнае месца займала **выставачная дзейнасць**.

Формамі арганізыцыі выстаў вылучалася бібліятэка сямейнага чытання «Верасок» (Маладзечанская ЦРБ). Гэта і выстава-парада, выстава-зварот, выстава-прапанова, інтэрактыўная выстава, выстава міні-мазаіка, выстава-рэпартаж, выстава-заклік, выстава-віншаванне і іншыя. Цікава і маляўніча была аформлена кніжная інсталяцыя «Поэзія – музыка слов» – у выглядзе «паравоза вясёлых вершаў», якія знаёмілі з творчасцю Агніі Барто, С. Маршака і іншых вядомых дзіцячых пісьменнікаў. Вершы размяшчаліся ў вокнах «паравозіка».

Асабліваю цікавымі былі выставы-агляды аддзела дзіцячага чытання Жодзінскай ЦГБ «Книги с именами», «Под парусом Валентина Катаева», выстава-шпаргалка «Школьная пора», хіт-парад кніг «Посмеёмся от души», выстава-слоўнік «Из копилки деда Литературоведа».

Заслугоўваюць увагі экспазіцыя «Не уйдёт из памяти война», інсталяцыя «Айболит, Мойдодыр и другие», фотавыстава «Пойман за чтением» (Капыльская ДБ).

Дзіцячыя бібліятэкі Міншчыны асаблівую ўвагу звярталі на чытацкае развіццё **дашкольнікаў і першакласнікаў**. Для сістэматычнай работы з гэтай узроставай групай складаецца праграма літаратурнага развіцця, арганізоўваецца школа маленькага чытача, праводзяцца пасвячэнні першакласнікаў у чытачы.

У рамках акцыі «Расцём з кнігай» супрацоўнікі Бярэзінскай ДБ на базе дзіцячых садкоў горада праводзілі дні рэкламы кніг і перыядычных выданняў з мэтай зрабіць кнігу альбо часопіс спадарожнікамі па жыцці кожнага дзіцяці. Для выхаванцаў дзіцячых садкоў праходзілі дні рэкламы кніг «Твая першая кніжка», «Моя любимая книжка», «Сказка для малышей», перыядычных выданняў «Лепшыя сябры дзяцей – часопісы», дзяцей запрашалі ў бібліятэку на экскурсіі «Чароўны свет бібліятэкі» з літаратурна-тэатралізаваным прадстаўленнем.

Вілейская РЦБ арганізавала пункты выдачы літаратуры ў дзіцячых садках. Пры бібліятэцы працуе гурток «Сонейка», дзе наладжваюць розныя мерапрыемствы для дзяцей малодшага ўзросту: пазнавальныя гадзіны, гульнёвыя і конкурсныя праграмы, літаратурныя віктарыны, лато, конкурсы малюнкаў.

Слуцкая ДБ прыняла ўдзел у правядзенні міжнароднай акцыі «Кніжка на далоньцы-2017», накіраванай на прыцягненне дзяцей дашкольнага ўзросту да чытання лепшых кніг сучасных дзіцячых пісьменнікаў.

Студыя развіваючага чытання «Я чытаю! Я расту!» пры Дзяржынскай ДБ аб'ядноўвае дашкалят. З вялікім задавальненнем дзеці кожную суботу спяшаюцца сюды, каб прыняць удзел у казачных вандроўках, цікавых рухомых і пазнавальных гульнях. Усе заняткі накіраваны на развіццё мовы дзіцяці.

У рамках школы чытання для дашкольнікаў «Я не чытач – я толькі вучуся…» распрацаваны праект «2017 секунд чтения для дошкольников» у Уздзенскай ДБ, які спрыяе ранняму далучэнню дзяцей да чытання, фарміраванню і пашырэнню чытацкага кругагляду, інтарэсаў і захапленняў дзяцей.

Нязменным поспехам у дашкольнікаў і малодшых школьнікаў карысталіся пастаноўкі лямцавага тэатра «Вандроўны куфэрачак» у дзіцячым аддзеле Барысаўскай ЦРБ ім. К.Х. Каладзеева.

Значнае месца ў арганізацыі работы бібліятэк вобласці займае абслугоўванне **сацыяльна неабароненых катэгорый дзяцей**.

Дзіцячыя бібліятэкі працуюць у цесным кантакце з цэнтрамі карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, удзельнічаюць у дабрачынных акцыях праграмы «Міласэрнасць», развіваюць абслугоўванне на даму.

Сацыяльных праграмы і праекты «Клопат» (Бярэзінская ДБ), «Вера. Надзея. Любоў», «Асаблівае дзіця» (Слуцкая ДБ), «Міласэрнаць» (Валожынская ДБ, Любанская ДБ, Старадарожская ДБ), «Библиотека без границ» (Заслаўская ДБ) «Свет роўных магчымасцей» (Салігорская ДБ), «Дадзім надзею

дзецям» (аддзел па рабоце з дзецьмі Вілейскай РЦБ) і іншыя накіраваны на забеспячэнне якаснага і паўнавартаснага атрымання бібліятэчных паслуг для груп дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі.

Каля дваццаці год бібліятэка сямейнага чытання «Верасок» супрацоўнічае з ЦКРНіР і адзяленнем дзённага знаходжання інвалідаў РТЦСАН з мэтай сацыяльнай адаптацыі інвалідаў, у тым ліку дзяцей. Для гэтай катэгорыі карыстальнікаў праводзяцца літаратурныя кірмашы, казачныя марафоны, гульні-вандроўкі, эрудыт-спаборніцтвы.

У рамках праграмы «Міласэрнасць» паспяхова працуюць Старадарожская і Любанская дзіцячыя бібліятэкі. З дапамогаю гадзін дабрыні, цікавых і шчырых размоў, літаратурна-пазнавальнах гульняў яны імкнуцца выхоўваць у дзяцей пачуццё міласэрнасці, дабрыні, спачування.

Дзіцячая бібліятэка Валожынскага раёна штогод праводзіць традыцыяйнщю акцыю «Ёлка жаданняў». Юныя наведвальнікі бібліятэкі заўсёды падтрымліваюць сваіх равеснікаў, якія сустракаюць зімовыя святы ў сацыяльным прытулку, прыносяць ім у падарунак цацкі, цукеркі, біжутэрыю, касметыку. У дзень інвалідаў сябры літаратурнага клуба «Кругагляд» наведалі сацыяльны прытулак і цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі для дзяцей-інвалідаў з забаўляльна-пазнавальнай праграмай «Дзеці – дзецям».

Да Дня інвалідаў Гарадзейскай гарпасялковай дзіцячай бібліятэкай (Нясвіжскі район) была праведзена дабрачынная акцыя «Мы рядом с вами», у рамках якой бібліятэкары наведалі школу-інтэрнат.

У Салігорскай ДБ надаецца вялікая ўвага дзецям-сіротам і дзецям, бацькі якіх пазбаўленыя бацькоўскіх правоў. Ужо шмат гадоў бібліятэка падтрымлівае цесную сувязь з раённым сацыяльна-педагагічным цэнтрам, дзе знаходзяцца дзеці. Для іх ладзяцца экскурсіі па бібліятэцы «Нам с книгой назначена встреча» і «Библиотека собирает друзей». Распрацаваны цыкл мерапрыемстваў «Дом, где согреваются сердца» з падарожжамі

па кнігах, паэтычнымі хвілінкамі, пазнавальна-гульнёвымі праграмамі, лялечнымі спектаклямі і інш.

Ва ўсіх бібліятэках арганізоўваліся мерапрыемствы, прымеркаваныя да Дня інвалідаў і да Міжнароднага дня абароны дзяцей.

Традыцыйна дзіцячыя бібліятэкі Міншчыны надавалі вялікую ўвагу масавай рабоце, што дазваляла змястоўна арганізаваць вольны час дзяцей, спрыяла фарміраванню культуры міжасобавых зносін.

У працы з дзіцячым чытачом бібліятэкі Міншчыны аддавалі належную ўвагу арыентацыі падрастаючага пакалення на духоўныя і агульначалавечыя каштоўнасці, фарміраванню патрыятызму, распаўсюджванню прававых ведаў і ведаў па ўзмацаванні здароўя, арганізацыю вольнага часу дзяцей і падлеткаў.

Абвешчанаму ў 2017г. Году навукі ў РБ прысвячаўся цыкл мерапрыемстваў у дзіцячых бібліятэках Міншчыны. З гэтай нагоды актывізавалася праца па падрыхтоўцы мерапрыемстваў, прысвечаных славутым дзеячам навукі, іх дасягненням. Збіралася і распаўсюджвалася інфармацыя пра перспектывы развіцця інавацыйных напрамкаў у навуцы, бібліятэкі падрыхтавалі асветніцкія праграмы, якія ўключалі кніжна-ілюстраваныя выставы «О науке – с увлечением и без скуки» і «В гостях у маленького профессора» (Уздзенская ДБ), «Наука – путь прогресса» (Пухавіцкая ДБ), «Наука чудеса творит» і «Молодежь – двигатель науки» (Заслаўская ДБ), «Науки разные нужны» (Любанская ДБ), «2017 – Год навукі» (Лагойская ДБ, Івянецкая гарпасялковая бібліятэка), «Год Навукі» (бібліятэка сямейнага чытання «Верасок», Дорская СБ), «Наука открывает тайны» (Старадарожская ДБ), «Науки разные нужны» (Любанская ДБ), «Дасягненні навукі ў нашым жыцці» (Гародзькаўская СБ), а таксама літаратурныя агляды «Я познаю мир», электронную прэзентацыю «Наука в современном мире» і віктарыны «Что я знаю о науке» (Любанская ДБ), «На перекрёстках научных открытий» (Салігорская ДБ), «Приглашаем к открытиям» (Нясвіжская ДБ) і інш.

У Івянецкай гарпасялковай бібліятэцы прайшла інфармацыйная гутарка «Лекар зямлі – Іван Іванавіч Ліштван»; у Дорскай сельскай бібліятэцы адбыліся інфармацыйная гадзіна «Тытан эпохі зараджэння электрычнасці», пазнавальная віктарына для дзяцей (да 170-годдзя з дня нараджэння Т.А. Эдзісана); вечар эрудытаў, «Чаму планета блакітная?»; экарэзананс «Каб зіма была зімой»; у Гародзькаўскай сельскай бібліятэцы – інфармацыйная гадзіна «Карусель изобретений».

Шмат цікавых мерапрыемтваў ладзілася ў Уздзенскай ДБ: інтэлектуальна-пазнавальная гульня «Науки разные нужны», пазнавальная гадзіна па старонках часопіса «Спросите мудрую сову», майстар-класс «Мыльная наука, или Эко-мыло своими руками», конкурс малюнкаў «Мир роботов глазами детей», гульнёвае падарожжа «Путешествие в Наукоград».

Для наведвальнікаў маладзечанскай бібліятэкі сямейнага чытання «Верасок» быў падрыхтаваны «касмічны» квэст пад назвай «У глыбінях космасу» з цікавымі конкурсамі. Удзельнікі квэста павінны былі авалодаць навыкамі арыентавання ў фондзе бібліятэкі, каб паспяхова прайсці ўсе этапы гульні, перамяшчаючыся па бібліятэцы з дапамогай «зорнай карты» і падказак, размешчаных на кніжных паліцах. У актавай зале размясціўся мабільны 3D-планетарый, былі паказаны фільмы пра даследаванне касмічнай прасторы, мультыплікацыйныя фільмы.

Цікавым было мерапрыемства для малодшых школьнікаў у ЦГБ г. Жодзіна «Воздушное путешествие, или Что такое воздушный шар» пра гісторыю стварэння паветранага шара.

На пошукі неразгаданых загадак адправіліся юныя нясвіжцы, складаючы пазнавальны пазл для маленькіх эрудытаў «Тайны. Загадки. Сенсации». Для старэйшых школьнікаў прайшла інтэлектуальная гульня «Што? Дзе? Калі?» па прадметах прыродазнаўчага цыкла і інфармдасье «Топ-10 научных достижений в Беларуси».

У Старадарожскай бібліятэцы да Года навукі прайшлі наступныя мерапрыемствы: конкурс знаўцаў «Азбука науки для юных гениев», гадзіна цікавых паведамленняў «Это умная

наука!», інтэлектуальная гульня «Знатоки науки», турнір знаўцаў «Наука больших чудес».

Чэрвеньская ДБ правяла цыкл навукова-папулярных гадзін «Удивительное и невероятное», «Экоград – город без отходов», «Тайная жизнь животных», «Земля неизвестная», «Таинственная и загадочная Вселенная», «По следам лесных изобретателей».

Салігорская ДБ прыняла ўдзел у інфармацыйна-адукацыйным праекце «Я адкрываю свет», накіраваным на развіццё інтэлектуальных здольнасцяў карыстальнікаў дзіцячага і падлеткавага ўзросту, прывіццё навыкаў самастойнай працы з кнігай і іншымі крыніцамі ведаў.

**Краязнаўчая дзейнасць** дзіцячых бібліятэк Міншчыны мае прыярытэтны напрамак у рабоце з юнымі чытачамі.

Афармленне ў інтэр'ерах бібліятэк краязнаўчых куткоў носіць паўсюдны характар, распрацоўваюцца краязнаўчыя праграмы для дзяцей, варыянты традыцыйных і электронных вандровак па Міншчыне, створаны краязнаўчыя клубы. Плённым з'яўляецца супрацоўніцтва бібліятэк з краязнаўчымі мясцовымі музеямі.

Цікавую інфармацыю даносяць юным чытачам кніжныя выставы, папкі краязнаўчых матэрыялаў «Гістарычнае мінулае горада», «Знакамітыя людзі раёна», «Народныя майстры раёна», «Іх імёны забыць не павінны», «Пісьменнікі – нашы землякі», «Адкуль у вёскі імя», «Гістарычны летапіс складае бібліятэка» і інш.

У бібліятэках афармлены куткі з беларускай сімволікай. Штогод праводзяцца мерапрыемствы да Дня Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь.

Добра арганізавана работа ў краязнаўчым напрамку ў дзіцячых бібліятэках Мядзеля, Дзяржынска, Пухавіч, Салігорска, Слуцка, Лагойска, Стаўбцоў, Маладзечна, Вілейкі, Барысава, Смалявіч, Заслаўя, Беразіно.

Па краязнаўчых праграмах «Памяць Міншчыны», «Спадчына», «Родная мова», «Сэрцам кут замілаваны» працуюць бібліятэкі Старадарожчыны, цікавай праграмай

«Зямля мая, святая і адзіная» вывучэння мінулага і сучаснасці роднага краю вылучаецца Заслаўская гарадская ДБ Мінскага раёна, заслугоўвае ўвагі імідж-праект «З думкаю пра Беларусь» дзіцячага аддзела Барысаўскай ЦРБ ім. К.Х. Каладзеева і інш.

Асэнсаванню гістарычнага шляху бацькаўшчыны, выхаванню гонару за сваю радзіму спрыяюць такія бібліятэчныя мерапрыемствы, як краязнаўчая гадзіна «И края в мире нет дороже, где довелось родиться нам», краязнаўчая скарбонка «Якая б доля ні спаткала, любіце спадчыну сваю…», літаратурная вандроўка «Квітней, красуй, дарагая мая Беларусь!», гістарычная гадзіна «Я в этом городе живу, я этот город знаю», агляд літаратуры «Любы дружа, вывучай беларускі родны край!».

Да 890-годдзя г. Клецка дзіцячая бібліятэка падрыхтавала гісторыка-краязнаўчую кампазіцыю «Край, дзе мы жывем», віртуальны экскурс «Вуліцы горада расказваюць», эколага-краязнаўчую эстафету «Не знойдзеш ты на ўсёй зямлі мілейшага за гэты край», інтэлектуальна-пазнавальнае шоў «Беларусам я завуся, родным краем ганаруся».

Цікава прайшла літаратурна-забаўляльная праграма «С Днём рождения, город» на свяце ў Капылі. Гульні і конкурсы зрабілі пляцоўку Капыльскай дзіцячай бібліятэкі папулярным месцам адпачынку капылян і гасцей горада. А вось знаёмства з запаведнымі куточкамі роднага краю адбывалася ў час гульні-падарожжа «З Несцеркам па Капыльшчыне».

Тыдзень краязнаўчых ведаў у Плешчаніцкай ДБ праходзіў пад назвай «Я час у субяседнікі клічу». Ён уключаў кніжную выставу «Нам засталася спадчына», гутарку «Пад крыламі родных сузор’яў», гадзіну краязнаўства «Застаюцца песня і Радзіма», выразнае чытанне «Вянок з параненых рамонкаў» (вайна ў гісторыі пасёлка).

Краязнаўчае падарожжа «Таямніцы гісторыі роднага краю» пазнаёміла юных наведвальнікаў Мядзельскай ДБ з літаратурай аб гістарычным мінулым роднага краю, яго традыцыях, гістарычных помніках. На свяце горада «Наш светлы дом адкрыты для гасцей» была праведзена віктарына «Я

люблю і ведаю свой горад». Удзельнікамі гістарычнага экскурса «У падарожжа праз імглу стагоддзяў» былі вучні старэйшых класаў.

Бібліятэкі Барысаўшчыны імкнуцца выхаваць у дзяцей любоў і павагу да сваёй малой Радзімы з дапамогай этнаграфічных экскурсій, вусных часопісаў, літаратурна-музычных кампазіцый, завочных падарожжаў, вечароў сустрэч, акцый, майстар-класаў, інфармацыйных аглядаў, гутарак, гадзін гісторыі, віктарын і інш. Для вучняў школ горада Барысава і Барысаўскага раёна адбылася навукова-практычная краязнаўчая канферэнцыя «Вайна 1812 года вачыма новага пакалення». Адметнай рысай гэтай, трэцяй па ліку, канферэнцыі стала тое, што ўпершыню самай юнай удзельніцай была школьніца 3 класа ДУА «СШ № 13 г. Барысава» Сцяпура Вольга з дакладам у вершаванай форме і ў суправаджэнні фрагментаў з мастацкіх фільмаў і музыкі. У краязнаўчай канферэнцыі прынялі ўдзел не толькі школьнікі і настаўнікі, але і ўніфармісты Віцебскага пяхотнага і Азоўскага пяхотнага палкоў.

У рамках рэалізацыі імідж-праекта «З думкаю пра Беларусь» (дзіцячы аддзел Барысаўскай ЦРБ ім. К.Х. Каладзеева) бібліятэкар-краязнаўца А. А. Смірнова правяла для дзяцей і падлеткаў шэраг краязнаўчых мерапрыемстваў, якія былі прысвечаны гісторыі горада Барысава, яго прамысловасці і культуры. Вялікай цікавасцю ў дзяцей карысталіся слайд-гутаркі «У кожнага ёсць любімы горад на зямлі», «Халакост – памяць без тэрміну даўніны», «Барысаў – горад-загадка мінулых стагоддзяў». Этнаграфічныя заняткі, сустрэчы з народнымі ўмельцамі і экскурсіі па экспазіцыі «Бабуліна спадчына» сталі ўжо неад’емнай часткай працы дзіцячага аддзела бібліятэкі.

У рамках мэтавай праграмы «Вяртанне да вытокаў» Ракаўская сельская бібліятэка (Валожынскі р-н) займалася папулярызацыяй твораў беларускіх аўтараў.

Краязнаўчы клуб «Крынічанька», які дзейнічае пры Крупскай дзіцячай бібліятэцы, праводзіў краязнаўчыя круізы, гульні-падарожжы, гадзіны краязнаўства, гадзіны гістарычных ведаў і інш.

Бібліятэкары вобласці ўсведамляюць сваю ролю ў захаванні і адраджэнні нацыянальных духоўных каштоўнасцяў. Важкім унёскам у справу вяртання да жыцця нацыянальных традыцый з'яўляюцца шматлікія мерапрыемствы бібліятэк, наладжаныя да святкавання Каляд, Купалля, Масленіцы і інш., прысвечаныя роднай мове – «Святло роднага слова», «На мове, сэрцу зразумелай», «Любі, шануй, ведай роднае слова», «З роднай мовай дзень за днём», «Твае першыя кніжкі па-беларуску» і інш.

Дзіцячы аддзел Барысаўскай ЦРБ ім. К.Х. Каладзеева прымаў удзел у сацыяльна-адукацыйным праекце «Чытаем па-беларуску з velcom». Галоўная задача праекта – папулярызацыя беларускай мовы і літаратуры сярод малодшых школьнікаў. Інтэрактыўны ўрок беларускай мовы ў бібліятэцы для 70 школьнікаў горада правяла пастаянная настаўніца праекта – пісьменніца-казачніца Алена Масла і тэлевядучы Юрый Жыгімонт.

Вялікую ўвагу ў сваёй дзейнасці дзіцячыя бібліятэкі надаюць **патрыятычнаму выхаванню**, **фарміраванню грамадзянскай актыўнасці моладзі**. На працягу года праводзіліся разнастайныя мерапрыемствы, накіраваныя на фарміраванне ведаў пра гісторыю краіны, прыцягненне ўвагі да подзвігаў яе герояў, дасягненняў выдатных людзей нашага краю.

Захаванню памяці аб гераічным мінулым садзейнічаюць падарожжы да помнікаў, гадзіны ваеннай паэзіі, сустрэчы з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, урокі памяці, мітынгі. У бібліятэках вобласці праводзіліся ўрокі мужнасці, тэматычныя выставы і агляды літаратуры, турніры будучых воінаў, мультымедыйныя прэзентацыі.

Бібліятэкары вёсак актыўна выкарыстоўвалі і іншыя формы мерапрыемстваў. Гэта паходы і экскурсіі да месцаў былых баёў, да брацкіх захаванняў, а таксама аказанне чытачамі-дзецьмі шэфскай дапамогі ўдзельнікам вайны і іх сем'ям.

Міжнародны дзень памяці ахвяр фашызму, Дзень юнага героя-антыфашыста, Міжнародны дзень памяці воінаў і ахвяр Першай Сусветнай вайны, Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, Дзень абаронцы Айчыны, Дзень Перамогі, Дзень смутку і памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны годна адзначаюцца ў бібліятэках вобласці. Старанна падрыхтаваны супрацоўнікамі інфармацыйны матэрыял – слайды, фотаздымкі, ролікі і фільмы аб Вялікай Айчыннай вайне – неад'емная частка ўсіх мерапрыемстваў.

Бібліятэкі Мінскай вобласці надаюць значную ўвагу **прапагандзе беларускай літаратуры, творчасці пісьменнікаў-землякоў, мастакоў**, стараюцца як мага шырэй адзначыць юбілейныя даты літаратурнага календара.

Справаздачны год быў багаты на юбілейныя даты ў літаратурным жыцці краіны.

У гонар **135-годдзя з дня нараджэння народных паэтаў Беларусі Я.Купалы і Я.Коласа**, для вывучэння іх багатай спадчыны ў бібліятэках рэгіёна арганізоўваліся кніжна-ілюстраваныя выставы «Хата, поўная гасцей», (Дзяржынская ДБ), «Песняры зямлі беларускай», «Таленту нязгаснае святло» (Клецкая ДБ), «Волаты беларускай літаратуры» (Заслаўская ДБ), слайд-экспедыцыя «Іх творы – крыніца жывая»(бібліятэка сямейнага чытання «Верасок»), «Душа народа ў творах жыве»(Старадарожская ДБ), «І зноў сябе я пазнаю часцінкай злітаю вялікага сусвету» (Стаўбцоўская ДБ) і інш.

Увазе юных случчан была прапанавана кніжная экспазіцыя «Родныя песні». На яе прэзентацыі прысутнічала член Саюза пісьменнікаў Беларусі Ганна Міклашэвіч. У міні-музеі «Беларуская хатка» адбыліся гучныя чытанні для дашкольнікаў і малодых школьнікаў «Дзядзька Янка, добры дзень!» і «Казкі, вершы, апавяданні дзядулі Якуба». Увагу чытачоў прыцягвала невялічкая выстава адной кнігі, прысвечаная паэме Я. Коласа «Новая зямля», падмацаваная тэатральнымі эцюдамі па творы песняра, якія былі пастаўлены ўдзельнікамі лялечнага тэатра «Бураціна». Віртуальную выставу з творамі класікаў можна знайсці на сайце дзіцячага аддзела

«Кніжны квартал у лабірынце горада» (дзіцячы аддзел Слуцкай РЦБ).

Адным з яркіх мерапрыемстваў Стаўбцоўскай ДБ стала адкрыццё выставы «Чароўны свет аўтографа», прысвечанай 135-годдзю Якуба Коласа. На гэтай выставе было прадстаўлена больш за сто выданняў з асабістай бібліятэкі былога загадчыка аддзела культуры Стаўбцоўскага райвыканкама А.В. Грэкава. На кожнай з гэтых кніг пакінулі свае аўтографы вядомыя пісьменнікі, артысты, пракладчыкі з Беларусі, Расіі, Украіны, краін Балтыі, і іншых былых рэспублік СССР. А ў час святкавання 135-годдзя Я. Коласа бібліятэка атрымала падарунак ад расійскіх пісьменнікаў – пераклад на рускую мову паэмы «Сымон-музыка» і некалькі выданняў беларускіх аўтараў у перакладзе на рускую мову. Цікавай адбылася выстава, прысвечаная сынам Якуба Коласа – Данілу, Юрыю і Міхасю. «Мае мілыя качанчыкі» – менавіта так называў Колас сваіх дзяцей, звяртаючыся да іх у лістах. На выставе былі прадстаўлены малавядомыя фотаздымкі з каментарыямі пісьменніка, артыкулы з газет і часопісаў пра жыццё сыноў Коласа, іх захапленні.

Займальна і пазнавальна прайшлі мерапрыемствы Клецкай ДБ: конкурс чытальнікаў твораў Я. Купалы і Я. Коласа «Нам засталася спадчына», падарожжа па казках Купалы «А пачнем мы казку так…», вечар-партрэт «Песняры народных дум».

Аддзел абслугоўвання дзіцячага чытача Дзяржынскай РЦБ правёў для малодшых школьнікаў паэтычнае кола «А пачнем мы вершык так…» па творах знакамітых песняроў. Цыкл гадзін каментаванага чытання «Пра тое не ведаюць людзі: перачытваючы творы Я. Коласа» і гадзіна знаёмства на адкрытай пляцоўцы «Як на свет нарадзіўся Янка» былі прапанаваны ўвазе юных чытачоў у рамках праграмы летняга чытання «Лета пад кніжным парасонам» .

На слайд-экспедыцыю «Заўсёды з намі Купала і Колас», прысвечаную 135-годдзю з дня нараджэння Я. Коласа і Я. Купалы, запрасілі юных маладзечанцаў супрацоўнікі біліятэкі

сямейнага чытання «Верасок». Конкурс чытальнікаў «Чытаем Коласа і Купалу разам» праходзіў у рамках XVII Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2017».

Купалаўскія чытанні «Славуты пясняр беларускага народа» адбыліся ў Старадарожскай дзіцячай бібліятэцы, у рамках якіх былі праведзены літаратурны вернісаж «Прымі паклон ад нас, пясняр!», падарожжа па кнігах «І не змоўкнуць ніколі Купалавы словы», мастацкая гадзіна па творчасці Я. Купалы «На кожнай сцяжынцы яго песня і голас». На Каласавінах «Яскравае Коласа слова» для юных наведвальнікаў бібліятэкі падрыхтавалі творчы партрэт народнага паэта «Як песня народа – неўміручы наш Колас», агляд літаратуры «Волат беларускага слова», вандроўку па Коласаўскіх мясцінах «Сэрца пакідаю вам».

Змястоўна і запамінальна прайшла інфармацыйная гадзіна да 135-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы «І свята захаваем у сваім сэрцы памяць» (Любанская ДБ).

У Старадарожскай дзіцячай бібліятэцы аматарскае аб’яднанне «Первоцвет» прысвяціла 135-годдзю Я. Купалы і Я. Коласа пасяджэнне «Крыніцы натхнення: Купала, Колас, мастацтва».

Падчас гутаркі «Дарогамі Янкі Купалы і Якуба Коласа. Дачыненні вялікіх творцаў да Ракаўшчыны» бібліятэкары Ракаўскай СБ (Валожынскі р-н) раскрылі прысутным цікавыя звесткі аб тым, што бацькі Янкі Купалы працавалі ў Паморшчыне, а Якуб Колас адпачываў у вёсцы Палачанка Ракаўскага сельсавета.

Усе бібліятэкі Міншчыны аддалі належную ўвагу ўшанаванню памяці народных паэтаў Беларусі.

Шэраг бібліятэчных мерапрыемстваў быў прымеркаваны да юбілеяў М. Танка (105-годдзе з дня нараджэння), Я. Брыля (100-годдзе з дня нараджэння), І. Пташнікава (85-годдзе з дня нараджэння), Алены Васілевіч (95-годдзе), Р. Баравіковай (70-годдзе) і інш.

На Случчыне традыцыйны характар набываюць Віткаўскія чытанні. У справаздачным годзе на Х Віткаўскіх чытаннях маленькія чытачы сустрэліся з паэтам, лаўрэатам прэміі часопіса «Вясёлка» імя В. Віткі Міхасём Пазняковым. А ўдзельнікі чытацкіх конкурсаў «Жыў на свеце дзед Васіль» і «Жывая класіка» наведалі рэдакцыю часопіса «Вясёлка» і прынялі ўдзел у літаратурнай вечарыне «Чараўнік з краіны маленства», якую падрыхтавала дзіцячая бібліятэка №6 імя В. Віткі г. Мінска. Падчас паездкі юныя случчане сустрэліся з пісьменнікам У. Ліпскім, паўдзельнічалі ў квэсце ў музеі часопіса, які правёў для іх драматург, рэжысёр, супрацоўнік «Вясёлкі» Васіль Дранько-Майсюк.

У горадзе Маладзечна адбыўся 17 Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі. У Міжнародны дзень абароны дзяцей да школьнікаў, якія сабраліся ў бібліятэцы, прыехалі дзіцячыя пісьменнікі Мікола Чарняўскі, Алена Стэльмах, Тамара Бунта, Уладзімір Мазго, каб сустрэцца з прыхільнікамі свайго таленту. У рамках праекта «Залаты ўзрост» у бібліятэцы сямейнага чытання «Верасок» прайшла сустрэча з рэдкалегіяй жаночага часопіса «Алеся». Сярод гасцей мерапрыемства прысутнічалі галоўны рэдактар часопіса Ларыса Ракоўская, знакамітая беларуская пісьменніца Людміла Рублеўская і паэт, выканаўца ўласных песень Алесь Камоцкі.

Фестываль паэзіі імя Паўлюка Пранузы, які аддзел па рабоце з дзецьмі Нясвіжскай ЦРБ арганізаваў ужо другі раз, уключаў конкурс чытальнікаў «Чытаем Паўлюка Пранузу». У конкурсе прынялі ўдзел юныя аматары паэзіі.

Бярэзінская дзіцячая бібліятэка праводзіла акцыі па прапагандзе кнігі, чытання, нацыянальнай культуры і літаратуры сярод школьнікаў. З мэтай заахвочвання дзяцей і падлеткаў да чытання ў бібліятэцы дзейнічаюць клубы «Казка» , «Падлетак», лялечны гурток « Пятрушка».

Праект па папулярызацыі беларускай дзіцячай кнігі «Літаратурны чацвер» у Узденскай ДБ развівае літаратурна-мастацкі густ юных чытачоў, спрыяе папулярызацыі кнігі, знаёмству з сучаснымі айчыннымі пісьменнікамі.

2017 год у Беларусі прайшоў пад знакам **500-годдзя беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання**, пачатак якому паклаў слынны сын Беларусі **Францыск Скарына**.

Да гэтай велічнай даты ў бібліятэках Міншчыны былі разгорнуты тэматычныя паліцы і кніжныя выставы: «Кніжная мудрасць стагоддзяў» (Уздзенская ДБ), «З кнігай праз стагоддзі і краіны» і «З Полацку родам» (аддзел абслугоўвання дзіцячага чытача Дзяржынскай ЦРБ), «Не знікне цуд прыгожага пісьменства» (маладзечанская бібліятэка сямейнага чытання «Верасок»), «Аз і Букі – аснова навукі» (Заслаўская ГДБ), «Цуд, імя якому кніга!»(Чэрвеньская ДБ) і іншыя.

Заслугоўвае ўвагі выстава-інсталяцыя «З кнігай праз стагоддзі і краіны» аддзела абслугоўвання дзіцячага чытача Дзяржынскай ЦРБ. Падчас наведвання гэтай выставы юныя чытачы знаёміліся з прэзентацыяй «Казка пра кніжку», ўбачылі пісьмёны на камні, на гліне, на бяросце, папірусе. Вялікую цікавасць выклікалі ў дзяцей факсімільныя выданні «Слуцкае Евангелле» і «Полацкае Евангелле». На прэзентацыі выставы выкарыстоўваліся розныя інтэрактыўныя формы. Бібліятэкай сумесна з Дзяржынскім раённым аб’яднаннем прафсаюзаў сярод дзяцей і падлеткаў быў аб’яўлены конкурс малюнкаў «Беларуская кніга – крыніца натхнення», прысвечаны беларускаму кнігадрукаванню.

Уздзенская дзіцячая бібліятэка да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання правяла вусны часопіс «Спачатку было слова…», пазнавальны ўрок «Урокі пра Скарыну для маленькіх», прадэманстравала відэаролік «Першадрукар».

Вельмі цікава прайшла гадзіна гісторыі «Нам кніжку падарыў Ф. Скарына» у Любанскай ДБ.

«Псалтыр, першая кніга Скарыны – 500 гадоў таму» – такую назву меў гістарычны экскурс у Заслаўскай ГДБ.

«Кніжная спадчына Францыска Скарыны» – так называлася гістарычнае падарожжа, якое адбылося ў бібліятэцы сямейнага чытання «Верасок» да 500-годдзя усходнеславянскага кнігадрукавання. Вучні прынялі ўдзел у віктарыне «Ён першы кнігу даў славянам». Супрацоўнікі

бібліятэкі падрыхтавалі самаробную кніжку-гармонік пад назвай «Верасок», у якой сабралі творы юных чытачоў бібліятэкі.

З нагоды 500-годдзя беларускага кнігадрукавання прайшлі цікавыя мерапрыемствы ў Валожынскай дзіцячай бібліятэцы: інфармацыйная гадзіна ««Псалтыр» Скарыны – дар нашчадкам», бібліягадзіна з мультымедыйнай прэзентацыяй «Ад Скарыны да нашых дзён»(да Дня беларускага пісьменства і друку), віртуальнае падарожжа па Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі «Скарбніца беларускай навукі». Супрацоўнікі раённага краязнаўчага музея падрыхтавалі гістарычны экскурс і мультымедыйную прэзентацыю «Помнікі пісьменства – люстэрка эпохі».

Традыцыйным стала правядзенне ў пачатку верасня Тыдня беларускага пісьменства і друку. Кожны год вызначаецца горад, які прымае гасцей свята – дзеячаў культуры, беларускіх пісьменнікаў, выдаўцоў, журналістаў. Наладжваюцца кніжныя выставы, гадзіны інфармацыі і гісторыі, літаратурныя чытанні, марафоны прыказак і прымавак, урокі-прэзентацыі, гістарычныя панарамы. Свята–2017 адбылося ў Полоцку.

Любімаму дзіцячаму часопісу «Вясёлка» ў справаздачным годзе споўнілася 60 гадоў. Дзіцячыя бібліятэкі вобласці пастараліся як мага шырэй адзначыць гэтую слаўную дату праз кніжныя выставы, акцыі, прэзентацыі, падарожжы, віктарыны па старонках адзінага ў краіне беларускамоўнага часопіса для дзяцей.

У бібліятэцы сямейнага чытання «Верасок» дзейнічала кніжна-часопісная выстава «Свята колераў «Вясёлкі». Чытачы рашалі крыжаванкі, выконвалі заданні з часопіса, выдадзенага ў 1971 годзе.

У рамках раённага праекта «Рунь» Любанская дзіцячая бібліятэка прымала ўдзел у свяце «Кніга збірае сяброў», якое праходзіла ў гарадскім парку культуры і адпачынку. Адна з пляцовак – «Альтанка для чытанкі» сустракала беларускага дзіцячага пісьменніка, галоўнага рэдактара часопіса «Вясёлка» У.С. Ліпскага. Усе чытачы, ад самага маленькага да дарослага,

былі вельмі ўражаны сустрэчай. Пісьменнік пазнаёміў дзяцей са сваёй творчасцю, з першых хвілін авалодаўшы ўвагаю дзясяткаў цікаўных тварыкаў.

Для юных наведвальнікаў Бярэзінскай ДБ адбыўся дзень дзіцячага часопіса «У госці да «Вясёлкі».

**Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі** заўсёды спрыяе папулярызацыі кнігі і чытання. У кожнай бібліятэцы была распрацавана ўласная насычаная, яркая, цікавая праграма мерапрыемстваў. Юным чытачам прапаноўваліся падарожжы па старонках любімых кніг, літаратурна-пазнавальныя гульні, віктарыны, сустрэчы з пісьменнікамі, творчыя конкурсы юных мастакоў і літаратараў, святы і прэзентацыі кніг, тэатралізаваныя сустрэчы з літаратурнымі героямі, лялечныя спектаклі.

Аддзел па рабоце з дзецьмі Вілейскай РБ прысвяціў першы дзень Тыдня «Дзеці чытаюць Купалу і Коласа» песняру беларускага народа «З Купалам у сэрцы жывем». Затым адбылося падарожжа ў краіну яе Вялікасці Кнігі «Слава кніжцы беларускай», свята часопіа «Вясёлка – юбілярка» і інш.

Экскурсіі па бібліятэцы, квэсты, літаратурныя сустрэчы, гульні і конкурсы надоўга запомняцца юным чытачам Дзяржынскага раёна. Кожны дзень Тыдня быў прысвечаны сваёй тэме. У «казачны аўторак» бібліятэкары запрасілі чытачоў у экспедыцыю «Новыя кнігі. Новыя прозвішчы» і на сустрэчу з беларускай пісьменніцай Тамарай Бунта. У «чамучкаў чацвер» была падрыхтавана літаратурная гульня «Кніжчыны сакрэты» і квэст «В поисках заколдованных букв», а ў «юбілейную серад» адбыўся бенефіс літаратурных герояў «Айбаліт і Бармалей адзначаюць юбілей».

Яркім тэатралізаваным прадстаўленнем пад назвай «Книг заветные страницы» адкрыўся Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі ў Клецкай ДБ. Прывітаць юных чытачоў прыйшлі казачныя героі Шапакляк, Баба-яга, Нязнайка, доктар Айбаліт. Пазналі школьнікі і гарэзлівую гераіню кнігі Астрыд Ліндгрэн Пэпі Доўгаяпанчоха. Разнастайныя гульні правялі з дзецьмі любімыя персанажы Карлсан і Паштальён Печкін.

Цікавым было ўрачыстае адкрыццё Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі «Краіна Чытландыя» ў Смалявіцкай ДБ. Юныя ўдзельнікі студыі сучаснага і бальнага танца «Шарм» пачалі мерапрыемства. А ў госці да дзяцей прыйшлі дзіцячыя пісьменнікі М. Васілеўскі і Д. Юртаеў у вобразах літаратурных персанажаў – Міколы Васілька і Змітрака Бурачка. Разам з дзецьмі яны зладзілі сапраўдны «Вясёлы перапалох», у якім знайшлося месца і жартоўным вершам, і гарэзным жартам.

У Мар’інагорскай гарадской бібліятэцы «Тыдзень радаснага чытання» даў старт культурна-асветніцкаму праекту «Жыла-была кніга», у межах якога дзеці знаёміліся з гісторыяй кнігадрукавання, пабывалі ў гасцях у Францыска Скарыны, сталі ўдзельнікамі літаратурна-творчага марафона па творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа.

У Пухавіцкай сельскай бібліятэцы Тыдзень дзіцячай кнігі праводзіўся пад дэвізам «Карагод цудоўных кніжак». Бюро інфармацыйных знаходак «Край свой родны абыйду, скарбы розныя знайду» адкрывала таямніцы гісторыі роднага краю, гульнёвая праграма «Каскад літаратурных задавальненняў» прапаноўвала дзецям адказаць на пытанні інтэрактыўнай відэавіктарыны «Казка, я цябе ведаю».

Бібліятэкі Валожынскага раёна працавалі па сваіх праграмах Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі: «Добрыя кнігі – сябры назаўжды» (Валожынская ДБ), «Без кнігі нельга жыць на свеце» (Гародзькаўская СБ), «Чароўная кніжка» (Дорская СБ) і іншыя.

Тыдзень дзіцячай кнігі ў Валожынскай дзіцячай бібліятэцы быў насычаны цікавымі і пазнавальнымі мерапрыемствамі. Гэта і «паэтычная серада» «Песняры зямлі беларускай», і «загадкавы чацвер» «Вясновыя таямніцы», і «літаратурная пятніца» «Слова роднае – вечнасці след», і «вясёлая субота» «Шутки, песни, сладости нам прибавят радости», у якіх бралі ўдзел выхаванцы дзіцячых садкоў і сацыяльнага прытулку, наведвальнікі аздараўленчых пляцовак школ горада. Гасцямі «літаратурнай пятніцы», прысвечанай 135-годдзю з дня нараджэння класікаў беларускай літаратуры Янкі

Купалы і Якуба Коласа, былі ўдзельнікі народнага літаратурна-мастацкага аб’яднання «Рунь» раённага цэнтра культуры, члены СПБ Валянціна Гіруць-Русакевіч, Марыя Шакун, Галіна Радына-Марцінкевіч.

Краязнаўчае відэападарожжа «Дзівосны свет Налібоцкай пушчы» дало вучням магчымасць бліжэй пазнаёміцца з прыроднымі асаблівасцямі расліннага і жывёльнага свету Налібоцкага краю.

Цікавай і насычанай была праграма «Дзень нараджэння кнігі» ў Заслаўскай ДБ.

На свята «**Праздник королевы Книги»**, якое адбылося ў Салігорскай ДБ, завітала з цікавай гульнёвой праграмай супрацоўніца часопісаў «Вясёлка» і «Буся» Казлякевіч А. А. Весці праграму ёй дапамагаў галоўны герой часопіса бусляня Буся. А галоўным падарункам ад рэдакцыі часопіса «Вясёлка» стала запрашэнне ўдзельнічаць у праекце «Пошта Бусі».

«Весёлая книжная радуга детства», пад такой назвай прайшоў Тыдзень дзіцячай кнігі ў аддзеле па рабоце з дзецьмі Нясвіжскай ЦРБ. Адкрыццё Тыдня прайшло пад дэвізам «Шумець у бібліятэцы дазваляецца!» У госці да юных чытачоў прыехалі пісьменнікі Яна Явіч і Дзмітрый Юртаеў. Дзеці былі не пасіўнымі гледачамі, а актыўнымі ўдзельнікамі займальнай тэатралізаванай дзеі.

«Такие разные сказки» – пад такой назвай праходзіла тэатралізаваная гульнёвая праграма ў Гарадзейскай гарпасялковай дзіцячай бібліятэцы. Гледачы сустрэліся з любімымі літаратурнымі героямі і прынялі ўдзел у конкурсах і віктарынах.

У «Дзень беларускай літаратуры» (Чэрвеньская ДБ) адбылася сустрэча чытачоў з пісьменнікам Генадзем Аўласенкам. Да сустрэчы з аўтарам была прымеркавана кніжная выстава «Літаратурная мазаіка твораў Г.Аўласенкі».

Тыдень дзіцячай кнігі і музыкі ў Плешчаніцкай ДБ меў назву «Встречи в литературной галактике», у Лагойскай ДБ – «Книжкины именины», у Мядзельскай ДБ – «Нам кніга свята падарыла», у Крупскай ДБ – «Здравствуй, Книжкина неделя»**.**

У першы дзень лета дзіцячыя бібліятэкі Міншчыны далучаюцца да святкавання Міжнароднага дня абароны дзяцей. Юныя наведвальнікі бібліятэк з задавальненнем удзельнічаюць у забаўляльных літаратурных гульнях, у розных конкурсах, пазнавальных праграмах, квэстах.

На пачатку лета дзіцячыя бібліятэкі вобласці становяцца месцам арганізаванага адпачынку школьнікаў, прапануюць дзецям разнастайны і змястоўны занятак.

Зрабіць адпачынак больш актыўным, карысным дапамагалі летнія праграмы чытання «Большая перемена» (Крупская ДБ), «Лето новых затей, время новых друзей» (Уздзенская ДБ), «Захотел развеять скуку – протяни за книгой руку» (Плешчаніцкая ДБ), «Летом с книгой я дружу» (Мядзельская ДБ), «Лета, кнігі, я – сябры!»(Смалявіцкая ДБ), «Вместе весело читать» (аддзел па рабоце з дзецьмі Вілейскай РЦБ), «На кніжнай палянцы нашага лета»(Пухавіцкая ДБ), «Летняе падарожжа з кнігай» (бібліятэка сямейнага чытання «Верасок»), «Лета не для суму» (Любанская ДБ), «Лета з добрай кнігай» (Бярэзінская ДБ), «Лета пад кніжным парасонам» (аддзел абслугоўвання дзіцячага чытача Дзяржынскай ЦРБ), «Солнце на книжной странице» (дзіцячы аддзел Барысаўскай ЦРБ ім. К.Х. Каладзеева) і інш.

Пазнавальныя гадзіны, урокі бяспекі, відэакруізы, літаратурныя падарожжы, конкурсы на лепшых знаўцаў казак, віктарыны і іншыя мерапрыемствы пазіцыяніруюць дзіцячыя бібліятэкі Мінскай вобласці месцам чытання, цікавых і карысных зносін.

У рэспубліканскай акцыі ў падтрымку чытання «Лета з добрай кнігай» прынялі ўдзел біблятэкі Нясвіжскага раёна.

Юныя жодзінцы ўдзельнічалі ў бібліямарафоне «Библиотека стала сказкой», дзе дзеці разам з казачнымі героямі не толькі спаборнічалі ў розных конкурсах, але і паказалі добрае веданне казак.

На працягу некалькіх гадоў у Пухавіцкай ДБ дзейнічае клуб аматараў казкі «Чароўны куфэрак», які працуе па мэтавай праграме «Я расту разам з кнігай». Цікавым было свята,

прысвечанае А.С. Пушкіну «Падарожжа па Лукамор’і» і прэзентацыя праграмы летняга чытання «У гасцях у лета».

Пры Смалявіцкай ДБ працуе гурток выхаднога дня «Сонейка». Асноўны напрамак клуба – дзейнасць па арганізацыі вольнага часу. На занятках дзеці майструюць самаробкі, чытаюць казкі, малююць. У справаздачным годзе ў рамках пасяджэння гуртка выхаднога дня «Сонейка» ў дзіцячай бібліятэцы прайшлі наступныя мерапрыемствы: майстар-класы «Цветы своими руками», «Игрушки из фетра», бібліятэчная гадзіна «Путешествие в книжный дом», а таксама праводзіліся заняткі па рамонту кніг «Книжкина больница».

У рамках праграмы летняга чытання аддзела абслугоўвання дзіцячага чытача Дзяржынскай ЦРБ прайшла акцыя «Читающая скамейка», якая таксама была накіравана на актывізацыю чытання ў летні перыяд не толькі дзяцей, але і дарослых.

Вынікі летніх конкурсаў дзіцячыя бібліятэкі падводзілі на літаратурных святах «Лета з кнігай!», «Детство – чудная пора» і інш. Штогадовыя летнія праграмы пацвердзілі сваю запатрабаванасць у дзіцячага чытача.

Не застаецца ў баку ад бібліятэчнага жыцця і такі сацыяльны інстытут, як сям’я. Бібліятэкі дапамагаюць бацькам і іх дзецям у вырашэнні праблем сямейнага выхавання, у арганізацыі змястоўнага правядзення вольнага часу. У бібліятэках выдзелены тэматычныя паліцы па пытаннях сям’і, пастаянна афармляюцца кніжна-ілюстраваныя выставы «Чытаем разам з бацькамі», «Бацькоўскі дом – усяго пачатак», «Духовные ценности семьи», «Сям’ю яднае мудрасць кніг» і інш.

Пры пашырэнні сацыяльных функцый сёння дзіцячыя бібліятэкі Мінскай вобласці выкарыстоўваюць больш актыўныя формы ўзаемадзеяння з юным чытачом праз традыцыйныя сямейныя святы, бацькоўскія гадзіны, клубы сямейных зносін, дні дабрыні, калейдаскопы сямейных гісторый і, нарэшце, бібліятэкі сямейнага чытання.

Добрыя напрацоўкі мае Валожынская дзіцячая бібліятэка, якая распрацавала і здзяйсняе мэтавую праграму па прапагандзе

і падтрымцы чытання дзяцей дашкольнага і малодшага шклльнага ўзросту «Чытанне адкрывае свет» (2016 -2017 гг.).

Валожынская ДБ супрацоўнічае з СПЦ, на базе якога дзейнічае адукацыйная пляцоўка «МАМА-КІДС». Мамы, якія знаходзяцца ў сацыяльным дэкрэтным адпачынку, разам з дзеткамі прыходзяць у бібліятэку па аўторках. Для іх праводзяцца экскурсіі па бібліятэцы, прагляды літаратуры, выступленні лялечнага гуртка, гульнёва-забаўляльныя мерапрыемствы, урокі творчасці, буккросінгі, выпускаюцца памяткі для бацькоў.

Івянецкая гарпасялковая бібліятэка цесна працуе з маладымі сем’ямі, для якіх праводзяць такія мерапрыемствы, як прэзентацыя «Чытайце дзецям не натацыі, а вясёлыя кнігі», літаратурны вечар «Сям’я і кніга – разам назаўжды». Мамы і таты разам з дзецьмі ўдзельнічаюць у розных гульнях і конкурсах, наведваюць з любоўю аформленую выставу малюнкаў «Святло сям’і».

Шукаюць і знаходзяць цікавыя формы работы з сям'ёй Дзяржынская, Старадарожская, Барысаўская, Уздзенская, Мядзельская, Маладзечанская, Валожынская бібліятэкі.

Ужо другі год Уздзенская дзіцячая бібліятэка працуе па мэтавай праграме падтрымкі сямейнага чытання «Островок семейного чтения» (2016-2021 г.г.). Шэраг мерапрыемстваў быў накіраваны на азнаямленне бацькоў і дзяцей з бібліятэкай, светам ведаў і казак, на арганізацыю вольнага час дзяцей, развіццё з дапамогай кнігі іх творчых здольнасцяў.

Супрацоўнікі аддзела абслугоўвання дзіцячага чытача Дзяржынскай ЦРБ пачалі рэалізацыю новага праекта «Чароўны рукзачок», накіраванага на фарміраванне традыцый сямейнага чытання. У гэтым праекце выкарыстоўваецца прынцып «колавай пошты»: яркі рукзачок з кнігамі і цацкамі для дзяцей, сшыткам водгукаў і літаратурай перадаецца з сям’і ў сям’ю. Камплект літаратуры для дзяцей складзены з лепшых узораў дзіцячай літаратуры, у падтрымку чытанню для дзяцей праводзяцца гульнёвыя мерапрыемствы па кнігах з «Чароўнага рукзачка», наладжана кніжная выстава «Чытаем разам».

Паспяхова прайшоў конкурс «Мой любімы літаратурны герой» і фотаконкурс для бацькоў «Мой чароўны рукзачок».

Бібліятэка наладзіла таксама цесныя сувязі з мінскім грамадскім аб’яднаннем «Дети не для насилия». На базе ДУ «Дзяржынская РЦБС» працавалі сямейныя гасцёўні з мэтай папулярызацыі кнігі і арганізацыі вольнага часу сям’і. Былі наладжаны сустрэчы са спецыялістамі (псіхолагамі, лагапедам, сацыяльным педагогам), якія могуць дапамагчы ў вырашэнні сямейных праблем і ў пытаннях выхавання дзяцей.

Аддзел па рабоце з дзецьмі Вілейскай ЦДБ працуе па праекце «Бібліятэка для сям’і: выхавацель на гадзіну». Мэта праекта – павысіць цікавасць да кнігі, да бібліятэкі праз арганізацыю вольнага часу дзяцей. У бібліятэчным пакоі казак дзеці могуць пагуляць, паўдзелнічаць у конкурсах, віктарынах, паглядзець мультфільмы.

Страдарожская ДБ працягвала працу па праграме «Дзеці. Сям’я. Кніга».

Арганізацыі вольнага часу дзяцей і бацькоў прысвечана работа клубаў сямейнага адпачынку «Адпачываем усёй сям’ёй» у Уздзенскай ДБ, «Тата, мама і я – чытаючая сям’я» ў аддзеле абслугоўвання дзіцячага чытача Дзяржынскай ЦРБ, «Хатні ачаг» у дзіцячым аддзеле Барысаўскай ЦРБ і інш.

У сямейных клубах «Семейка» і «В библиотеку всей семьёй» пры Капыльскай дзіцячай і раённай цэнтральнай бібліятэках прайшоў навагодні вечар адпачынку для выхаванцаў і бацькоў дамоў сямейнага тыпу «Вместе встретим Новый год». Дзве сям’і, у якіх выхоўваюцца па адзінаццаць дзяцей, былі гасцямі бібліятэкі. Тэатралізаванае свята атрымалася вясёлым і насычаным.

Наведвальнікі клуба «Мы і нашы дзеці», які працуе ў бібліятэцы сямейнага чытання «Верасок», прымалі ўдзел у вечарыне да Дня пажылых людзей «Осеннее путешествие на корабле жизни», у дабрачынным ранішніку для мнагадзетных сем'яў «А нас на Новый год ёлка в гости зовёт», у акцыі «Бібліяноч».

У Багданаўскай сельскай бібліятэцы (Валожынскі р-н) працуе клуб «Сямейная акадэмія». Сярод удзельнікаў клуба карыстаюцца папулярнасцю кніжныя выставы «Прапануем дзецям і бацькам», «Для дзяцей і пра дзяцей», «Гонар і абявязак быць бацькамі». У клубе праходзяць сямейныя дні адпачынку, дні адчыненых дзвярэй, святы сям'і, інфармацыйныя гадзіны і інш.

У Любанскай дзіцячай бібліятэцы прайшла акцыя «Добрая кніжка ў сямейную бібліятэку», у Плешчаніцкай ДБ адбыўся літаратурны калейдаскоп «Дружная семья».

Прыярытэтным напрамкам у дзейнасці дзіцячых бібліятэк раёна застаецца садзейнічанне духоўнаму развіццю дзяцей і падлеткаў. Многія бібліятэкі стварылі куткі духоўна-маральных ведаў, дзе афармляюцца кніжныя выставы, тэматычныя паліцы да свята Нараджэння Хрыстова, Вялікадня. Значная ўвага надаецца рэкламе духоўнай літаратуры.

Другі год у Крупскай ДБ працуе кніжная выстава «Задушевное слово». Кнігі Беларускага Экзархата, якія прадстаўлены на выставе, вучаць юных чытачоў быць добрымі, спагадлівымі, міласэрднымі.

Старадарожская ДБ праводзіла шматлікія мерапрыемствы па духоўным выхаванні сваіх карыстальнікаў. Гэта гульнёва-пазнавальная гадзіна «Рождество снова в гости к нам пришло», гадзіна інфармацыі «Разговор по душам – большим и малышам», гадзіна цікавых паведамленняў «О чем расскажет православный календарь», гучныя чытанні праваслаўных кніг «Чтение как духовное упражнение», гадзіна цікавай размовы «Покров – главный праздник октября».

Уздзенская, Барысаўская, Салігорская, Чэрвенская, Жодзінская, Капыльская, Смалявіцкая, Бярэзінская, Мядзельская, Вілейская, Слуцкая, Стаўбцоўская , Лагойская дзіцячыя бібліятэкі сумесна са святарамі прыходаў ствараюць сумесныя праекты, праводзяць урокі і гадзіны духоўнасці, месячнікі праваслаўнай кнігі.

Чэрвеньская дзіцячая бібліятэка працягвала супрацоўніцтва са Свята-Нікольскай праваслаўнай царквой. У

цыкле духоўна-маральных урокаў «Чалавек. Свет. Духоўнасць» адбыліся наступныя гутаркі: «Пусть добро и волшебство нам подарит Рождество. Свойства Божия», «На крыльях молитвы я к Богу лечу», «Храм защищает пришедший народ от жизненных бурь и душевных невзгод», «Божьей силою полна, в каждом храме есть она: Икона», «Сколько же святых у Бога?», «Начинающим о православии», «Библия – главная книга в жизни человека».

Сумесна з настаяцелем Свята-Анненскага сабора ў Стаўбцоўскай дзіцячай бібліятэцы адбылося мерапрыемства, прысвечанае 300-годдзю архіепіскапа Георгія Канісскага, на якое запрасілі святароў Стаўбцоўскага благачыння і настаўнікаў гісторыі школ раёна.

**Духоўна-маральнаму выхаванню дзяцей** і падлеткаў аддавала належную ўвагу Уздзенская ДБ. Удзельнікам біблятэчнай каляднай сустрэчы «Наступает Рождество – зимних сказок волшебство» быў настаяцель прыходу храма святых апосталаў Пятра і Паўла. Напярэдадні свята Вялікадня ў рамках творчага праекта «Мистер Мастер-класс» прайшлі заняткі па навучанню роспісу велікодных яек. Для наведвальнікаў клуба «Чамучкі» адбылася гутарка-гульня «Свет православия», прайшлі праваслаўныя ўрокі «Православная палитра», «Радасць слова», урок гісторыі «Унучка Чарадзея Еўфрасіння Полацкая».

Духоўна-маральнаму выхаванню юных чытачоў Салігорскай ДБ прысвячаліся духоўная гутарка «Батюшка наш Серафим», гадзіна духоўнасці «Жизнь дана на добрые дела», урок ветлівасці «Вечной Пасхи живительный свет».

Дзіцячыя бібліятэкі Міншчыны праводзіць мэтанакіраваную работу па выхаванні **прававой культуры дзяцей і падлеткаў**. Рэгулярна ўдакладняюцца спісы непаўналетніх на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх, спісы сацыяльна ненадзейных сямей. Аказваецца неабходная маральная і псіхалагічная дапамога падлеткам, якія стаяць на ўнытрышкольным уліку і на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх. Работа з праблемнымі падлеткамі здзяйсняецца ў

цесным кантакце з настаўнікамі школ, дзе яны вучацца, са школьнымі бібліятэкарамі.

Супрацоўнікі дзіцячых бібліятэк знаёмяць юных карыстальнікаў з дзіцячым прававым сайтам. Афармляюцца кніжныя выставы «В защиту детства», «Дети в мире прав», «Перекресток Мудрого Закона», «Па лабірынтах права», «Закон паважаць і разумець», «Кожнае дзіця мае права»,»Твои права» і інш. Пашыраюць прававыя веды юных чытачоў урокі і гадзіны прававых ведаў, літаратурна-прававыя віктарыны, трэнінгі, інфармацыйныя гадзіны, адкрытыя дыялогі, сустрэчы з участковымі інспектарамі і інш.

У Мядзельскай ДБ стала традыцыйным правядзенне прававых ўрокаў з выкарыстаннем інфармацыі дзіцячага прававога сайта Рэспублікі Беларусь «Ваши права – права ребенка», «Ты имеешь права», «Законы будем уважать, свои права мы будем знать», на якіх дзеці знаёмяцца з асноўнымі артыкуламі Канвенцыі па правах дзяцей, артыкуламі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

У Івянецкай гарпасялковай бібліятэцы прайшло абмеркаванне кнігі «Прынцэса з тусоўкі» Яўгена Хвалея. Былі ўзняты сур'ёзныя праблемы сучаснасці, жыцця школьнай моладзі. На ўроку правазнаўства «Аб прававой культуры» дзеці даведаліся пра нарматыўныя акты, прысвечаныя правам дзіцяці і аб сваіх абавязках і правах.

У рамках клуба для падлеткаў «Дыялог» у аддзеле па рабоце з дзецьмі Нясвіжскай ЦРБ прайшоў дыскусійны практыкум «Свабода і закон» з удзелам інспектара ІСН.

У межах акцыі «Сябруем з законам» у Любанскай дзіцячай бібліятэцы прайшла гутарка «Прававы калейдаскоп» з удзелам капітана Любанскага РАУС Русаковіча С.В.

Старадарожская ДБ прыняла ўдзел у раённым аглядзе-конкурсе на лепшую пастаноўку работы па прапагандзе прававых ведаў сярод насельніцтва «Я – паўнапраўны грамадзянін сваёй краіны». На мерапрыемстве «Дзеці – наша будучыня» прысутнічала старшы інспектар па прафілактыцы дзіцячай і падлеткавай злачыннасці Макар Т.В. Школьнікі

атрымалі інфармацыю даведаліся аб крымінальнай адказнасці непаўналетніх пры парушэнні законаў. Сустрэча скончылася тэатралізаваным прадстаўленнем на прававую тэматыку.

Праводзіць мэтанакіраваную работу па выхаванні прававой культуры сярод дзяцей і моладзі Заслаўскай ДБ дапамагала рэалізацыя праграмы «Перекресток».

У Клецкай ДБ працуе маральна-прававы клуб «Правовой эрудит», мэта якога –прававая асвета школьнікаў, выхаванне духоўнай асобы і фарміраванне грамадзянскай пазіцыі дзяцей і падлеткаў. Карыснымі і змястоўнымі былі дзень прававой культуры «Ёсць ва ўсіх дзяцей правы», пасяджэнні «Вучыся быть грамадзянінам», «Замацавана законам», «Ты і закон», «Азбука права».

Пры Бярэзінскай ДБ дзейнічае інфармацыйна-прававы цэнтр «Ведай свае правы змалку», дзе змешчаны матэрыялы аб правах дзяцей і ахове дзяцінства, па прафарыентацыі, дасье «Несовершеннолетние и законы РБ», «Счастье и радость человека – общение с людьми», «Парады бацькам». Сярод падлеткаў і іх бацькоў заўсёды запатрабаваны даведнікі, якія выпусціла дзіцячая біблятэка: «Подростку о правах», «Это надо знать», «Знай свои права», «Декларация прав ребенка. Что я знаю об этом?», «Права и ответственность». Прапагандзе прававых ведаў была прысвечана гадзіна прававой інфармацыі «Твае правы, падлетак», «Подростак, знай свои права и будь готов к ответственности», «Это надо знать».

У Салігорскай ДБ прайшоў адкрыты дыялог «Правонарушения: что за этим стоит». Мерапрыемства было арганізавана ў рамках міжведамаснай прафілактычнай акцыі «Сябруем з Законам!», накіраванай на прадухіленне супрацьпраўных паводзін непаўналетніх.

Важным крокам у жыцці кожнага школьніка з’яўляеца выбар сваёй будучай прафесіі. У дзіцячых бібліятэках вобласці традыцыйнымі сталі мерапрыемствы **прафарыентацыйнай скіраванасці**. Каб пазнаёміць карыстальнікаў з раснастайнымі прафесіямі, дапамагчы ім у выбары навучальных установ, у многіх бібліятэках дзейнічаюць кніжныя выставы «Час.

Прафесія. Выбар», «Мир профессий и твоё место в нём», «Выбар прафесіі – выбар лёсу», «Выбіраем прафесію», «Адрас тваёй прафесіі», «Парада на ўсё жыццё», «У дапамогу абітурыенту» і інш.

Бібліятэкі Старадарожчыны праводзілі гадзіны цікавых паведамленняў «Путеводитель в мире профессий», «Какие бывают профессии», «Мое увлечение – моя профессия», адкрытую гутарку «Послушай всех, подумаем вместе – выберешь сам!», прафарыентацыйны дыялог «Новое время – новые профессии», гадзіну пытанняў і адказаў «Профориентация. Информация. Образование», вандроўку па прафесіях «Время даром не теряй, кем ты будешь – выбирай» і інш. Цікавым быў дыспут у дзіцячай бібліятэцы «Как не ошибиться в выборе профессии», у час якога дзеці даведаліся аб новых модных прафесіях, успомнілі прыказкі і прымаўкі аб працы, пазнаёміліся з кніжнай выставай «Прафесіі новага часу».

Дзіцячы аддзел Слуцкай ЦРБ сумесна са слуцкім ліцэем запрасілі юных случчан на «Кірмаш прафесій», які быў прысвечаны рабочым прафесіям.

У бібліятэках Валожынскага раёна вядзецца картатэка «Каляндар прафесій», сістэматычна папаўняюцца матэрыяламі папкі «Табе, абітурыент». У папцы «Выбіраем прафесію» (Валожынская ДБ) сабраны матэрыялы аб прафесіях, у якіх мае патрэбу Валожынскі раён, інфармацыю аб вакансіях на рынку працы прадастаўляў бібліятэцы раённы цэнтр занятасці насельніцтва. Асаблівай папулярнасцю ў старшакласнікаў Валожыншчыны карыстаюцца сустрэчы са студэнтамі ВНУ, якія праходзяць у час студэнцкіх канікул, звычайна ў Таццянін дзень.

Івянецкая гарпасялковая бібліятэка з 2015 года здзяйсняе праект для выпускнікоў школы «Крок у прафесію». Адбыліся наступныя мерапрыемствы: інфармацыйная гадзіна «Свет прафесій», сустрэча са спецыялістам «Прафесія з глыбіні вякоў» (аб прафесіі бібліятэкара), прэзентацыя «Сучасныя прафесіі» (веб-дызайн, лагістыка, маркетынг, PR-менеджмент), бібліядайджэст «Выбіраем прафесію» і інш.

Работа **па папулярызацыі здаровага ладу жыцця**, фарміраванне ў дзяцей і падлеткаў сур’ёзнага стаўлення да ўласнага здароўя традыцыйна застаецца адным з важных напрамкаў у дзейнасці дзіцячых бібліятэк Міншчыны. У падтрымку здаровага ладу жыцця бібліятэкамі праводзіцца шматпланавая работа. Свае намаганні яны аб’ядноўваюць з бацькамі, настаўнікамі, медыкамі. Ва ўсіх бібліятэках афармляюцца куткі здароўя, кніжныя выставы, адкрытыя прагляды літаратуры, тэматычныя паліцы: «Ключи к здоровью», «Новы стыль жыцця – здаровы», «Зберажы сябе для жыцця», «Скажам курэнню – НЕ!», «Дарога ў нікуды», «СНІД – ведаць, каб змагацца», «Всем миром против страшного зла», «Спайс – наркоз сознания» і інш.

Юныя чытачы ўдзельнічаюць у гадзінах ведаў, уроках здароўя, гадзінах перасцярогі, гадзінах валеалогіі, маральных дыялогах, гадзінах прафілактыкі, праўдзівых размовах, слайд-вандроўках, гадзінах праблемных пытанняў, інфарм-хвілінках, слайд-ванроўках. Адбыліся мерапрыемствы, прымеркаваныя да Сусветнага дня здароўя, Сусветнага дня барацьбы са СНІД і дня памяці ахвяр СНІД, Міжнароднага дня адмовы ад курэння, Міжнароднага дня барацьбы з наркаманіяй.

У дзіцячых бібліятэках вобласці праводзяцца мерапрыемствы, накіраваныя на захаванне правілаў бяспекі дзяцей і падлеткаў.

У рамках праграмы дзіцячага аддзела Барысаўскай РЦБ «К книге и чтению – через досуг и общение» дзейнічае падпраграма «Личная безопасность». Слайд-гутаркі «Цена безобидных игр на воде» і «Меры безопасности на льду» карысталіся вялікай папулярнасцю ў дзяцей, падлеткаў і педагогаў.

Пазнавальна-гульнёвае мерапрыемства «Безопасность нам нужна, безопасность нам важна» ў Клецкай ДБ з удзелам прадстаўніка раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях спрыяла замацаванню школьнікамі правілаў паводзін пры надзвычайных сітуацыях.

На «Дзень бяспечных канікулаў» у Пухавіцкую ДБ быў запрошаны спецыяліст па нагляду і прафілактыцы раённага аддзела інспекцыі па надзвычайных сітуацыях. Інспектар прывёў прыклады здарэнняў і растлумачыў, што трэба рабіць, каб пазбегнуць непрыемнасцей. Наведвальнікі бібліятэкі ў гэты дзень атрымалі буклеты «Бяспечнае дзяцінства» і цукеркі.

Плённа працавалі дзіцячыя бібліятэкі па выхаванні **экалагічнай культуры** падрастаючага пакалення. Склалася цэласная сістэма экалагічнай асветы дзяцей і падлеткаў, добрыя прыклады арганізацыі выхаваўчага працэсу экалагічнага напрамку маюць Старадарожская, Любанская, Бярэзінская, Нясвіжская, Копыльская, Уздзенская, Мядзельская, Маладзечанская, Слуцкая, Валожынская, Салігорская, Заслаўская бібліятэкі. Папулярныя сярод карыстальнікаў бібліятэк аматарскія аб'яднанні, клубы юных аматараў прыроды. Пашыраюцца сувязі з інспекцыямі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Праводзяцца мясячнікі, тыдні, дні экалогіі, гадзіны эказнаёмстваў, конкурсы знаўцаў прыроды, экападарожжы, экалагічныя сцяжынкі, дні экалагічнай кнігі, фотапаляванні, экспедыцыі, дэсанты, экалагічныя рынгі і інш.

Ва ўсіх бібліятэках дзейнічаюць кніжныя выставы па экалогіі. У афармленні выстаў, адкрытых праглядаў літаратуры, экалагічных цэнтраў, куткоў умела выкарыстоўваюцца падзелкі, пакаёвыя кветкі, кампазіцыі з прыродных матэрыялаў, лекавыя расліны і інш.

Старадарожская дзіцячая бібліятэка, базавая ў раёне па экалагічным выхаванні, працуе па праграме «Открой для себя мир природы». Тут прайшлі наступныя мерапрыемствы: эка-гадзіна «Красота живёт повсюду, важно только верить в чудо», турнір знаўцаў прыроды «В природе тысячи секретов», эка-агляд «Красная книга – энциклопедия надежд», гадзіна кніжных сустрэч «Идём дорогою лесною» (да 125-годдзя з дня нараджэння К. Паўстоўскага), гульня-падарожжа «Сойки, дрозды и свирели на праздник к нам прилетели», літаратурнае падарожжа «Детский писатель с морскою душой» (да 135-годдзя з дня нараджэння Б. Жыткова) і інш. Па цікавай праграме

працуе экалагічны клуб для дзяцей малодшага школьнага ўзросту «Буслік».

З дапамогай экалагічнага клуба «Мурашок» юныя чытачы Любанскай ДБ вучыліся беражлівым адносінам да прыроды. Для іх прайшла гульня-віктарына «Звяры і птушкі з кніжнай старонкі», дзень экалагічных ведаў «Ведай і любі сваю прыроду», электронная прэзентацыя «Рассказы деда Природоведа», урок інфармацыі «Нам не памятаць аб гэтым нельга» ( да Дня катастрофы на Чарнобыльскай АЭС).

Крупская ДБ ўпершыню паспяхова рэалізоўвала аўтарскую праграму экалагічнага напрамку «Родник». Праз экалагічныя гульні, віктарыны, гадзіны цікавых паведамленняў, экспрэс-падарожжы супрацоўнікі імкнуліся прывіць дзецям любоў да ўсяго жывога.

У Капыльскай ДБ наведвальнікаў прыцягнуў аўкцыён літаратурных пытанняў «Флора в детской литературе» і «Фауна в детской литературе» – новы фармат бібліятэчных мерапрыемстваў.

Экалагічнай адукацыяй і выхаваннем у Уздзенскай ДБ займаецца клуб «Лесавічок». На занятках клуба выкарыстоўваюцца сучасныя формы работы з мэтай знаёмства дзяцей са складаным і разнастайным светам прыроды: пазнавальныя гадзіны, паэтычныя конкурсы, птушыныя калейдаскопы, экалагічныя віктарыны, майстар-класы.

Пры Чэрвеньскай дзіцячай бібліятэцы паспяхова працуе экалагічны клуб «Чамучкі». Юныя аматары прыроды прымалі ўдзел у экалагічных гадзінах, пазнавальных гульнях, знаёміліся з новай літаратурай. Амаль кожнае мерапрыемства суправаджалася відэаролікамі з інтэрнэт-рэсурсаў, прэзентацыямі, праглядам слайдаў, мультфільмаў.

Плённа працуе пры аддзеле па рабоце з дзецьмі Нясвіжскай ЦРБ школа экалагічных ведаў Зялёныя дні ў бібліятэцы». У экалагічным пакоі для малодшых школьнікаў праводзілі аўкцыён экалагічных таямніц «Пернатые незнакомцы», турніры знаўцаў прыроды «Про зелёные леса и

лесные чудеса», экалагічны кактэйль «В некотором царстве, в экологическом государстве» і інш.

Экалагічнаму выхаванню наведвальнікаў Мядзельскай ДБ садзейнічае бібліятэчная праграма «Наш экадом – Мядзельшчына», якая разлічана на доўгатэрміновую бесперапынную работу з дзецьмі featureрознага ўзросту.

Цікавыя мерапрыемствы экалагічнай накіраваннасці адбыліся ў біблятэцы сямейнага чытання «Верасок»: слайд-экспедыцыя «Дзе жыве зубраня», конкурсна-забаўляльная праграма «Что такое снег», экалагічны брэйн-рынг «Лохматые, мохнатые, тигрово-полосатые», пазнавальная гадзіна «Коты для умноженья доброты» і інш. Для маленькіх чытачоў у рамках клуба «Чароўны ліхтарык», быў праведзены экалагічны кнігамаршрут «Казкі бібліятэчнага леса». Карткі з назвамі праблем экалогіі планеты былі прычэплены да кніг. Вучні шукалі ў кнігах экалагічныя праблемы, удзельнічалі ў конкурсе плакатаў «Выратуем прыроду».

Заслаўская ДБ працягвала працаваць над рэалізацыяй праграмы «Экалогія. Бібліятэка. Чалавек». Створаны пры бібліятэцы «Живой уголок» спрыяе фарміраванню экалагічнай свядомасці школьнікаў, знаёміць іх з рознымі відамі жывёл.

Значная ўвага надавалася **экалагічнаму выхаванню** дзяцей і падлеткаў у бібліятэках Валожынскага раёна. Праз кніжныя выставы «Экалогія і сучаснасць», «Мы – сябры прыроды» (Валожынская ДБ), «Беражы прыроду» (Гародзькаўская СБ), «З любоўю да прыроды» (Вішнеўская СБ) і іншыя супрацоўнікі бібліятэк выхоўваюць у школьнікаў пачуццё адказнасці за лёс прыроды роднага краю.

Добрыя набыткі ў выхаванні ў вучняў беражлівага стаўлення да асяроддзя мае Гародзькаўская СБ. Клуб «Рамонак», створаны пры бібліятэцы, дапамагае ў экалагічнай асвеце падрастаючага пакалення. Паспяхова прайшлі клубныя пасяджэнні: экалагічнае свята «Зямля ў нас адна», экалагічная інфарміна «Пад чорным крылом Чарнобыля», экалагічны ўрок «Увайдзі ў прыроду сябрам», віктарыны «Моўныя скарбы роднага краю» і «Зямля пад белымі крыламі», турнір знаўцаў

«Што ў лесе расце, хто ў лесе жыве». Наведвальнікі клуба здейснілі эклагічныя падарожжы «У свеце жывёл» і «Таямніцы зялёнай краіны». Была арганізавана выстава дзіцячых работ з прыроднага матэрыялу «Прырода і фантазія».

З мэтай папоўніць веды пра карысныя ўласцівасці вады, яе важнасць для жыццядзейнасці чалавека, у Дорскай СБ прайшоў вечар эрудытаў «Чаму блакітная планета».

Разнастайную і цікавую работу па экалагічнай адукацыі дзяцей і падлеткаў вядзе Валожынская раённая дзіцячая бібліятэка, якая цесна супрацоўнічае ў гэтым напрамку з інспекцыяй прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Валожынскага райвыканкама. Распрацавана сумесная раённая мэтавая праграма па экалагічнай адукацыі і інфармацыі насельніцтва «Бібліятэка і экалогія». У мэтах распаўсюджвання экалагічных ведаў у дзіцячай бібліятэцы дзейнічае экалагічны куток «Вялікія і малыя таямніцы прыроды», паспяхова праходзяць экалагічныя гульні і падарожжы, гадзіны экалогіі, конкурсы знаўцаў прыроды. З наступленнем халадоў дзіцячая бібліятэка традыцыйна аб'яўляе акцыю «Дапаможам птушкам зімой!». Праведзены інфармацыйны дайджэст «Дапамажы перазімаваць птушкам», гутаркі «Чым карміць птушак зімой» і «Зімуючыя птушкі», віктарыны «Пра нашых птушак».

У аддзеле абслугоўвання дзіцячага чытача Дзяржынскай РЦБ стала традыцыйным праводзіць Тыдзень экалогіі да Сусветнага дня аховы навакольнага асяроддзя. У рамках Тыдня адбыліся: інфарміна «Пусть вечно радует душу ласковый шум лесов» і майстар-клас «Вясёлы заапарк», на якім дзеці вучыліся з паперы рабіць розных жывёл.

У бібліятэках Мінскай вобласці шмат увагі надаецца **эстэтычнаму выхаванню, выяўленню і падтрымцы таленавітых дзяцей** і стварэнню ўмоў для творчага развіцця падрастаючай асобы.

Маладзечанская, Салігорская, Заслаўская, Бярэзінская, Валожынская, Вілейская, Старадарожская, Уздзенская, Мядзельская, Пухавіцкая, Барысаўская, Смалявіцкая бібліятэкі ўважліва сочаць за творчасцю юных аматараў слова.

Праводзяцца раённыя і гарадскія агляды-конкурсы, вершы юных аўтараў друкуюцца на старонках раённых газет, у бібліятэках выдаюцца зборнікі літаратурных спроб школьнікаў.

У Бярэзінскай ДБ ладзіліся выставы творчых работ «Нашы таленавітыя чытачы»: дзіцячых малюнкаў «Матулька любая мая», «Сям'я – прытулак душы» і фотавыставы «Зімовы настрой « ,»Мелодыя вясны», «Вот оно какое – лето», «Восеньскія эцюды» .

У Мядзельскай ДБ былі аформлены выставы: кніжная «Ад кніг да творчасці»; «Весеннее настроение», дзе можна было пабачыць работы з фарфору, салёнага цеста, саломкі, вышытыя бісерам і крыжыкам, у тэхніцы дэкупаж. Дзейнічалі выставы «Любімай маме сваімі рукамі»; «Папяровыя дзівосы»; да навагодніх свят была прымеркавана выстава дзіцячых самаробак «Цуд чароўны – Новы год».

У Старадарожскай дзіцячай бібліятэцы сумесна з супрацоўнікамі цэнтра рамёстваў наладзілі экспазіцыю работ Арцёмчык Вольгі Пятроўны «Прекрасное рядом», выставу лялек Міхеевай Вольгі «Свет маіх захапленняў» і Міхеевай Святланы «Усе мы родам з дзяцінства». У бібліятэцы праведзены шэраг мерапрыемстваў па эстэтычным выхаванні: «Портретная галерея» (да 95-годдзя з дня нараджэння М. Савіцкага), гадзіна мастацтва «От книги – до спектакля», інфармацыйная гадзіна «Что мы знаем о Чайковском», віртуальнае падарожжа «Побываем поскорее в Третьяковской галерее», гадзіна пытанняў і адказаў «Увлекательное путешествие в мир живописи».

У Заслаўскай ДБ фарміраванне эстэтычнай і духоўнай культуры ажыццяўляе клуб для дзяцей малодшага школьнага ўзросту «У коле сяброў», які спрыяў раскрыццю талентаў юных чытачоў. Выставачная дзейнасць бібліятэкі дазваляла шырока прадставіць розныя віды мастацтва і рамёстваў. У бібліятэцы дзейнічалі: «Творим, созерцая прекрасное» – персанальная выстава мастацкіх вырабаў А.М. Аўдзевіч і «Жыве паўсюдна прыгажосць» – выстава работ жыхаркі г. Заслаўя Л.С. Вяроўкінай.

Пухавіцкая ДБ разам з выхавацелямі цэнтра пазашкольнай работы «Світанак» наладзіла выставы дзіцячых работ «Героі казак у гліне ажываюць» і «Калядная зорка», якія былі надзвычай папулярнымі ў бацькоў маленькіх мастакоў.

Юныя чытачы Капыльскай дзяцячай бібліятэкі і навучэнцы дзіцячай школы мастацтваў працягвалі ўдзел у раённым творчым праекце «Кисти, краски, карандаш» (да 75-годдзя напісання кнігі А. дэ Сэнт-Экзуперы «Маленький принц»). У конкурсе прынялі ўдзел больш за сорак дзяцей. Была прадстаўлена 47 прац, выкананых у розных тэхніках, а таксама спаборнічалі юныя апавядальнікі, паэты і вакалісты. Падвядзенне вынікаў конкурсу вылілася у цудоўнае мерапрыемства «Все мы родом из детства», на якім прысутнічалі дзеці, чые работы былі прызнаны лепшымі.

Плённа вядзецца эстэтычнае выхаванне дзіцячага чытача ў бібліятэцы «Верасок» (г. Маладзечна). На працягу года арганізоўваліся мастацкія выставы творчых работ «Добрых рук стварэнне», «Пасхальный сувенир». Адбыліся творчыя сустрэчы з дзіцячымі пісьменнікамі, цікавымі людзьмі.

Прайшоў чарговы злёт юных талентаў Маладзечаншчыны «Всё начинается с таблички, свитка, бересты», які быў прысвечаны 500-годдзю беларускага кнігадрукавання.

Супрацоўнікі дзіцячых бібліятэк Мінскай вобласці не спыняюцца на дасягнутым, а імкнуцца напоўніцу выкарыстаць свой патэнцыял пры арганізацыі працы з дзецьмі, кіруючыся сучаснымі інавацыйнымі бібліятэчнымі тэхналогіямі.

## Камплектаванне і арганізацыя адзінага фонду

Бібліятэчны фонд публічных бібліятэк Мінскай вобласці на 01.01.2018 г. складае 6 286 453 экз. дакументаў. За мінулы год, у параўнанні з 2016 г., ён паменшыўся на 203 122 экз.

У 2017 г. значная ўвага надавалася даручэнню Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па накіраванні на камплектаванне фондаў

бібліятэк не менш 12% грашовых сродкаў ад сумы бюджэтнага фінансавання на ўтрыманне дадзеных устаноў.

Так з бюджэту вобласці на камплектаванне бібліятэчных фондаў і набыццё правоў доступу да электронных інфармацыйных рэсурсаў выкарыстана 1,6 млн. рублеў, што складае 15,0 % ад бягучага фінансавання бібліятэк.

Пры гэтым (у сярэднім па вобласці) 74,1 % ад сукупнага аб'ёму фінансавання было накіравана на аплату падпіскі на перыядычныя выданні. Толькі ў сетцы публічных бібліятэк г. Жодзіна, Мінскага і Барысаўскага раёна грашовыя сродкі выкарастаныя на падпіску склалі меней 60 %. У той жа час у некаторых сетках публічных бібліятэк аплата падпіскі перавышае 90 % ад агульнага памеру фінансавання. Рэпертуар перыядычных выданняў які атрымліваюць бібліятэкі вобласці, ў сярэднім складае 116 назваў часопісаў і 26 назваў газет.

З мясцовага бюджэту на набыццё кніг і другіх дакументаў (за выключэннем перыёдыкі) было выкарыстана 383 тыс. рублей. Сеткі публічных бібліятэк г. Жодзіна, Мінскага, Барысаўскага, Слуцкага, Бярэзінскага і Маладзечанскага раёна атрымалі ад 50,2 % да 30,4 % ад аб'ёму бюджэтнага фінансавання накіраванага на камплектованне бібліятэчных фондаў. Сеткам публічных бібліятэк Клецкага, Пухавіцкага, Крупскага, Уздзенскага, Старадарожскага, Чэрвеньскага, Салігорскага і Валожынскага раёнаў было выделяна ад 29,9 % да 20,8 %; публічныя бібліятэкі Любанскага, Лагойскага, Нясвіжскага, Капыльскага, Мядзельскага і Дзяржынскага раёнаў асвоілі ад 19,2% да 8,8%. У астатніх сетках публічных бібліятэках вобласці на набыцце кнігамі за кошт мясцовага бюджэту было выдзелена ад 2,6% да 2,1% ад агульнага фінансавання накіраванага на папаўненне фонду.

Штогод бібліятэкі вобласці атрымліваюць кнігі за кошт рэспубліканскага бюджэту праз «Белкнігу». У 2017 годзе з гэтай крыніцы фонды бібліятэк папоўніліся на 5 380 экз. дакументаў на суму за 69,1 тыс. рублёў. Таксама ў выніку перадачы кніг са школьных бібліятэк у фонды паступіла 29 864 экз. на суму 40,2 тыс. рублей. Акрамя гэтага дзякуючы падарункам чытачоў і

розных арганізацый фонды папоўніліся на 20 304 экз. на агульную суму 77,1 тыс. рублей.

За пазабюджэтныя сродкі публічнымі бібліятэкамі нашай вобласці было набыта 1 047 экз. дакументаў на агульную суму 7,9 тыс. руб. У той жа час публічныя бібліятэкі Валожынскага, Капыльскага, Лагойскага, Мінскага, Маладзечанскага, Мядзельскага, Нясвіжскага раёнаў і г. Жодзіна не змаглі папоўніць фонд за кошт уласных прыбыткаў.

Так па выніках 2017 г. праз розныя крыніцы камплектавання ў фонды публічных бібліятэк вобласці паступіла 259,6 экз. документаў. Большасць новых паступленняў застаецца ў цэнтральных бібліятэках. Ва ўсіх сістэмах публічных бібліятэк вобласці ў сярэднім адзін сельскі філіял (без уліку бібліятэк аграгарадкоў) атрымліваў каля 95 экз. кніг. У той жа час адзін сельскі філіял сеткі публічных бібліятэк Салігорскага і Бярэзінскага раёна ў сярэднім атрымаў 24 і 11 экз. кніг. Рэпертуар перыядычных выданняў па вобласці ў сярэднім складае 14 назваў часопісаў і 7 назваў газет. Складанае становішча ў сельскіх бібліятэках Старадарожскага раёна: тут у 2017 годзе паступала 5 назваў часопісаў і 2 назвы газет.

Па ранейшаму значная ўвага надавалася камплектаванню бібліятэк аграгарадкоў. У сярэднім адна бібліятэка аграгарадка атрымала каля 162 экз. кніг, 17 назваў часопісаў і 9 назваў газет.

Неабходнай умовай для аптымізацыі якасці бібліятэчных фондаў з'яўляецца своечасовае выяўленне і выключэнне састарэлых па змесце, зношаных і дублетных дакументаў. Так у выніку за 2017 г. з фонду публічных бібліятэк вобласці выключана 462,7 тыс. экз. дакументаў, у тым ліку кніг – 271,6 тыс. экз., перыядычных выданняў – 182,5 тыс. экз., іншых дакументаў – 8,6 тыс. экз. Дакументы выключаліся па наступных прычынах: зношаныя – 51,7 %, састарэлыя па змесце – 4,2 % , дублетныя, страчаныя і іншыя прычыны – 4,7 %, па прычыне заканчэння тэрміну захоўвання – 39,4%.

Пытанні стану і выкарыстання фондаў абмяркоўваюцца на нарадах пры дырэктары, работа з фондам адлюстроўваецца ў планах работы і справаздачах бібліятэк.

## Інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне

Шматпланавая даведачна-бібліятэчная праца ўключае ў сябе розныя працэсы і аперацыі: выяўленне і групоўку дакументаў па розных галінах ведаў, апрацоўку вялікіх масіваў інфармацыі, якасны адбор дакументаў, задавальненне складаных або нявызначаных чытацкіх запытаў, складанне бібліяграфічных дапаможнікаў, кансультаванне і інфармацыйнае навучанне чытачоў. Кожны з гэтых відаў працы накіраваны на выкананне адной з галоўных функцый бібліятэкі – інфармацыйнай.

Бібліятэкі Мінскай вобласці ажыццяўляюць даведачна-бібліяграфічнае, інфармацыйнае, кансультацыйнае і прававое абслугоўванне карыстальнікаў на аснове традыцыйных і сучасных інфармацыйных тэхналогій.

Аналіз справаздачнасці бібліятэк Мінскай вобласці сведчыць аб тым, што працягваўся рост колькасці чытачоў і адпаведна павялічыліся паказчыкі выкананых бібліяграфічных даведак. Так, у бібліятэках Валожынскага раёна па запытах чытачоў у 2017 годзе было выканана 1613 бібліяграфічных даведак (у 2016 годзе – 1506 даведак), у Мінскай абласной бібліятэцы – 10034 даведкі (у 2016 годзе – 9112 даведак), у бібліятэках Маладзечанскага раёна – 1389 даведак (у 2016 годзе – 1321), бібліятэкі Дзяржынскага раёна выканалі 1827 даведак (у 2016 годзе – 1625).

На працягу года праводзілася праца па ўдасканальванні сістэмы бібліятэчных каталогаў і картатэк: папаўненне і рэдагаванне, сістэматычны роспіс газетных і часопісных артыкулаў і г.д. СКА дапаўняліся новымі тэматычнымі рубрыкамі (напрыклад, Любанскай ЦБ да Года навукі ў СКА уведзены актуальны раздзел «2017 – Год навукі», Маладзечанскай ЦБ у СКА і краязнаўчых картатэках былі выдзелены тэматычныя рубрыкі: «2017 – Год навукі», «135 год з

дня нараджэння Я.Купалы і Я.Коласа», «500-годдзе беларускага кнігадрукавання». Уведзены новыя рубрыкі і бібліятэкамі Мядзельскага раёна: «2017 – Год навукі», «500-годдзе беларускага кнігадрукавання», «Прадпрымальніцтва».)

На сённяшні дзень амаль ва ўсіх раёнах Мінскай вобласці працуюць публічныя цэнтры прававой інфармацыі (ПЦПІ), якія ўяўляюць сабой пункты свабоднага доступу грамадзян да афіцыйна-прававой інфармацыі.

Усе раённыя бібліятэкі прадастаўляюць карыстальнікам доступ да прававой БД «Эталон», якая з'яўляецца дзяржаўным інфармацыйна-прававым рэсурсам Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь і дазваляе атрымаць хуткі доступ да эталоннай прававой інфармацыі ад першакрыніцы, да інфармацыі правапрымяняльнагу характару, формам юрыдычных дакументаў, а таксама да іншай запатрабаванай і карыснай інфармацыі: навін заканадаўства, даведнікаў, слоўнікаў юрыдычных тэрмінаў і азначэнняў і інш.

На 01.01.2018 у Мінскай вобласці дзейнічаюць **96 публічных цэнтраў прававой інфармацыі (ПЦПІ)**. Агульны фонд ПЦПІ складае 54 088 экз. За перыяд 2017 года ў цэнтры ПЦПІ звярнуліся 5 482 карыстальнікі, колькасць наведванняў склала 23 352, па запытах выдадзена каля 15 198 даведак. Колькасць зваротаў да БД «Эталон» складае 4 470.

Бібліятэкі Міншчыны паспяхова праводзяць працу па **бібліяграфічным інфармаванні**. Напрыклад, у бібліятэках Лагойскага раёна індывідуальную інфармацыю атрымалі 85 абанентаў па тэмах: «У сяброўстве з прыродай», «Дзіўнае побач», «Экалагічнае выхаванне ў пачатковых класах», «У дапамогу правядзенню масавых мерапрыемстваў», «Сам сабе псіхатэрапеўт», «Лекі без аптэкі: дыябет», «Кветкі ў інтэр'еры», «Магія творчасці», «Зялёны дызайн». Групавое інфармаванне, якое ахоплівае 46 калектываў, задавальняла запыты па тэмах: «Гісторыя і яе вывучэнне», «Беларускае літаратуразнаўства і выкладанне беларускай літаратуры ў школе», «Творы беларускай літаратуры ў часопісах», «Тэхнічнае абслугоўванне і рамонт аўтамабіляў», эксплуатацыя аўтамабіляў, захаванне

перавозімых грузаў», «Бяспека руху на аўтамабільным транспарце». У бібліятэках Любанскага раёна індывідуальнае інфармаванне вялося для 87 абанентаў, сярод якіх кіраўнікі ўстаноў горада і раёна, спецыялісты народнай гаспадаркі, медыцынскія работнікі, працаўнікі АПК, выхавацелі і настаўнікі мясцовых навучальных устаноў, кіраўнікі гурткоў і аматарскіх аб’яднаняў, а таксама хатнія гаспадыні, пенсіянеры, інваліды, вучні школ і інш. Сярод тэм індывідуальнага інфармавання можна вылучыць наступныя: «Чырвоны Крыж. Валанцёрства», «Абрадавая дзейнасць і фальклор Любаншчыны», «Старасць – у радасць!», «Дошкольники: обучение на занятиях» і інш. Групавое інфармаванне вялося для 30 абанентаў, сярод якіх: сельскія Саветы, тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, школа рамёстваў і дэкаратыўна-прыкладной творчасці, школа мастацтваў, цэнтр дзіцячай творчасці, установы аховы здароўя, дамы культуры, калектывы навучальных устаноў раёна, цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, калектывы мастацкай самадзейнасці. Яны інфармаваліся па наступных тэмах: «Людзі, чые магчымасці абмежаваныя: адаптацыя ў соцыўме, вопыт работы», «Фальклор. Этнаграфія. Народныя звычаі», «Сацыяльнае абслугоўванне. «Састарэлыя людзі. Інваліды», «Клопат. Дабрыня. Міласэрнасць». Індывідуальнае інфармаванне ў бібліятэках Крупскага раёна было накіравана на задавальненне патрабаванняў працаўнікоў выканкамаў, прадпрымальнікаў, юрыстаў, настаўнікаў, спецыялістаў сельскай гаспадаркі, сацыяльна неабароненых катэгорый насельніцтва. Паслугамі індывідуальнага інфармавання карысталіся 28 абанентаў, ім прадстаўлена 25 спісаў літаратуры. Калектыўную інфармацыю атрымлівалі сельскія Саветы, упраўленні сельскіх гаспадарак, школы, дзіцячыя сады, дамы культуры, установы адукацыі і аддзел адукацыі, дзіцячыя сады. На індывідуальную інфармацыю ў бібліятэках Слуцкага раёна былі ўзяты 44 абаненты. Яны інфармаваліся па 39 тэмах, атрымалі 465 інфармацый, якія уключалі 967 назваў. На групавой інфармацыі – 49 калектываў. Гэта настаўнікі,

медработнікі, рабочыя, выхавальнікі і г. д., ім даслана 190 спісаў, якія уключаюць 2552 назвы. Абанентамі групавога інфармавання Старадарожскага раёна звычайна з’яўляюцца школы, дзіцячыя сады, групы спецыялістаў сельскай гаспадаркі. Тэмы групавога інфармавання адпавядаюць напрамку дзейнасці устаноў: «Працоўнае заканадаўства», «Новая літаратура па культуры і мастацтву», «У дапамогу метадысту», «Основные направления общеобразовательной школы», «Медицина.Медицинские науки», «У дапамогу клубнаму работніку», «Дошкольное воспитание детей». Бібліятэкі Клецкага раёна ў 2017 годзе абслужылі 56 калектываў па 60 тэмах. Калектыўную інфармацыю атрымліваюць працаўнікі жывёлагадоўчых комплексаў, малочна-таварных ферм, рамонтных майстэрняў, праўленні СВК, сельскія Саветы, ФАПы, школы і іншыя. Індывідуальную інфармацыю па розных пытаннях прафесійнай дзейнасці атрымліваюць 85 абанентаў, якія інфармуюцца па 86 тэмах. Сельскія філіялы інфармуюць спецыялістаў сельскай гаспадаркі, кіраўнікоў дзіцячым чытаннем, фермераў, прадпрымальнікаў, інвалідаў, пенсіянераў, уладальнікаў прысядзібнай гаспадаркі, майстроў народных промыслаў і іншых.

**Прапаганда ББВ (бібліяграфічныя ўрокі, дні бібліяграфіі, бібліяграфічныя агляды)** таксама добра прапрацавана бібліятэкамі вобласці. Бібліёграфамі бібліятэк Бярэзінскага раёна, напрыклад, былі праведзены наступныя ўрокі ББВ: «Выбар кніг у бібліятэцы. Парадак расстаноўкі кніг у фондзе. Памочнікі ў выбары кніг: кніжная выстава, тэматычная паліца», «Гэта твая бібліятэка: дзень адчыненых дзвярэй для 9-х класаў горада». У справаздачным годзе бібліятэкамі Клецкага раёна было праведзена 56 дзён бібліяграфіі: «Клецкая зямля гісторыяй багата. Краязнаўчая картатэка», «Даведачна-бібліяграфічны апарат бібліятэкі», «Імёны пісьменнікаў на карце Клецкага раёна», «Вандроўка ў бібліятэчны свет», «Мир библиографии открывает тайны». Бібліятэкамі Лагойскага раёна было праведзена 9 дзён бібліяграфіі на розныя тэмы: «Библиотеки в цифровую эпоху», «Бібліяграфія – ключ да

кніжных скарбаў», «Искусство быть читателем», «Сцежкамі роднага краю», «Покліч роднага слова» і 75 бібліяграфічных аглядаў (у 2016 годзе – 51) па наступных тэмах: «Таямніцы мінулага Лагойшчыны», «У дапамогу добраму гаспадару», «Читаем книги о войне», «Пусть не будет войны никогда», «Мастацтва кнігі ў Беларусі», «Спадчына нашага зямляка». Для дарослых карыстальнікаў Любанскай ЦБ праведзена інтэлектуальная гульня «Бібліяграфічны калейдаскоп» у рамках літаратурна-гульнёвай праграмы «Лабірынты кніжнага царства». Бібліятэкамі Мінскага раёна праведзена 57 бібліятэчна-бібліяграфічных урокаў: «Internet и образование», «Мой горад – мая бібліятэка», «Бібліятэка – скарбніца кніг», «Пошукавыя сістэмы Інтэрнэт», «Твае дапаможнікі – слоўнікі», экспрэс-інфармацыя «Структура кнігі». У бібліятэках Маладзечанскага раёна прайшло 16 дзён бібліяграфіі: «Беларускі фальклор», «Азірніся на Зямлю сваю», «Древние библиотеки – хранители вечности», «Студэнту і не толькі…», «Кніжны навігатар». Бібліятэкі Старадарожскага раёна арганізавалі бібліятэчна-бібліяграфічныя ўрокі па тэмах: «Структура книги», «Искать, чтобы находить», «В этом таинственном доме», «Иллюстрации в книге», «И журналы и газеты вам откроют все секреты»,»Першыя крокі ў бібліятэку», «Как вести себя в библиотеке», «В библиотеке такие картотеки» і інш.

Трэба адзначыць і працу бібліятэк ў падрыхтоўцы **бібліяграфічных выданняў**. Салігорская цэнтральная бібліятэка падрыхтавала бібліяграфічныя газеты: «2017 – Год навукі», «Купала і Колас – наш гонар, сумленне і слава», «500 лет национальному книгопечатанию», «Светач розуму і духоўнасці!» (да Дня бібліятэк). Старадарожская цэнтральная бібліятэка адзін раз у паўгоддзе складае «Спіс перыядычных выданняў», якія бібліятэка атрымлівае ў бягучым годзе. Штоквартальна рыхтуе «Спісы літаратуры, якая паступіла ў камерцыйны фонд Старадарожскай ЦБ у 2017 годзе». Уздзенская цэнтральная бібліятэка падрыхтавала бягучыя выданні «Новыя кнігі», «Па старонках перыядычных выданняў», а таксама рэкамендацыйныя спісы, якія раскрываюць фонды

бібліятэкі, бягучыя спісы новай літаратуры і інш. Крупская цэнтральная бібліятэка прапанавала рэкамендацыйны спіс літаратуры: «Экалогія Беларусі: праблемы і надзеі». Цэнтральная бібліятэка Стаўбцоўскага раёна падрыхтавала бібліяграфічны спіс «Новыя паступленні ў бібліятэку». Значнае месца ў распаўсюджванні інфармацыі аб новай літаратуры займае паказальнік «Бюлетэнь новых паступленняў», які выдаецца бібліятэкамі Мінскай вобласці штоквартальна.

Варта таксама адзначыць, што ў бібліятэках працягвалася работа па фарміраванні паўнатэкставых БД:

БД «Праваслаўе ў Беларусі» (Барысаўская цэнтральная бібліятэка);

БД «У дапамогу школьнікам» (Барысаўская цэнтральная бібліятэка);

БД «Беларусь у сусветнай спадчыне»(Жодзінская цэнтральная бібліятэка);

БД» Заканадаўства Рэспублікі Беларусь па праблеме ВІЧ / СНІД» (Жодзінская цэнтральная бібліятэка).

Бібліятэкі вядуць працу над папаўненнем створанай **БД «Аналітыка».** Да прыкладу, БД «Аналітыка» Лагойскай цэнтральнай раённай бібліятэкі змяшчае 9974 бібліяграфічных запісаў, папоўнілася на 638 запісаў у параўнанні з 2016 годам. БД Мінскай раённай цэнтральнай бібліятэкі ўключае 7858 бібліяграфічных запісаў, што на 504 запісы больш, чым у мінулым годзе. Аналітыка Жодзінскай цэнтральнай бібліятэкі папоўнілася на 3584 пазіцыі і зараз мае ў БД 52868 бібліяграфічных запісаў. БД Вілейскай раённай цэнтральнай бібліятэкі змяшчае 6035 запісаў, папоўнілася на 488 запісаў. БД «Аналітыка» Валожынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі змяшчае 7395 бібліяграфічных запісаў, папоўнілася на 816 запісаў. БД Пухавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі ўключае 5572 бібліяграфічных запісаў, што на 94 запісы больш, чым у мінулым годзе. Аналітыка Маладзечанскай цэнтральнай раённай бібліятэкі папоўнілася на 1384 пазіцыі і зараз мае ў БД 32426 бібліяграфічных запісаў.

Паспяхова працягваецца праца бібліятэк вобласці ў кансорцыуме «LibКард». Бібліятэкі-удзельніцы кансорцыума: Мінская абласная бібліятэка ім. А.С. Пушкіна і ГУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка ім. І.Х. Каладзеева» За 2017 г. супрацоўнікі Мінскай абласной бібліятэкі распісалі 1 545 артыкулаў, Барысаўская бібліятэка распісала 1168 артыкулаў.

Бібліяграфічная дзейнасць – надзвычай актуальная, таму яна павінна ўдасканальвацца шляхам інавацыйных формаў і крэатыўных напрамкаў у прадастаўленні інфармацыі. Бібліятэкі робяць усё магчымае, каб бібліяграфічнае абслугоўванне з'яўлялася эфектыўным і «бачным» працэсам для карыстальнікаў, якія па ўзроўні бібліяграфічнага абслугоўвання ацэньваюць працу бібліятэкі ў цэлым.

## Метадычная дзейнасць

Дзейнасць аддзелаў бібліятэчнага маркетынгу цэнтральных бібліятэк вобласці ў 2017 годзе была накіравана на распрацоўку, вывучэнне і падтрымку сучасных перадавых напрамкаў у рабоце, павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў, умацаванне сувязей з грамадскасцю, стварэнне пазітыўнага іміджу бібліятэк.

У мінулым годзе бібліятэкі Мінскай вобласці актыўна працавалі над стварэннем і рэалізацыяй мэтавых комплексных праграм па вядучых напрамках дзейнасці: «Сохрани себя для жизни» 2015-2018 гг. (Барысаўскі раён); «Жыве народ, пакуль жыве яго гістарычная памяць» 2010–2017 гг. (Вілейскі раён); «Востраў надзеі» 2013-2017 гг. (Дзяржынскі раён); «Комплексная программа библиотек Копыльского района по работе с детьми, стоящими на различных видах учёта, несовершеннолетними с девиантным поведением, семьями, находящимися в социально опасном положении на 2016 – 2018 г.г.» (Капыльскі раён); «Экология начинается с души» 2016-2018 гг. (Клецкі раён); «Лето – время открытий» 2017 г. (Лагойскі раён); «Духовнось. Нравственность. Личность» 2017-2018 гг.

(Любанскі раён); «Библиолестница» 2017-2021 гг. (Мінскі раён); «Быць здаровым – гэта модна!» 2015-2017 гг. (Маладзечанскі раён); «Лето. Книга. Библиотека» 2016-2020 гг. (Слуцкі раён); «Сейбіты слова і мудрасці» 2016–2017 гг. (Стаўбцоўскі раён); «Краязнаўчая прастора: імёны і час» 2017-2019 гг. (Уздзенскі раён) і інш.

На працягу года публічнымі бібліятэкамі Мінскай вобласці вялася работа па стварэнні і рэалізацыі наступных доўгатэрміновых праектаў: «Читающие дети и подростки» 2015–2018 гг. (Барысаўскі раён); «Дискотека – территория агитации и воспитания» 2013–2020 гг. (Бярэзінскі раён); «Беларуская нацыянальная літаратурная спадчына ў сучаснай бібліятэцы» 2017–2020 гг. (Вілейскі раён); «Зямля, дзе пачаўся мой лёс: мае землякі ў гісторыі раёна і краіны» 2014–2017 гг. (Дзяржынскі раён); «Возвращаются к нам солдат имена» 2013–2018 гг. (Крупскі раён); «Моё будущее» 2017–2020 гг. (Любанскі раён); «Читать – это модно! Читать – это стильно!» 2014–2018 гг. (Мінскі раён); «На бібліятэчных абшарах» 2012–2020 гг. (Нясвіжскі раён); «Книгокомпания «Сымон і @»« 2015–2017 гг. (Пухавіцкі раён); «Кніга дорыць нам натхненне» 2015–2017 гг. (Салігорскі раён); «Библиорейс «По золотому кольцу Слутчины»« 2016–2017 гг. (Слуцкі район); «Жыццё патрабуе міласэрнасці» 2002–2017 гг. (Маладзечанскі раён); «Школьный урок в библиотеке» 2015–2019 гг. (Мядзельскі раён); «Разам з казкай мы расцём» 2015–2020 гг. (Смалявіцкі раён); «Писатель. Книга. Молодёжь» 2015–2017 гг. (Уздзенскі раён); «Чытаем па-беларуску» 2012–2018 гг. (Чэрвеньскі раён), «Отмечает автор юбилей» 2016–2020 гг. (г. Жодзіна) і нш.

Узровень прафесійнай падрыхтоўкі работнікаў вызначае якасць і эффектыўнасць усёй дзейнасці бібліятэк. З гэтай мэтай сістэматычна праводзяцца семінары, практыкумы, нарады, круглыя сталы, дні метадычнай дапамогі і інш. Так, у 2017 годзе былі праведзены семінары: «Совершенствование библиотечного дизайна: минимум затрат, максимум идей» (Вілейскі раён); «Выкарыстанне новых інфармацыйных тэхналогій у прадзвіжэнні кнігі і бібліятэкі» (Дзяржынскі раён); «Читать – это

здорово!»(Капыльскі раён); «Роля інтэграванай бібліятэкі ў стварэнні камфортнага інфармацыйнага асяроддзя» (Клецкі раён); «Бібліятэка і сям’я: інавацыйныя формы работы» (Крупскі раён); «Падвядзенне вынікаў і перспектывы развіцця бібліятэк раёна ў сучасным часе» (Мінскі раён); «Бібліятэка і час: пошукі і выкарыстанне новых формаў далучэння насельніцтва да кнігі» (Маладзечанскі раён); «Библиотека – детям: организация досуга детей и подростков» (Нясвіжскі раён); «Состояние и перспективы развития библиотек ГУК «Солигорская районная центральная библиотека» на 2018 год (Салігорскі раён); «Бібліятэка аграгарадка – сучасны цэнтр інфармацыі і ведаў для дзяцей і падлеткаў» (Уздзенскі раён); «Папулярызацыя і падтрымка чытання ў век інфармацыйных тэхналогій» (Чэрвеньскі раён) і інш.

круглыя сталы: «Князь Борис Всеславич и его эпоха» (Барысаўскі раён); «Прафілактыка асацыяльных з’яў у моладзевым асяроддзі» (Крупскі раён); «Спадчына Скарыны ў сучасным свеце: да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання» (Маладзечанскі раён); «Думай. Чытай. Весяліся» (Пухавіцкі раён) і інш.;

практыкумы: «Разнастайнасць форм і метадаў масавых мерапрыемстваў» (Валожынскі раён); «Внедрение мультимедийных средств в практику работы библиотек» (Вілейскі раён); «Бібліятэчная азбука» (Дзяржынскі раён); «Картатэкі як самастойная частка інфармацыйна-пошукавай сістэмы» (Клецкі раён); «Вядзенне ўліковай дакументацыі. Паступленне і выбыццё дакументаў у фонды сельскай бібліятэкі» (Крупскі раён); «Улік, справаздачнасць, план дзейнасці бібліятэкі» (Мінскі раён); «Чытанне як фактар пераадольвання асацыяльных з’яў у моладзевым асяроддзі» (Маладзечанскі раён); «Организация работы библиобуса. Работа с фондом» (Салігорскі раён) і інш.

Сярод іншых форм павышэння кваліфікацыі бібліятэчных кадраў – кансультацыі і метадычныя парады, школы метадыста і школы дырэктара, метадычныя саветы, канферэнцыі і інш.

Павышэнню прафесійнага майстэрства маладых супрацоўнікаў і супрацоўнікаў, якія не маюць спецыяльнай адукацыі, спрыяюць разнастайныя па тэматыцы заняткі, практыкумы, пасяджэнні ў «Школе пачынаючага бібліятэкара», «Школе маладога бібліятэкара», «Школе камп'ютарных ведаў», «Школе маладога спецыяліста», «Альтэрнатыўнай школе бібліятэкара», на «Факультэце бібліятэчных ведаў». Так, у 2017 годзе адбыліся: «Формула профессионального успеха» (Барысаўскі раён); заняткі ў «Альтэрнатыўнай школе» «Абслугоўванне сельскага насельніцтва ў сучасных умовах» (Валожынскі раён); «Прафесійная кампетэнцыя бібліятэкара: фарміраванне навыкаў і ўменняў у афармленні бібліятэчнай дакументацыі» (Вілейскі раён); «Компьютерная лестница» (Дзяржынскі раён); «Рэклама кніжных фондаў і дызайн у сучаснай бібліятэцы» (Клецкі раён); «Вядзенне дзённіка работы, запаўненне фармуляраў чытачоў» (Крупскі раён); кансультацыя «Арганізацыя гадавога планавання і справаздачнай дзейнасці бібліятэкі» (Маладзечанскі раён); «Складанне тэкставай справаздачы» (Пухавіцкі раён) «Фарміраванне даведачна-бібліяграфічнага апарата» (Слуцкі раён); «Арганізацыя гурткоў і аматарскіх аб'яднанняў у сельскіх бібліятэках» (Смалявіцкі раён); «Арганізацыя, вядзенне і рэдагаванне каталогаў» (Старадарожскі раён); школа камп'ютарных ведаў «Камп'ютар: крок за крокам» (Уздзенскі раён); кансультацыя «Бібліятэчная статыстыка – паказчык дзейнасці бібліятэкі» (Чэрвеньскі раён) і інш.

З мэтай вывучэння інфармацыйных запатрабаванняў карыстальнікаў і ўдасканальвання іх абслугоўвання ў бібліятэках вобласці на працягу справаздачнага года праводзіліся сацыялагічныя і маркетынгавыя даследаванні, анкетаванні і апытанні, аналіз бібліятэчнай дзейнасці: «Бібліятэка. Погляд моладзі» (Маладзечанскі раён); «Что читают тинейджеры?» (Мядзельскі раён) «Чытанне беларускай літаратуры ў сельскіх бібліятэках» (Салігорскі раён) і інш.

Пазітыўны ўплыў на стан бібліятэчнай справы ў раёне аказвае выдавецкая дзейнасць. У дапамогу бібліятэкарам складаюцца метадычныя рэкамендацыі, парады і дапаможнікі, сцэнарыі да юбілеяў пісьменнікаў, рэкамендацыйныя спісы літаратуры і г.д. Так, у 2017 годзе былі выдадзены: «500-годдзю беларускага кнігадрукавання: інфармацыйна-метадычныя матэрыялы да правядзення Дня беларускага пісьменства» (Валожынскі раён); «Копилка идей: информационно-методический обзор» (Вілейскі раён); «Дарога да прастораў Сусвету: метадычныя рэкамендыцыі да 75-годдзя з дня нараджэння У. В. Кавалёнка» (Крупскі раён); «Беларускія выданні-юбіляры 2017 года: анатаваны спіс» (Любанскі раён); «Іх ведаюць…Іх любяць…Іх памятаюць…Беларускія кнігі-юбіляры 2018 года: агляд-падарожжа» (Пухавіцкі раён); «Буктрейлер как инструмент продвижения книги: методические рекомедации» (Салігорскі раён); «Жыццё бібліятэк Стаўбцоўскага раёна: метадычны бюлетэнь» (Стаўбцоўскі раён); «Здоровый образ жизни — легко! 36 простых советов на каждый день» (Чэрвеньскі раён) і інш.

Пошуку новых форм і метадаў работы з чытачамі, стварэнню прыцягальнай атмасферы ў бібліятэках спрыяюць рэспубліканскія, абласныя і раённыя агляды-конкурсы па самых розных напрамках бібліятэчнай дзейнасці. Так, ў 2017 годзе прайшлі раённыя і агляды-конкурсы: «Беларусь – сузор’е талентаў» на лепшую бібліятэчную выстаўку (Барысаўскі раён); «Бібліятэка года» (Валожынскі раён); «Бібліятэка – цэнтр экалагічнай інфармацыі і адукацыі» (Любанскі раён); «Лепшая арганізацыя работы бібліятэк да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, жыцця і дзейнасці Францыска Скарыны» (Мядзельскі раён); «Мой край родной – моя история живая» (Салігорскі раён); «Беларуская кніга як нацыянальная адметнасць» на лепшую  работу публічных бібліятэк па папулярызацыі нацыянальнай літаратуры і кніжнай прадукцыі (Слуцкі раён); «Я паўнапраўны грамадзянін сваёй краіны» (Старадарожскі раён).

Станоўчую ролю ў стымуляванні работы бібліятэк адыгрывае штогодні рэспубліканскі конкурс «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры». Прызёрамі XXIV конкурсу

сталі: ДУК «Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка ім. Г. Новік» (1 месца ў намінацыі «За падтрымку і развіццё чытання»), ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка ім. І.Х. Каладзеева (3 месца ў намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы»)

Публічныя бібліятэкі Мінскай вобласці актыўна прымалі ўдзел у III Рэспубліканскім конкурсе «Библиотека – центр духовно-нравственного просвещения и воспитания». Прызёрамі конкурсу сталі: Ждановіцкая сельская бібліятэка ДУК «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка» (3 месца ў намінацыі «Патрыятычнае выхаванне на праваслаўных традыцыях» сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк). Таксама журы адзначыла работу ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка ім. І.Х. Каладзеева».

16 чэрвеня 2017 г. былі падведзены вынікі рэспубліканскага конкурсу «Лучшая библиотека года». Пераможцам у намінацыі «Лепшая публічная бібліятэка» стала ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка».

2017 год быў аб'яўлены ў Рэспубліцы Беларусь Годам навукі, таму прыярытэтнымі напрамкамі работы бібліятэкі абралі інфармацыйна-асветніцкія, культурна-адукацыйныя праграмы, праекты і мерапрыемствы, якія садзейнічаюць папулярызацыі чытання сярод моладзі.

23 мая на Лагойшчыне ў чарговы раз сабраліся маладыя паэты Міншчыны на злёт «Слова Купалы да творчасці кліча». Мерапрыемства адбылося ў філіяле літаратурнага музея Янкі Купалы «Акопы», які знаходзіцца ў маляўнічай вёсцы Харужанцы. У святе прынялі ўдзел вядомыя паэты В. Шніп, Г. Каржанеўская, больш за 20 маладых людзей розных прафесій, студэнты і школьнікі, якія захапляюцца літаратурай і робяць свае першыя крокі ў творчасці. Іх вершы ўвайшлі ў 10 выпуск альманаха «Слова Купалы да творчасці кліча».

Такім чынам можна зазначыць, што метадычная дзейнасць, накіраваная на аказанне тэарэтычнай і практычнай дапамогі бібліятэкам Міншчыны, шматбаковая і эфектыўная, а таму формы работы дзеля дасягнення станоўчых вынікаў штогод удасканальваюцца і пашыраюцца.

**Бібліятэкі Міншчыны ў 2017 годзе: агляд дзейнасці**

**Складальнікі:** Бубіна П.В.
Вярхоўская К.Д.
Гіль В.М.
Лабовіч К.І.
Лазарава І.П.
Мельнічак А.А.
Рудзянок І.С.
Філіпчык А.К.

Падпісана да друку: 17.03.2017 г.

Тыраж 3 экз. Заказ № 3

---

220005 г. Мінск, вул. Гікалы, 4
ДУ «Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна»